ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СТУДЗЕНЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 4 (27369) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Вядучая тэлеканала АНТ Люцыя Лушчык — заўсёды яркая і эмацыянальная як на экране, так і ў жыцці. Яна ведае сакрэт не толькі паспяховасці, але і жаночага шчасця.

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі:

«Гэта не толькі прызнанне нашага ўкладу, але і адказнасць. Атрыманне спецыяльнай прэміі, хутчэй, неабходна разглядаць як стартавую пляцоўку для далейшай работы па захаванні, развіцці і прапагандзе помнікаў кніжнай культуры, пісьменнасці, духоўных каштоўнасцяў нашага народа. Мы працягнем працаваць над фарміраваннем фонду. У ліку прыярытэтаў — вяртанне помнікаў кніжнай культуры ў Беларусь, выданне факсімільных копій тых рарытэтаў, якія мы не можам вярнуць».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	0°
Віцебск	–8°
Гомель	–11°
Гродна	0°
Магілёў	–10°
Мінск	–5°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 20.12.2012 г.

Долар ЗША	8650,00	▲
Еўра	11320,00	▲
Рас. руб.	284,50	▲
Укр. грыўня	1071,87	▲

КАРАТКА

Тэрміны распрацоўкі брэнда Мінска прадоўжаны да 1 ліпеня 2013 года.

Магілёўскія прадпрыемствы гандлю працягнуць распродажы са зніжкамі да канца студзеня. Асноўныя дні распродажаў — 11, 18 і 25 студзеня.

Беларуская і Эладская (Грэчаская) праваслаўныя цэрквы дамовіліся, што з 9 па 17 мая 2013 года ў Беларусі будзе знаходзіцца сумленная дзясніца святіцеля Спірыдона Трыміфунцкага, якую прывязуць з вострава Корфу (Керкіра). Плануецца, што святыня будзе даступная для пакланення і ў іншых буйных гарадах Беларусі.

ISSN 1990 - 763X

ДЗЯКУЮЧЫ МАШТАБНЫМ ПРАЕКТАМ БЕЛАРУСЬ ПЕРАТВАРЫЛАСЯ Ў АДЗІН З ЦЭНТРАЎ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ ЕЎРОПЫ

Аляксандр Лукашэнка ўручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва

Цырымонія ўзнагароджання адбылася ўчора ў Палацы Рэспублікі.

«Падобна да таго, як у Бібліі горад трымаецца на праведніках, так і любы народ трымаецца на сваіх героях. І сёння мы ўшаноўваем тых, каго з поўным правам можна назваць героямі нашага часу. Сапраўдных падзвіжнікаў, якія заўсёды адгукаюцца на чужую бяду і спяшаюцца на дапамогу тым, каму яна асабліва патрэбна», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Беларусь ператварылася ў адзін з цэнтраў культурнага жыцця Еўропы дзякуючы маштабным міжнародным фестывалям, выставам, творчым праектам, якія ахапілі ўсе напрамкі мастацтва — ад фальклору і высокай класікі да авангарда. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што перамогі маладых артыстаў на прэстыжных конкурсах праславілі краіну, можна ганарыцца тым, якая багатая на таленты беларуская зямля.

«Не адно стагоддзе філосафы спрачаюцца пра тое, што важней — матэрыя або дух, узвышанае або зямное. І сёння, гледзячы ў гэтую залу, дзе сабраўся гонар беларускай інтэлігенцыі, я міжволі задаю сабе ўсё тое ж вечнае пытанне. Бясспрэчна, без матэрыяльных даброт не можа існаваць род людскі. Але ў кожным з нас ёсць нешта, што цяжка апісаць словамі, нейкая божая іскра, духоўны агонь, які прымушае думаць і адчуваць, кахаць і пакутаваць, адважвацца і ствараць», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прадоўжыў: «Не хлебам адзіным жыве чалавек. Нават магутныя імперыі старажытнасці руйнаваліся і гінулі, калі пазбаўляліся супольнасці ідэалаў, маральных асноў і веры — усяго таго, што ператварае насельніцтва ў народ, а месцажыхарства — у Айчыну». Паводле яго слоў, у беларусаў сіла слова заўсёды шанавалася вышэй сілы зброі. Беларуская зямля нараджала не агрэсараў і прыгнятальнікаў, а асветнікаў, навукоўцаў, мастакоў і паэтаў.

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт падкрэсліў, што народ Беларусі, які перажыў нямала гістарычных драм, ніколі не аддаваў забыццю сваю спадчыну, зберагаў паданні, помнікі, традыцыі і песні. І таму не растварыўся ў пясках часу, а застаўся самім сабой, пранёсшы скрозь стагоддзі гераічны характар і святыя запаветы продкаў.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не выпадкова свята Раства ў сучаснай Беларусі стала сімвалам адраджэння, вяртання да вечных каштоўнасцяў, якія вызначылі наш гістарычны шлях. «Нашы духоўнасць, мастацтва, культура — гэта крывяносная сістэма грамадства, якая дае яму жыццёвыя сілы, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — Разумеючы гэта, дзяржава рабіла, робіць і будзе рабіць усё для прымнажэння гэтага вельмі багатага здабытку. Для таго каб кожны талент расквітнеў і ні адзін творчы парыў не загас. Каб кожны з вас, людзей абраных, адзначаных асаблівым дарам, мог увасобіць свае задумы ў жыццё».

2012 год даў яркія прыклады таго, як адбываецца адраджэнне і росквіт культуры, лічыць Прэзідэнт. Узноўлены Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль. Рэканструяваны, а, дакладней, пабудаваны нанова, Купалаўскі тэатр. Завяршаецца ўзвядзенне ўнікальнага комплексу — музея Вялікай Айчыннай вайны...

«Сярод лаўрэатаў прэмій «За духоўнае адраджэнне» — урачы гомельскага цэнтра «Шлюб і сям'я», якія дапамагаюць здабыць матчына шчасце, дырэктар Радашковіцкай школы-інтэрната, які стаў бацькам дзясяткам сірот. Рэстаўратары, што зберагаюць бясцэнныя гістарычныя рэлівіі, і служыцелі царквы, чыё прызначэнне — рабіць дабро. Дзякуй усім вам за шчодрасць душы», — сказаў Прэзідэнт.

Заслужаныя ўзнагароды ўручаны майстрам Вялікага тэатра і тэатра-студыі кінаакцёра, які даў сцэнічнае жыццё творам беларускай класікі, супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі і музея Янкі Купалы — за важкі ўклад у прапаганду мастацкага слова, а таксама іншым яркім творчым асобам і выдатным калектывам. «Краіна ўдзячная вам за працу і талент», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў усіх з высокімі ўзнагародамі.

Ён падкрэсліў, што каштоўнасць прэмій вымяраецца не толькі ў грашовым эквіваленце: «Дзякуючы ўзнагародам аб заслугах лаўрэатаў даведаецца ўся Беларусь, і вы станеце прыкладам для маладых».

БЕЛТА.

■ Сацыяльная абарона

НОВЫЯ ПАМЕРЫ ДЗІЦЯЧАЙ ДАПАМОГІ

Сума дапамогі па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў будзе вар'іравацца ад 1.413.190 да 1.816.960 рублёў.

Вядома, што з 1 студзеня ўступіў у сілу Закон «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», згодна з якім будзе па-новаму прызначацца і выплачвацца дапамога па доглядзе дзіцяці да 3 гадоў. Памер гэтай дапамогі цяпер пачне вылічацца, зыходзячы з велічыні сярэднямесячнай заработнай платы ў рэспубліцы за квартал.

Прычым, як заявіла **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ**, за перыяд з 1 па 31 студзеня 2013 года будзе прымяняцца велічыня сярэднямесячнай заработнай платы за III квартал 2012 года,

з 1 лютага па 30 красавіка 2013 года — за IV квартал 2012 года,

з 1 мая па 31 ліпеня — за I квартал 2013 года,

з 1 жніўня па 31 кастрычніка — за II квартал 2013 года,

з 1 лістапада 2013 г. па 31 студзеня 2014 года — за III квартал 2013 года і г.д.

Таксама памер дапамогі будзе залежаць ад колькасці дзяцей у сям'і. На першае дзіця будзе выплачвацца 35% сярэднямесячнай заработнай платы; на другое і наступных дзяцей — ужо 40%. На дзіця-інваліда дапамога будзе прызначацца і выплачвацца ў памеры 45% сярэднямесячнай заработнай платы, прычым незалежна ад чарговасці нараджэння дзяцей у сям'і.

Паводле звестак Нацыянальнага статыстычнага камітэта Беларусі, сярэднямесячная заработная плата работнікаў па краіне за III квартал 2012 года склала 4.037.686 рублёў.

Адпаведна, памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў на перыяд з 1 студзеня па 31 студзеня складзе:

на першае дзіця — 1.413.190 рублёў;

на другое і наступных дзяцей — 1.615.070 рублёў;

на дзіця-інваліда ва ўзросце да 3 гадоў — 1.816.960 рублёў.

Асобам, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, захавана выплата дапамогі ў памеры 150% ад устаноўленага.

Разам з тым, як адзначыла Святлана Белаш, у сувязі з асаблівасцямі аўтаматызаванага разліку дапамог у органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, асобам, якія атрымліваюць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, яе выплата за студзень будзе праведзена ў ранейшых памерах, г.зн. устаноўленых заканадаўствам, якое дзейнічала да 31 снежня 2012 г. Але, як запэўніла спецыяліст, у лютым будзе праведзена даплата сум дапамог да памераў, устаноўленых новым законам.

Святлана БУСЬКО

■ Жыллё маё

ПА ЯКІХ ПРАВІЛАХ БУДЗЕМ ЖЫЦЬ

Жыллё — асноўная і самая дарагая ўласнасць большасці беларусаў. Калі вы ўласнік жылля, вам будзе вельмі карысна ведаць законы, якія датычацца нерухомасці. Ды і наогул, такая інфармацыя не перашкодзіць нікому, бо ўсе мы дзесьці жывём і хочам пры гэтым жыць добра і без канфліктаў.

Усе пытанні, якія датычацца нерухомасці, прапісаны ў Жыллёвым кодэксе Беларусі, які ўступіць у сілу з 1 сакавіка 2013 года. Ён рэгулюе пытанні аплаты камунальных паслуг, парадку атрымання кватэр і дамоў у рэспубліцы і высялення з іх. У ім таксама можна знайсці ўсю інфармацыю, якая датычыцца прыватызацыі, эксплуатацыі або перапланіроўкі жылых памяшканняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі краіны. Прадугледжаны ў Жыллёвым кодэксе і ўсе магчымыя канфліктныя сітуацыі, якія могуць узнікнуць паміж уласнікамі жылля.

Такім чынам, давайце яшчэ раз «пройдземся» па асноўных пунктах новага Жыллёвага кодэкса.

БУДЗЕМ ВЕДАЦЬ, ЗА ШТО ПЛАЦІМ

У новым Жыллёвым кодэксе дакладна вызначана, што такое жыллёва-камунальныя паслугі. Да іх адносяцца *камунальныя паслугі, тэхнічнае абслугоўванне, бягучы рамонт, капітальны рамонт і іншыя жыллёва-камунальныя паслугі, якія прадастаўляюцца ў адпаведнасці з заключанымі дагаворамі.*

Як бачыце, у жыроўцы з'явіцца новы радок — «бягучы рамонт». Ён будзе аплачвацца, зыходзячы з фактычных выдаткаў на рамонт, якія павінны быць падрабязна распісаны.

❍ ❍ ❍

Таксама Кодэксам прадугледжана плата за карыстанне непрыватызаванай кватэрай, і з 2 сакавіка 2013 года гэтая норма пачне дзейнічаць. «Наймальнік жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду, акрамя абавязку ўнясення платы за жыллёва-камунальныя паслугі, нясе абавязак унясення платы за карыстанне жылым памяшканнем з дня заключэння дагавора найму жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду (п.3. арт.29 Жыллёвага кодэкса). Памер платы за карыстанне жыллём будзе ўстаноўлены асобным нарматыўным прававым актам.

Дарэчы, парадак прыватызацыі жылля застаецца ранейшым (гл. 23 Жыллёвага кодэкса).

АБ РАМОНЦЕ

Крыху аб капітальным рамонце жылых дамоў. Ён ажыццяўляецца на падставе праектна-каштарыснай дакументацыі, якая зацверджана і прайшла пазаведамасную дзяржаўную экспертызу. У дакументацыю на капрамонт уключаюцца работы па рамонце памяшканняў, канструктыўных элементаў, інжынерных сістэм, якія знаходзяцца ў агульнай уласнасці грамадзян.

Перыядычнасць і працягласць капітальнага рамонту па-ранейшаму ўстанаўліваецца тэхнічнымі нарматыўнымі прававымі актамі.

Таксама, згодна з заканадаўствам, і ўласнікі, і наймальнікі жылых памяшканняў абавязаны рабіць рамонт у сваёй кватэры, у тым ліку сантэхнікі, прыбораў уліку электрычнай, цеплавой энергіі, вады і газу, а таксама рамонт газавых і электрычных пліт і ўнутрыкватэрнай электраправодкі. Усе работы па замене пералічанага абсталявання могуць ажыццяўляцца і ў рамках капітальнага рамонту, але гэта ўжо будуць платныя паслугі.

НЕПЛАЦЕЛЬШЧЫКАЎ МОГУЦЬ ВЫСЕЛІЦЬ У «ІНШЫ НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ»

Праз шэсць месяцаў няплаты за камунальныя паслугі мясцовы выканкам будзе ў пісьмовым выглядзе папярэджваць неплацельшчыка. Калі ўласнік жылля не пагасіў запазычанасць у поўным аб'ёме на працягу аднаго месяца з даты атрымання папярэджання і не мае такой магчымасці, то выканкам можа падаць у суд іск аб прымусе ўласніка да адчужэння жылля (гэта значыць да яго продажу). Калі на працягу года пасля ўступлення ў сілу рашэння суда жыллё не будзе адчужана, яно, зноў жа па рашэнні суда, будзе прымусова прададзена з публічных таргоў.

Жыллёвы кодэкс Беларусі ўступіць у сілу з 1 сакавіка 2013 года.

Неплацельшчыку пасля продажу яго жылля мясцовым выканкамам на працягу двух месяцаў будзе перададзена ва ўласнасць іншае жыллё, якое па плошчы будзе меншым за ранейшае і (або) будзе саступаць яму па якасці, у тым ліку яно можа знаходзіцца ў іншым населеным пункце.

А з выручаных ад продажу жылля неплацельшчыка грошай будзе пагашана запазычанасць і аплачаны кошт набытага жылля. Рэшта грошай будзе выплачана неплацельшчыку.

Тыя ж меры могуць прымяняцца і да наймальнікаў жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду і членаў іх сем'яў.

У новым Жыллёвым кодэксе таксама адзначана, што паўналетнія дзеяздольныя члены сям'і, а таксама былыя члены сям'і неплацельшчыка, якія пражываюць у гэтым жыллі, нясуць салідарную адказнасць за нявыплату жыллёва-камунальных паслуг з даты ўсялення ў жылое памяшканне (калі не прадугледжана іншае пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем).

ЧЛЕНЫ СЯМ'І — ГЭТА:

— Муж, жонка, дзеці і бацькі;

— Іншыя сваякі, непрацаздольныя ўтрыманцы, якія пражываюць сумесна з уласнікам, вядуць з ім агульную гаспадарку і заключылі пісьмовае пагадненне аб прызнанні іх членамі сям'і;

— Іншыя грамадзяне, якія не менш за пяць гадоў пражываюць сумесна з уласнікам, вядуць з ім агульную гаспадарку і прызнаны ў судовым парадку членамі яго сям'і.

У выпадку прыняцця спадчыны запазычанасць па аплаце за жыллёва-камунальныя паслугі і (або) аплаце за карыстанне жыллём пагашаюць спадчыннікі. Парадак пагашэння ў гэтым выпадку ўстаноўлены Грамадзянскім кодэксам Беларусі.

УЛАСНІК ЖЫЛЛЯ МОЖА ВЫСЕЛІЦЬ ЧЛЕНАЎ СВАЁЙ СЯМ'І

Згодна з новым Жыллёвым кодэксам, уласнік жылля можа выселіць членаў сваёй сям'і, якія дасягнулі 18 гадоў, без прадастаўлення ім іншага жылля.

Высяленне магчыма, калі тыя сістэматычна (два і больш разоў на працягу года) разбураюць або псуюць жыллё, альбо выкарыстоўваюць яго не па прызначэнні, альбо сістэматычна парушаюць правілы карыстання жылым памяшканнем, што робіць немагчымым пражыванне з імі ў адной кватэры або ў адным доме. Яны могуць быць выселены на гэтай падставе рашэннем суда, калі меры адміністрацыйнага ўздзеяння аказаліся безвыніковымі. Але калі ім належыць доля ў праве агульнай уласнасці на гэтае жыллё, то высяленню яны не падлягаюць.

❍ ❍ ❍

Уласнік жылля таксама набывае права выселіць былых членаў сваёй сям'і без прадастаўлення ім іншага жылля.

Аднак уласнік жылля не заўсёды зможа скарыстацца гэтым правам. Новы Жыллёвы кодэкс дае гарантыі былым членам сям'і, калі ім няма дзе жыць, а таксама калі іх маёмаснае становішча і іншыя вартыя ўвагі акалічнасці не дазваляюць ім забяспечыць сябе іншым жыллём. У такіх выпадках суд можа захаваць за імі права карыстання гэтым жыллём на пэўны тэрмін.

Таксама пры высяленні асоб з непаўналетнімі дзецьмі неабходна згода органаў апекі і папячыцельства.

Святлана БУСЬКО

■

■ Фестывалі

НА 25-х «ВЕЧАРАХ» — 25 КРАІН

Галоўная культурная падзея гэтай зімы ў Брэсце — фестываль класічнай музыкі, які афіцыйна адкрыўся 9 студзеня. Праўда, уверцюрай да фэсту стаў канцэрт нацыянальнага народнага аркестра імя І. Жыновіча, квінтэта духавых інструментаў з нямецкага Равенсбурга, юных лаўрэатаў міжнародных конкурсаў з Малдовы, Польшчы, Казахстана, Украіны, Беларусі. 8 студзеня таксама адбылося вялікае выступленне салістаў, ансамбляў і аркестраў Брэсцкага дзяржаўнага музычнага каледжа імя Р. Шырмы.

Фота БЕЛТА.

Выступае Аляксандр АЛЕКСЯЮК (Беларусь).

25-ы раз калядным днямі ў горад над Бугам з'язджаюцца «зоркі» класічнай музыкі. Сёлета на сярэбраны юбілей фэсту запрошаны прадстаўнікі акурат з 25 краін. Упершыню на «Студзеньскіх музычных вечарах» выступяць выканаўцы з Данii, Швецыі і нават Ямайкі. А ўсяго чакаецца каля 70 музыкантаў і спевакоў. Нездарма ж білеты на канцэрты распрададзены даўно. Паводле слоў нязменнага дырэктара фестывалю Лілii Батыравай, для аматараў сапраўднай класічнай музыкі прыгатаваны «пір душы». Два з гэтых канцэртаў будзе весці народны артыст Расii Святаслаў Бэлза.

Брэсцкая публіка, вядома, чакае сустрэчы са знакамітым тэнарам Раберта Косці — апошнім вучнем легендарнага Лучана Павароці. Італьянец выступіць на закрыцці «вечароў». У гэты ж дзень пачуем сапраўды «залатыя» галасы — Матэа Бертарэлі і Стасі Даменіка. Цяпер ужо вернымі сябрамі фэсту называюць скрыпача і педагога Захара Брона, які абяцаў, як і летась, прывезці сваіх вучняў. Зноў будуць першая флейта оперных тэатраў Мілана і Рыма Антоніа Амедуні, віртуозная грузінская скрыпачка Ліяна Ісакадзэ, піяніст з сусветнай славай Барыс Блох, які вельмі папулярны на Захадзе і які палюбіўся брэсцкім слухачам.

Ушануе юбілейны фестываль «Брыльянт з кароны Вялікага тэатра» народны артыст СССР Уладзіслаў П'яўко. Гады тры таму ён прывозіў у наш горад унікальны праект пад назвай «Парад тэнараў». Поспех быў каласальны. Спевакоў доўга не адпускалі са сцэны. Цяпер маэстра вязе сольны канцэрт.

Ганна Самсон, оперная спявачка і арт-дырэктар польскага міжнароднага фестывалю класічнай музыкі, выступіць 11 студзеня. На гэты ж дзень прызначаны і традыцыйны Калядны баль. Будзе яшчэ многа старых знаёмых і новых адкрыццяў.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў удзельнікаў і гасцей XXV Міжнароднага фестывалю класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары» з адкрыццём форуму. Аляксандр Лукашэнка пажадаў удзельнікам і гасцям фестывалю здароўя, натхнення, творчых поспехаў, здзяйснення ўсіх жаданняў, шчасця і дабрабыту.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«НЯМА НІЯКІХ ПАДВОХАЎ — ЗВЫЧАЙНАЯ РАТАЦЫЯ КАДРАЎ»

Старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці прызначаны Васіль Герасімаў, а яго папярэднік на гэтай пасадзе Сяргей Раўнейка пераязджае ў Мінск, дзе будзе працаваць у цэнтральным апараце кантрольнага ведамства.

— Няма ніякіх падвохаў — звычайная ратацыя кадраў, — сказаў журналістам пасля сустрэчы з кіраўніцтвам органаў улады Гродзеншчыны, праваахоўных структур наконт гэтай і іншых кадравых змен, што адбыліся апошнім часам, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Аляксандр Якабсон. — На пасады кіраўнікоў абласных камітэтаў дзяржкантролю прызначаны даволі маладыя людзі, і я, ведаючы іх прафесійныя якасці, падрыхтоўку, перакананы, што работа стане больш актыўнай.

Аляксандр Якабсон лічыць, што ўпор у кантрольнай дзейнасці сёння неабходна рабіць у бок прафілактычных мерапрыемстваў. І пры гэтым не толькі выяўляць парушэнні, праблемы, але і прымаць рашучыя меры па выпраўленні сітуацыі. Разам з тым, Камітэт дзяржкантролю будзе вельмі жорстка сачыць, каб бюджэтныя сродкі не транжырыліся, дзяржаўная ўласнасць выкарыстоўвалася па прызначэнні і выконваліся ўсе заканадаўчыя акты.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

НАВУЧЭНЕЦ ВЫРАТАВАЎ ДВАІХ ДЗЯЦЕЙ

Пра загаранне ў жылым доме па вуліцы Галубка ў Маладзечне ўдзень выратавальнікам паведаміў адзін з хлопчыкаў, які пражываў у ім.

У гэты час на вуліцы побач знаходзіўся навучэнец Бабруйскага тэхнічнага каледжа (завочнік-пяцікурснік). Ён пачуў крыкі пра дапамогу. У акне суседняга дома ён убачыў малодшае дзіця — 9-гадовага школьніка. Навучэнец выцягнуў яго і палез праз акно па старэйшага — 14-гадовага. Разам яны выйшлі тым жа шляхам.

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, мяркуецца, што прычынай пажару стала дзіцячае свавольства: у апошні дзень канікулаў школьнікі засталіся дома адны, без нагляду дарослых. Старэйшы хлопчык атрымаў апёкі галёнкі, аднак дзеці ў шпіталізацыі патрэбы не мелі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАКАРАНЫ ЗА ПАТРОНЫ

Жыхар Наваполацка яшчэ ў 1991 годзе пасля вайсковай службы на тэрыторыі Эстоніі прывёз дадому дзесяць аўтаматных патронаў, знойдзеных ім на стрэльбішчы. На працягу больш як дваццаці гадоў гэтыя боепрыпасы захоўваліся ў кватэры.

— Нягледзячы на неаднаразовае правядзенне Наваполацкім гарадскім аддзелам унутраных спраў акцый па добраахвотнай здачы агнястрэльнай зброі і боепрыпасаў да яго, патроны здадзены не былі. Падчас правядзення аператыўных мерапрыемстваў супрацоўнікамі міліцыі боепрыпасы ў гэтага грамадзяніна канфіскавалі, была распачата крымінальная справа. Балістычнай экспертызай установлена, што дзевяць з дзесяці патронаў да аўтамата АКМ-74 прыдатныя да стральбы, — расказаў С.А. Шынкевіч, памочнік пракурора Наваполацка.

Кропку ў гэтай справе паставіў суд: 2 гады абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Такім чынам, добрапрыстойны сем'янін стаў асуджаным, з усімі абмежаваннямі і наступствамі, якія з гэтага вынікаюць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ТЭЛЕФОННЫЯ ВІНШАВАННІ ДОЎЖЫЛІСЯ... 4 МІЛЬЁНЫ ХВІЛІН

885 тысяч званкоў агульнай працягласцю больш як чатыры мільёны хвілін здзейснілі ў навагоднюю ноч абаненты «Белтэлекама».

У перыяд з 21 гадзіны 31 снежня да 2 гадзін 1 студзеня ў межах Беларусі было зроблена 734 тысячы званкоў — беларусы віншавалі адно аднаго амаль тры з паловай мільёны хвілін. Пры гэтым самую вялікую актыўнасць праявілі жыхары Мінскай вобласці — 238 тысяч званкоў агульнай працягласцю 1 мільён 146 тысяч хвілін.

У краіны блізкага і далёкага замежжа беларусы званілі 150 тысяч разоў і выдаткавалі на тэлефонныя размовы 694 тысячы хвілін. І тут таксама самымі актыўнымі аказаліся жыхары Міншчыны: яны тэлефанавалі за межы Беларусі 57 тысяч разоў, а віншаванні доўжыліся 267 тысяч хвілін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Барацьба за кліента

У КРАМУ З... ПАШПАРТАМ

Другое нараджэнне «пайшчыкаў»

У Лёзненскім раёне мясцовых жыхароў запрашаюць стаць пайшчыкамі, што дае права купляць тавары па зніжанай цане. Зэканоміць пры пакупцы дарагіх тавараў можна некалькі мільёнаў рублёў. І значная эканомія пры пакупцы параўнальна недарагіх тавараў.

Вяскоўцы ва ўзросце бліжэй да пенсійнага і пенсіянеры са стажам, вядома, многае могуць расказаць аб паях і пайшчыках. У прыватнасці, пра тое, што пайшчык — гэта той, хто з'яўляецца «акцыянерам» гандлёвай сістэмы спажывецкай арганізацыі. Бабуля ці дзядуля можа нават знойдуць сярод асабістых дакументаў «кніжку» члена спажывецкага таварыства, куды трэба было ўклейваць спецыяльныя маркі, якія пацвярджалі выплату ўзносаў. За апошнія гарантаваліся скідкі пры пакупцы тавараў у крамах спажывецкай каапэрацыі, права купляць у крамах «дэфіцыт». Аказваецца, і сёння жыхароў глыбінкі запрашаюць, як калісьці, уступаць у рады пайшчыкаў.

Перад гэтым патэнцыйнаму кандыдату на ўступленне ў рады пайшчыкаў трэба заплаціць па сучасных мерках невялікі першапачатковы ўзнос — усяго 50 тысяч рублёў. Што цікава, абавязковы пай — у памеры 300 тысяч рублёў — як высветлілася, можна ўносіць нават на працягу некалькіх гадоў. Пры гэтым ёсць маленькі нюанс: купіць нешта па зніжанай цане чалавек зможа толькі пры ўмове ўнясення поўнага памеру паю. Зразумела, патраціўшы на «пай» 300 тысяч рублёў, даволі хутка гэтыя грошы можна кампенсаваць на эканоміі пры пакупцы тавараў. Сёння ў Лёзненскім раёне ўжо каля 3,7 тысячы пайшчыкаў, сярод якіх ёсць нямала «ветэранаў пайнай справы». Між іншым, у пайшчыкі прымаюць грамадзян ва ўзросце ад 18 гадоў.

У лёзненскай краме «Родны кут» растлумачылі, што пайшчыкам быць выгадна. Напрыклад, многія нехарчовыя тавары (напрыклад, абутак) можна купіць па зніжанай цане, зэканоміўшы больш як 16%. А некаторыя дзіцячыя тавары пайшчыкам рэалізуюць па цане, меншай за звычайную прыкладна на 9%. Плануецца, што і прадукты для пайшыкаў з часам патаннеюць: задумана, што на 10%. У «Родным куце», у прыватнасці, запланавана ўкараніць камп'ютарную сістэму з закладзеным у яе «алгарытмам» зніжак для пакупкі пайшчыкамі харчавання з 10% зніжкай па спецыяльных картках.

Адзіны сёння, бадай, мінус пры магчымасці пакупкі пайшчыкамі тавараў па зніжаных цэнах — гэта тое, што на афармленне пакупкі прыйдзецца патраціць параўнальна больш часу. Схема афармлення прыкладна такая. Пайшчык у краму прыходзіць абавязкова з пашпартам, выбірае тавар, потым у касе райпа аплачвае кошт тавару па зніжанай цане... І пасля атрымання адпаведнай «даведкі» можна забраць у краме пакупку. Але прапрацоўваецца пытанне аб тым, як звесці страты часу да мінімуму.

А спажывецкаму таварыству, безумоўна, выгадна мець «партыю» пастаянных пакупнікоў, што немалаважна, улічваючы барацьбу за кліента. Нават у глыбінцы ў пакупнікоў ёсць выбар — куды пайсці па тавары.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Лёзненскі раён

■

ПРАЦОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

У 2012-м моладзь сутыкнулася з вялікай канкурэнцыяй на рынку працы: на адну вакансію прыходзілася 8 саіскальнікаў

Такі факт выявіў аналіз базы вакансій і рэзюмэ, размешчаных на сайце RABOTA.TUT.BY у мінулым годзе, які правёў даследчы цэнтр HeadHunter Беларусь.

Акрамя таго, аказалася, што найбольшы прырост вакансій напрыканцы 2012 года ў параўнанні з яго пачаткам адзначыўся ў прафесійных сферах «Пачатак кар'еры/студэнты», «Некамерцыйныя арганізацыі», «Банкі/інвестыцыі/лізінг», «Вытворчасць», «Рабочы персанал». За той жа перыяд назіралася падзенне колькасці вакансій у сферах «Юрысты», «Спартыўныя клубы/фітнэс/салоны прыгажосці». Пры гэтым «конкурс» сярод юрыстаў заставаўся вялікім — 3 чалавекі на месца. На іншыя вакансіі прэтэндавалі не больш за тры саіскальнікі — а гэта нармальная сітуацыя на рынку працы. Дарэчы, найбольшы «ўсплёск» вакансій прыйшоўся на жнівень, а некаторы спад назіраўся ў снежні (гэта вынік сезоннасці на рынку, калі дзелавая актыўнасць значна замаруджваецца).

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Відавочна, што попыт і прапанова рабочых месцаў працягваюць жыць сваім жыццём, не перакрыжоўваючыся. Так, самымі папулярнымі запытамі сярод сасікальнікаў летась сталі «бухгалтар», «кіроўца» і «эканаміст», а сярод працадаўцаў — «менеджар па продажах», «гандлёвы прадстаўнік» і «прадавец-кансультант».

Цікава, што ў чацвёртым квартале 2012 года ў параўнанні з трэцім сярэдняя зарплата ў Мінску вырасла на 25% і склала 460 долараў. Пры гэтым, у чвэрці вакансій была пазначана зарплата ад 680 долараў. У яшчэ адной чвэрці — зарплатныя прапановы былі ніжэй за 350 долараў.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ТЕХНОБАНК

Открытое акционерное общество
220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44

Уважаемые акционеры ОАО «Технобанк»!

Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего Собрания акционеров ОАО «Технобанк» в **очной форме** по решению Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк» от 29.12.2012 (протокол №47) на основании собственной инициативы Наблюдательного Совета ОАО «Технобанк».

Дата проведения: 16 января 2013 года.

Место проведения (адрес): г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», 2-й этаж. Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 11.30 до 12.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).

Время проведения заседания: с 12.00 до 14.00.

Повестка дня Общего Собрания акционеров:

1. Об акциях ОАО «Технобанк», находящихся на балансе.

Предоставление для ознакомления информации (документов), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, осуществляется в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, на основании письменного запроса на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк» лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании акционеров, и (или) их уполномоченных представителей.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010, УНП 100706562

ВЫНІКІ РЭВІЗІІ ЛЬГОТНАЙ ЧАРГІ

У Віцебску ў выніку рэвізіі спісаў тых, хто прэтэндаваў на будаўніцтва жылля на льготных умовах, па розных прычынах знялі з чаргі больш як дзве тысячы чалавек.

А было ў гэтай ільготнай чарзе больш як 32 тысячы чалавек. Засталіся мнагадзетныя сем'і, тыя, хто больш як дзесяць гадоў жыве ў інтэрнаце, інваліды, малазабяспечаныя грамадзяне і г.д. Перад гарвыканкамам цяпер стаіць задача па прыцягненні для будаўніцтва сродкаў грамадзян у тым ліку за кошт крэдытаў, але не на льготных умовах.

Будаўніцтва арэнднага жылля ў Віцебску фінансуецца з абласнога бюджэту. У прыватнасці, на 2013 год запланавана каля 16-17 мільярдаў рублёў на будаўніцтва буйнапанэльнага дома (3 пад'езды, 120 кватэр) у новым так званым «спальным» мікрараёне абласнога цэнтра — Білева. Магчыма, у працэсе выканання бюджэту з'явяцца грошы на будаўніцтва яшчэ аднаго дома.

Хто можа жыць у арэндных кватэрах? Ці вялікая чарга? Колькі трэба плаціць? Аб усім гэтым можна атрымаць інфармацыю ў гарвыканкаме. Там вядзецца прыём заяў і ўлік. Адпаведная інфармацыя аб свабодным арэндным жыллі размешчана на афіцыйнай старонцы Віцебскага гарвыканкама ў інтэрнэце.

А ці насамрэч дорага абыдзецца жыць у арандаванай кватэры? Аказваецца, сёння ў сярэднім пражыванне ў арэндной кватэры каштуе 500 тысяч рублёў, плюс, вядома, трэба аплачваць камунальныя паслугі. Паводле слоў спецыялістаў гарвыканкама, дагавор на арэнду жылля звычайна заключаецца на дзесяць гадоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

100 МЛН ЮАНЯЎ У ЗНАК СЯБРОЎСТВА

Учора ў Мінску было падпісана беларуска-кітайскае міжурадавае пагадненне аб тэхніка-эканамічным супрацоўніцтве, згодна з якім урад Кітайскай Народнай Рэспублікі акажа ўраду Рэспублікі Беларусь бязвыплатную дапамогу ў памеры 100 млн кітайскіх юаняў, што складае каля $16 млн.

Згодна з пагадненнем, якое падпісалі **віцэ-прэм'ер урада Беларусі Анатоль ТОЗІК** і **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у нашай краіне Гун ЦЗЯНЬВЭЙ,** на гэтыя сродкі ў Беларусі будзе рэалізаваны сацыяльна значны праект. Беларускі бок прапануе накіраваць грошы на будаўніцтва некалькіх аздараўленчых комплексаў з плавальнымі басейнамі для дзяцей, якія пражываюць у забруджаных радыяцыяй раёнах.

— Гэтую прапанову павінен яшчэ ўзгадніць кітайскі бок, — патлумачыла «Звяздзе» **прэс-сакратар прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Вольга ДОЎГАЯ.** — Таму пакуль зарана казаць, дзе канкрэтна будуць пабудаваны такія цэнтры.

Такая дапамога ў знак сяброўства, без вяртання і працэнтаў, аказваецца Беларусі з боку Кітая ўжо ў чацвёрты раз. У снежні 2008 года, згодна з падобнымі пагадненнямі, сума бязвыплатнай дапамогі склала 30 млн кітайскіх юаняў. На гэтыя грошы беларускія мытнікі атрымалі мабільныя даглядальныя комплексы. У 2010-м 60 млн кітайскіх юаняў былі накіраваны на будаўніцтва тэрапеўтычнага корпуса Мінскай цэнтральнай рэспубліканскай бальніцы ў вёсцы Бараўляны. Пагадненне 2011 года прадугледжвала дапамогу ў суме 70 млн юаняў. Іх вырашана выкарыстаць на будаўніцтва ў Мінску студэнцкага інтэрната.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПЕРШЫЯ БЕЛАРУСКІЯ ПАДГУЗКІ

Іх выпуск наладзіла фірма з турэцкім капіталам у свабоднай эканамічнай зоне «Магілёў». Днямі першыя партыі запатрабаванага тавару адгрузілі спажыўцам.

Замежнае прыватнае прадпрыемства «БелЭмса» працуе ў Беларусі дзясятак гадоў. Турэцкія інвестары пачыналі з хатняга тэкстылю, паспрабавалі сябе ў будаўніцтве, узвялі бетонны завод у Магілёўскім раёне. Праект па вытворчасці падгузкаў стартаваў напрыканцы 2011 года. Інвестыцыі склалі больш за 4 мільёны еўра. Цяпер на італьянскай лініі выраблюцца якасныя дзіцячыя падгузкі чатырох памераў. Яе магутнасць — 400 штук у хвіліну. Вытворчасць поўнасцю аўтаматызавана, увогуле на заводзе цяпер працуюць усяго 45 чалавек.

Выпуск падгузкаў у Магілёве замяшчае імпарт. Тым не менш, фірма плануе 70% выраблянай прадукцыі рэалізоўваць на экспарт, а астатняе — на беларускім рынку. Заказы на магілёўскія падгузкі паступілі з Расіі, вядуцца перамовы з Казахстанам і Украінай. Турэцкія бізнэсмены мяркуюць у перспектыве ўсталяваць яшчэ адну лінію па вытворчасці вільготных сурвэтак. Паводле інфармацыі Камітэта па эканоміцы Магілёўскага аблвыканкама, летась у Магілёўскай вобласці прыцягнулі больш за 60 мільёнаў долараў прамых замежных інвестыцый — а гэта другое месца сярод рэгіёнаў Беларусі, акрамя Мінска.

Ілона ІВАНОВА.

BYFLY І ZALA ДАРАЖЭЮЦЬ

З 18 студзеня кампанія «Белтэлекам» павышае тарыфы на шэраг паслуг электрасувязі.

Так, кошт доступу ў інтэрнэт byfly павялічыцца ў сярэднім на 9,7%. Тарыфы на паслугі інтэрактыўнага тэлебачання ZALA вырастуць у сярэднім на 10% . Званкі з сетак стацыянарнай электрасувязі абанентам сотавых аператараў падаражэюць у сярэднім на 10%. Таксама падаражэюць дадатковыя паслугі мясцовай тэлефоннай сувязі, даведачна-інфармацыйныя паслугі, некаторыя паслугі хостынгу, якія прадастаўляюцца Цэнтрам апрацоўкі даных Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белтэлекам», і шэраг іншых паслуг. Павышэнне тарыфаў нацыянальны аператар электрасувязі тлумачыць неабходнасцю мадэрнізацыі сетак і набыцця сучаснага абсталявання, без якіх немагчыма далейшае развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій і забеспячэнне высокай якасці паслуг. «Гэта вымушае кампанію ўнесці змяненні ў кошт некаторых паслуг электрасувязі, каб давесці яго да ўзроўню вяртання выдаткаў», — падкрэслілі на прадпрыемстве.

Больш падрабязную інфармацыю аб новых тарыфах можна будзе даведацца з 18 студзеня па тэлефоне даведачна-інфармацыйнай службы 130 (даведка бясплатная) або на сайце «Белтэлекам».

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПАДАТКАЎ АД ФЕРМЕРАЎ УДВАЯ БОЛЬШ

Фермеры Віцебскай вобласці летась заплацілі падаткаў у два разы больш, чым у пазамінулым годзе.

Паводле інфармацыі Віцебскай абласной падатковай інспекцыі, толькі за першыя 11 месяцаў 2012 года паступленні ў кансалідаваны бюджэт вобласці ад фермерскіх гаспадарак склалі 4,9 мільярда рублёў. Тэмп росту паступленняў у фактычных цэнах склаў 208,5% ці 2,5 мільярда рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Прэс-тур

НА ШТО ХВАРЭЕ РАСІЙСКАЯ ГЛЫБІНКА?

Агульныя карані славянскіх культур шукалі і знаходзілі журналісты Беларусі і Расіі падчас чарговага прэс-тура па рускіх гарадах, арганізаванага Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы і агенцтва «РІА Навіны». Ды разам з агульнымі каранямі знайшлі нямала адрозненняў.

ЗНАЁМЧЫСЯ з асобнымі народнымі промысламі Расіі, раз-пораз нібы «чапляешся»: здавалася б, нешта такога кшталту ёсць і ў нас, у Беларусі, аднак жа называецца яно, хутчэй, дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам, ці народнымі рамёствамі, і да ўзроўню промыслаў не дарастае. Асобны мастак, майстар можа стварыць выраб дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, у суседзяў гэта лічаць як мінімум адыходам ад традыцыі, а ў некаторых выпадках і ўвогуле падробкай. Таму прыклады промыслаў, з якімі знаёмілі нас, — фабрыкі, мануфактуры, майстэрні: Паўлавапасадская хустачная мануфактура, фабрыка «Каўроўская гліняная цацка», майстэрні іканапісу і мініяцюры горада Палех, прадпрыемства мастацкіх промыслаў «Вытокі» (вышывальны промысел), фабрыка «Гарадзецкі роспіс», фабрыка «Хахламскі роспіс».

Гаспадары распавядалі і падкрэслівалі: сапраўднае толькі ў нас. Вядома, нельга не пагадзіцца, што ўсе гэтыя прадпрыемствы маюць багатую гісторыю і традыцыі, якія больш-менш захоўваюцца і сёння (калі параўноўваць з Беларуссю, самы яркі прыклад, бадай, — аднаўленне вытворчасці слуцкіх паясоў). Таму і многіх майстроў вучаць не ў сталічных навучальных установах, а тут, на месцы.

ХУСТАЧНАЯ мануфактура горада Паўлаўскі Пасад вядома не толькі беларускім пакупнікам больш старэйшага пакалення, для якіх за гонар было мець сапраўдны паўлавапасадскі шаль, але і малодшым — у першую чаргу дзякуючы наладжаным пастаянным выстаўкам-продажам, што трэці год праводзяцца ў Мінску і абласных цэнтрах. На жаль, спецыялізаваных крам пакуль няма, аднак гэта пытанне часу. Вырашыць праблему набыцця шаля пакуль можа дапамагчы новая паслуга — шалі поштай.

Сёння на мануфактуры вырабляюцца традыцыйныя набіўныя хусткі, зусім невялікія шыйныя, шалі, абрусы — усё з натуральных тканін: бавоўна, шоўк, воўна, лён. Упрыгожваюць хусткі тымі ж малюнкамі, што падабаліся і нашым бабулям: многія з узораў паўтараюцца і карыстаюцца нязменным поспехам у пакупніц вось ужо больш як сто гадоў. Новыя малюнкі, створаныя мастакамі мануфактуры, таксама ў стылі ранейшых. Як распавядае намеснік дырэктара Вячаслаў Даўгоў, былі спробы ў пэўнай ступені адмовіцца ад традыцыі і звярнуцца да сучасных тэндэнцый: маладыя мастакі-практыканты прапанавалі свае ўзоры, вельмі сучасныя. Спярша яны зацікавілі пакупнікоў, але хутка модніцы вярнуліся да ўсё тых жа кветак і арнаментаў. Таму і не дзіўна, што выпускнікоў, якія атрымліваюць спецыяльнасць мастака, пасля размеркавання вучаць непасрэдна на мануфактуры вопытная майстры. І пройдзе не адзін год, пакуль яны створаць свой першы самастойны ўзор, які пасля ўпрыгожыць паўлавапасадскія шаль ці хустку.

Усяго ў калекцыі мануфактуры больш як тысяча малюнкаў, што ў розны час былі ўвасоблены на вырабах, аднак у вытворчасці значна менш. Тут ужо дыктуе свае ўмовы рынак: што падабаецца пакупнікам, тое і вырабляюць.

Ёсць меркаванне, што наша, славянскае, сёння часцей купляюць замежнікі. У Паўлавапасадскай хустачнай мануфактуры гэта не так: закупкі замежнікаў у параўнанні з аб'ёмамі вытворчасці не вельмі значныя. Куды больш набываюць славяне, якім узоры шаляў вельмі родныя і блізкія.

Мастакі Палехскай іканапіснай майстэрні распісвалі і Кафедральны сабор у Мінску, рабілі іканастас храма прападобнай Сафіі Слуцкай у Дудутках.

Такая цікавасць да агульных славянскіх каранёў заканамерна вылілася ў беларуска-расійскі праект. Мастакі мануфактуры разам з беларускай майстрыхай Нінай Бабровіч стварылі калекцыю «Букет для славянкі», якая складаецца з дзвюх частак: хусткі і адзенне беларуска-расійскага памежжа, на якім паўтараюцца матывы паўлавапасадскіх узораў. Упрыгожаць калекцыю шалі з прыгожымі мілагучнымі назвамі «Малінаўка», «Журавушка», «Славянка» і флагман праекта «Русь» — усе яны адлюстроўваюць і беларускую сімволіку. «Славянка», напрыклад, гэта напамін пра тыя невялічкія букецікі валошак, што прадаваліся раней на вуліцах святочнага Віцебска падчас «Славянскага базару».

Беларуска-расійскі праект, дарэчы, будзе прапанаваны на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва 2013-2014 гадоў.

ЯШЧЭ адзін цікавы прыклад беларуска-расійскага супрацоўніцтва — Палехская іканапісная майстэрня. Мастакі яе распісвалі ў тым ліку і Кафедральны сабор у Мінску, рабілі іканастас храма прападобнай Сафіі Слуцкай у Дудутках. Цяпер працуюць

над іканастасам мінскага храма Усіх Святых. А ўвогуле супрацоўніцтва з беларусамі мае свае традыцыі і доўжыцца вось ужо тры гады.

Што да самой майстэрні, працуюць тут у асноўным выпускнікі мясцовага мастацкага вучылішча імя М. Горкага, якія вывучаюць традыцыйнае майстэрства іканапісу і мініяцюры. Яшчэ сто гадоў таму ў горадзе працавалі майстэрні, а ў 1925-м нават была створана арцель, дзе з пакалення ў пакаленне перадавалася майстэрства. Цяпер тут адкрыта і працуе навучальная ўстанова — і тыя, хто некалі вучыўся ў майстэрнях, сёння ў новых ўмовах выкладаюць моладзі. Навучэнцаў няшмат: штогод выпуск складае 14-15 чалавек.

Зрэшты, у горадзе некалькі майстэрняў, і кожная, калі можна так сказаць, мае сваю спецыялізацыю. Яшчэ адна, да прыкладу, займаецца роспісам шкатулак і ёлачных шароў. Што ўразіла, дык гэта кошт, які не зусім стасуецца з прапановай, агучанай падчас выніковага пасяджэння «круглага стала«: трэба папулярызаваць народныя промыслы, і адпаведныя вырабы павінны быць у кожным рускім (чытаем: славянскім) доме. Дык вось кошт набору з пяці шкляных ёлачных цацак (неверагоднай прыгажосці) — 25 тысяч расійскіх рублёў. Майстрыха, якая іх распісвае, у месяц зарабляе... адзін шар. Тая ж праблема, як падалося, ёсць і ў горадзе Пучэж: вышываныя кашулі з сарафанамі і пінжакамі каштуюць часам да 13—14 тысяч рублёў. Дырэктар на нашу заўвагу абураецца: калі вы пытаецеся, чаму так дорага, вы нічога не ведаеце пра ручную работу. Прадавец у краме запэўнівае: у нас купляюць адзенне і мясцовыя прыгажуні. Ці не маскоўскія заробкі яны атрымліваюць?

Каментуючы такую сітуацыю, намеснік міністра культуры Расійскай Федэрацыі Андрэй Бусыгін назваў яе хваробай. А хваробы, як вядома, маюць звычку праходзіць ці вылечвацца. Што ж, будзем спадзявацца.

Нельга не сказаць, што рэчы насамрэч прыгожыя. Ды тое, як гэта ўсё падаецца, вымушае калі не сысці, дык засумнявацца, незадаволена (нават нам, беларусам, не асабліва разбэшчаным высокім узроўнем сэрвісу) пахмурыцца: самі крамы век рамонту не бачылі і нагадваюць вясковыя магазіны, якімі тыя былі гадоў пятнаццаць таму.

РАСПАВЯДАЦЬ пра народныя промыслы выключна ў кантэксце культуры не выпадае: сёння, як і раней, яны з'яўляюцца неад'емнай часткай эканомікі і рынку. Трэба шукаць пакупнікоў, арыентавацца на іх запыты — захоўваючы традыцыі, быць запатрабаваным і сёння. Да прыкладу, хахламскі роспіс, якім славіцца горад Сямёнаў, выйшаў за межы матрошкі ды посуду.

Пакуль мы бачылі знаёмых з савецкіх часоў матрошак, што хаваюцца адна ў адну (самая вялікая «серыя» складаецца з 16 — ад 40-сантыметровай да крыху большай за сантыметр), посуд з сунічкамі і лісцікамі, распісныя дзіцячыя столікі, усё было так, як і чакалі. Ды пасля — зялёны з ландышамі сервіз, выраблены па замове спявачкі Людмілы Зыкінай (свае любімыя кветкі яна захацела ўбачыць у традыцыйнай хахламе). Распісны фарфор. Клавіятуры, мышкі і флэшкі для камп'ютара — ужо мінулагоднее вынаходніцтва. З самага апошняга — канькі (іх яшчэ толькі рыхтуюць да продажу, кошт, хутчэй за ўсё, будзе больш як 5 тысяч рублёў). Замовіце партрэт з хахламской рамкай — мастакі напішуць

з фотаздымка (з аднаго з іх на нас глядзіць маладая дзяўчына. Кажуць, хлопец падарунак рыхтуе — каля 16 тысяч). «А калі хто-небудзь прыйдзе і папросіць, да прыкладу, аўтамабіль распісаць?» — пытаемся, употайкі спадзеючыся паставіць мастакоў у тупік і намацаць мяжу іх магчымасцяў. «Калі ласка!» — усміхаюцца яны, гатовыя да новага задання.

Аднак жа вялікіх грошай на гэтым не заробіш. Як зазначае дырэктар фабрыкі, эканамічнае становішча прадпрыемства цяжкае: каля 60% сабекошту складае праца работнікаў, у сістэме падаткаабкладання ніякіх ільгот, а заробак за апошнія некалькі гадоў нават крыху знізіўся. Усе спадзяюцца на змены.

Наслухаўшыся-нагледзеўшыся на цікавыя эксперыменты, мы рушым у краму — па драўляныя місачкі ды лыжкі. Кажуць, капусная салата з іх асабліва смачная.

ПРАДСТАВІЦЬ сваё майстэрства — асобная справа, часам не менш, а, можа, нават і больш складаная за задачу захаваць традыцыі. Горад Каўроў, да прыкладу, вядомы і гліняной цацкай, якая тут мае свае адметнасці — вялікая колькасць дробных дэталяў, вырабіць якія дазваляе асаблівы сорт гліны (блакітная, ці белая, як яе называюць. Пры гэтым цацкі вельмі трывалыя), тонкая работа мастакоў. Да таго ж цацкі вясёлыя. Маючы на мэце пазнаёміцца менавіта з народнымі промысламі горада, на сустрэчы з адміністрацыяй чуем здзіўленне: «Вас цікавяць гліняныя цацкі? Дык у нас жа горад воінскай славы!» І пасля нам шмат распавядаюць пра матацыклы, аўтаматы і гісторыка-мемарыяльныя комплексы. Падаецца выпадковай згадка пра дакументальны фільм, прысвечаны якраз гліняным цацкам.

Гарадзец на беразе Волгі, хутчэй за ўсё, выкліча шмат пытанняў і нараканняў у людзей дасведчаных, аднак для шараговага турыста (асабліва замежнага) будзе цікавым. У невялічкім горадзе, дзе пражывае каля 34 тысяч жыхароў, больш як 15 музеяў, распрацаваны 14 турыстычных маршрутаў — ёсць асобныя для дзяцей. Горад майстроў на самым беразе Волгі — навадзел. Пабудаваны тры гады таму, ён прадстаўляе традыцыйную архітэктуру, пачынаючы з канца XVI стагоддзя (хутчэй — агульнае пра яе ўяўленне). Унутры пабудовы наведвальнікаў чакае падарожжа па майстэрнях — разбяроў, вышывальшчыкаў, ганчароў, знаёмства з народнымі промысламі, майстар-класы і забаўляльная праграма з гарбатай і пернікамі. Улады маюць намер не спыняцца на зробленым і пашырыць «горад», уключыўшы ў яго рэстаран і гасцініцу.

Калі адысці далей ад берага і паглыбіцца ў вулачкі з чароўнымі разнымі налічнікамі на хатах, можна трапіць у дом графіні Панінай, музей пернікаў, музей дабра, наведаць фабрыку «Гарадзецкі роспіс», што спецыялізуецца на драўляных прадметах побыту і вытворчасці мэблі. Парадуе гасцей і старая частка горада — разам з савецкімі назвамі вуліц у дужачках пазначаны былыя.

Кіраўніцтва вобласці і горада ўпэўнена, што турызм будзе справай прыбытковай. Тым больш што яго развіццю спрыяюць некалькі ўмоў: наяўнасць традыцыйных народных промыслаў, добрая транспартная сувязь, у тым ліку і водная (цеплаходны круіз Самара — Растоў), прыгожыя краявіды Волгі і г. д. Не хапае, праўда, месцаў для начлегу — гасцініц і турыстычных баз, а таксама спецыялістаў, якія б маглі прасоўваць прадукцыю мясцовых майстроў. Вырашэнне гэтых пытанняў — задача на бліжэйшы час.

❍ ❍ ❍

Выніковае пасяджэнне «круглага стала» «Народныя промыслы: як захаваць, развіць і прымножыць?» да пытанняў, што ўзніклі падчас падарожжа і знаёмства з народнымі промысламі Расіі, дадало новыя. І акрэсліла шэраг праблем, якія, улічваючы выключную ролю промыслаў (намеснік дэкана гістарычнага факультэта МДУ імя М. Ламаносава Аксана Солапава назвала іх індыкатарамі нацыі: калі ёсць народныя промыслы, нацыя жыве), трэба тэрмінова вырашаць. Сярод самых хвалюючых — наяўнасць падробак і адсутнасць кантролю за мастацкай вартасцю зробленага; адсутнасць пунктаў продажу; складаная сістэма падаткаабкладання і адсутнасць ільгот. Сёння спадзевы — на папраўкі да Федэральнага закона «Аб народных мастацкіх промыслах», прынятага дэпутатамі Дзяржаўнай думы Расіі 11 снежня.

Калі звярнуцца да тэмы вандроўкі і пошуку агульных каранёў, варта згадаць і адну цікавую прапанову, выказаную начальнікам аддзела сацыяльнай палітыкі і інфармацыйнага забеспячэння Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Івана Яновіча, якая абавязкова павінна быць рэалізавана: сумесная беларуска-расійская выстаўка-ярмарка, тэматычная канферэнцыя, арганізаваныя пры падтрымцы Пастаяннага камітэта.

Таццяна КУЗНЯЧЭНКАВА.
Фота Уладзіміра ПЕХЦЕРАВА

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

10 СТУДЗЕНЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15711)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Люцыя ЛУШЧЫК:

«Я не цярплю побач з сабой непрафесіяналаў...»

Люцыя Лушчык скончыла Інстытут журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На тэлебачанні — са студэнцкіх гадоў. Працуючы на Першым музычным тэлеканале, у 2004 годзе яна выйграла грант Дзярждэпартамента ЗША і прайшла стажыроўку на тэлеканалах BBS I CNN. Сёння з'яўляецца вядучай праграм «Наша раніца», «Бітва тытанаў» на АНТ. У 2007 годзе стала фіналісткай шоу «Зорны цырк». У 2011 годзе пачала здымацца ў кіно і іграць у тэатры. Яе можна ўбачыць у тэлесерыялах «Паласатае шчасце», «Навігатар», «Белыя ваўкі». Актрыса Сучаснага мастацкага тэатра, іграе ў спектаклі «Мінск, я люблю цябе». Таксама ў 2008 годзе была тварам рэкламных білбордаў кампаніі «Спартак», а ў 2010-м стала гераіняй рэкламнай кампаніі гандлёвай маркі «Лідскі квас». Мае шэраг узнагарод, сярод якіх «Тэлевяршыня» (2008) і «Залатое вуха» (2006), Лаўрэат Прафесійнага конкурсу ў галіне развіцця грамадскіх сувязяў «PRмія-2006» у намінацыі «Лепшая PR-персона 2006 года».

Вядучая тэлеканала АНТ Люцыя Лушчык — заўсёды яркая і эмацыянальная як на экране, так і ў жыцці. Яна не губляе веры ў людзей і даверу да іх, і ўпэўнена, што выпрабаванні неба шле нам толькі ў той меры, якую мы здольны вытрымаць. Люцыя ведае сакрэт не толькі паспяховасці, але і жаночага шчасця. І ўсё ж такі часам яна жадае спыніцца і адпачыць, каб потым зноў скараць новыя вяршыні...

— Люцыя, прызнайцеся, пра што вы думаеце кожны раз, калі заканчваюцца чарговыя здымкі ці іншае мерапрыемства?

— Калі быць цалкам шчырай, то... пра ежу. З мяне нават смяюцца, што пасля канцэрта або эфіру я магу з'есці «вагон ежы». Незалежна ад таго, што гэта будзе і ў якой колькасці, бо праца мяне вельмі стамляе і забірае шмат энергіі. Звычайна, я бяру з сабой што-небудзь на перакус — ёгурт ці яблык, але гэта не выратоўвае. І калі мне на вочы трапляецца ежа, я магу з'есці ўсё, што бачу.

— З такім тэмпам жыцця, напэўна, і дыеты непатрэбныя. Як падтрымліваеце такую выдатную форму?

— Быў час, калі я займалася ёгай. Потым упадабала бег. Люблю хадзіць пешшу. І наведваю спартзалу. Таксама мне падабаецца басейн і лазня. Але гэта ў дні, калі магу сабе дазволіць такую раскошу. У стандартным жа рэжыме я два ці тры разы на тыдзень стараюся альбо рабіць прабежкі па чатыры кіламетры, альбо гуляць па восем кіламетраў. У цэлым мне пашчасціла з фігурай. Ну і вельмі дапамагае ў падтрыманні формы праца, бо любы стрэс — станоўчы ён ці адмоўны — пазбаўляе калорый.

— А калі казаць пра штодзённы догляд за сабой, то які ён?

— Я, можна сказаць, за здароўе знутры. П'ю розныя вітаміны для скуры, стараюся ўжываць шмат вады. Вечарам выключаю каву з рацыёну. А калі дазваляю сабе кубачак раніцай, то п'ю яе толькі з малаком. Мне падабаецца заварваць сабе розныя траўкі. На зіму сушу грыбы і ягады. Баюся ператварыцца ў чалавека, які спажывае размарожаную вячэру. Лепш пачысціць моркву, бульбу, патушыць рыбку. А для скуры няма лепшага скрабу, чым кававая гушча з аліўкавым алеем. Безумоўна, наведваю касметолага, які абураецца, што я мала ўвагі сабе надаю.

— Складваецца ўражанне, што ў вас гарманічна спалучаецца дамашні чалавек з медыйнай персонай...

— Мае родныя і сябры таксама гэта адзначаюць. Дома я магу быць спакойнай, нешта гатаваць, прыбірацца. Усім усміхаюся, гляджу тэлевізар. І мяне з хаты нават не выманіць. А на працы праяўляюцца ў вышэйшай ступені мая сабранасць і адказнасць. Я адпрацоўваю, саджуся ў машыну — і ўсё заканчваецца. У мяне ў галаве ёсць тумблер, і калі я не працую, то адключаю яго, бо не хачу, каб усё маё жыццё было жыццём публічнага чалавека.

— Вашы бацькі, мабыць, ганарацца дачкой?

— Дакладна магу сказаць, што яны мяне падтрымліваюць. Але мае бацькі — вельмі строгія крытыкі. І гэта тычыцца ўсяго, што б я ні рабіла. А ганарыцца? У іх не прынята казаць: «Яна ў нас такая малайчына!». Затое я ведаю, што ў любой сітуацыі магу звярнуцца да іх, і яны мне дапамогуць.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Педсавет

ЧАМУ ШКОЛЬНІКІ «НЕ СЯБРУЮЦЬ» З МАТЭМАТЫКАЙ?

Што трэба зрабіць для засваення школьнікамі праграмы па фізіцы і матэматыцы: павялічваць колькасць гадзін, якія адводзяцца на іх вывучэнне, уводзіць прафілізацыю на старэйшай ступені школы, змяняць форму экзаменаў на выхадзе са школы ці пры паступленні ў ВНУ або больш увагі надаваць якасці школьных падручнікаў і падрыхтоўцы педагагічных кадраў? Адказы на гэтыя пытанні сёння шукаюць не толькі ў нашай краіне, але і ў суседняй Расіі, дзе абітурыенты таксама нярэдка шакіруюць экзаменатараў сваімі «бліскучымі ведамі». Напрыклад, кожны дзясяты выпускнік расійскай школы не змог сёлета на Адзіным дзяржаўным экзамене знайсці правільны адказ да наступнай задачкі: «Цягнік адпраўляецца ад вакзала пункта А ў 20.52 і прыходзіць у пункт В у 16.40 наступнага дня. Колькі часу ён праводзіць у дарозе?»

Першакурснікі — у шоку...

Прадстаўнікі расійскай вышэйшай школы — удзельнікі міжнароднай канферэнцыі, што напрыканцы года прайшла ў БДУІР, — канстатавалі, што ў апошнія гады яны фактычна пазбавіліся магчымасці праводзіць адбор здольных навучацца ў ВНУ, а замест конкурснага набору адбываецца «падбіранне ўсіх ахвотных з вуліцы». Гэта прыводзіць да таго, што большая частка набраных у ВНУ студэнтаў абсалютна неадукаваныя ў базавых для інжынернай падрыхтоўкі школьных прадметах, перш за ўсё такіх, як фізіка і матэматыка. А ўсялякага роду формы «давучвання» першакурснікаў, да якіх вымушаны прыбягаць у ВНУ, на жаль, не прыносяць чаканага эфекту...

У беларускіх ВНУ таксама вымушаны ўводзіць спецыяльныя курсы — каб хоць крыху падцягнуць слаба падрыхтаваных першакурснікаў да ўніверсітэцкага ўзроўню. Студэнты нярэдка прыходзяць ва ўніверсітэт з «дзявяткай» ці «дзясяткай» у атэстаце, але рашыць прасцейшую задачу не могуць. Больш за тое, выкладчыкі тэхнічных ВНУ канстатуюць, што адаптавацца да патрабаванняў вышэйшых навучальных устаноў складана нават добра падрыхтаваным абітурыентам. А што ўжо казаць пра слабых першакурснікаў, якія з матэматыкай увогуле не сябруюць? Некаторыя з іх знаходзяцца ў стане шоку ад вялікага аб'ёму вучэбнага матэрыялу, які трэба засвоіць, а таксама ад таго, што кожны раз на занятках разглядаецца новая тэма.

«Задача на вымярэнне плошчы кухні — не суперзадача для будучага інжынера, канструктара ці праграміста! Такая задача аказалася некалькі гадоў таму не пад сілу 40% (!) удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання».

Сярод студэнтаў сёння шмат такіх, якія лічаць веданне тэорыі чымсьці залішнім. І ім няўцям, што без ведання тэорыі немагчыма рашыць задачу. Выкладчыкі вымушаны змагацца з адмоўным стаўленнем студэнтаў да патрабаванняў ведаць доказы тэарэм і высновы формул. Ім даводзіцца фактычна з нуля пачынаць развіццё ў студэнтаў творчага мыслення. Часта гэта не ўдаецца і за два гады навучання матэматыцы ў тэхнічнай ВНУ...

Навошта інжынеру матэматыка?

Да слова, яшчэ некалькі гадоў таму, калі пераглядаліся вучэбныя планы, многія педагогі папярэджвалі, што школьная матэматычная адукацыя ў Беларусі разбураецца і знішчальныя працэсы могуць набыць неабарачальны характар. Што мы сёння, уласна кажучы, і назіраем. «Дасье» арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання штогод папаўняюць элементарныя задачкі, з якімі прэтэндэнты на студэнцкі білет не спраўляюцца. Вядома, можна ўсё спісаць на масавасць і даступнасць вышэйшай адукацыі, але ж пагадзіцеся, што задача на вымярэнне плошчы кухні — гэта не суперзадача для будучага інжынера, канструктара ці праграміста! Між іншым такая задача аказалася некалькі гадоў таму не пад сілу 40% (!) удзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свая справа

Не хочацца працаваць «на чужога дзядзьку»? ПАЧНІ СВОЙ БІЗНЭС!

Быць бізнэсменам — гэта модна і крута. Не тое што ў 1990-я гады, калі камерсантаў ганебна называлі «таргашамі», «шмотачнікамі» і іншымі непрыгожымі словамі. Сёння сітуацыя памянялася: калі мы кажам бізнэсмен, то ўяўляем ужо не брытагаловага «братка» ў малінавым піжаку, а інтэлігентнага, упэўненага ў сабе чалавека на дарагой машыне і ў дарагім адзенні, які мае асобны кабінет у сучасным офісе і кіруе больш-менш буйной кампаніяй.

А як самому стаць бізнэсменам? Насамрэч, усё не так і складана. Галоўнае — мець вялікае жаданне і ўпарта імкнуцца да пастаўленай перад сабой мэты. І забыцца на «адмазкі», што, маўляў, «няма першапачатковага капіталу» ці «заканадаўства занадта складанае» — у свеце ёсць мноства прыкладаў, калі людзі стваралі вялізныя кампаніі літаральна з нуля і зараблялі мільярды ў самых складаных умовах.

Дык з чаго ўсё-такі пачаць? Напэўна, адразу трэба вызначыцца, чым канкрэтна вы хочаце займацца: гандляваць мабільнікамі або бульбай, вырошчваць гародніну ці заснаваць невялічкі свечачны заводзік, адкрыць дызайнерскае агенцтва, кавярню або бюро перакладаў. Хаця і тут не ўсё так адназначна: многія бізнэсмены пачыналі з аднаго віду дзейнасці, а потым з часам яго кідалі і займаліся зусім іншым. Але ўсё-такі было б добра спачатку вызначыць, што вы ўмееце рабіць і чым вам хочацца займацца.

Будучаму бізнэсмену было б нядрэнна наведаць інтэрнэт і пачытаць заканадаўства, якое датычыцца прадпрымальніцкай дзейнасці. Вядома, гэта не раман Дзюма — месцамі можа быць сумна і нудна.

Далей — трэба ацаніць свае магчымасці і перспектывы. Калі ў вашым горадзе ўжо працуе 100 крам з мабільнымі тэлефонамі, то ці ёсць сэнс адкрываць сто першую? Чым вы зможаце заваяваць кліентаў? Якія ў вас перавагі перад канкурэнтамі? Ну і, безумоўна, трэба палічыць грошы: якія ў вас будуць выдаткі, якая выручка, ці будзе ваша дзейнасць прыносіць прыбытак.

Калі ўсё па вашых разліках атрымліваецца добра і вы яшчэ не перадумалі стаць бізнэсменам, то трэба пераходзіць да рэгістрацыі. Зрабіць гэта сёння не складана: па прастаце рэгістрацыі бізнэсу Беларусь у рэйтынгу «Doing Business 2013» Сусветнага банка знаходзіцца на дзявятым месцы сярод 185 краін свету. Зразумела, што ў гэтым матэрыяле ўсіх нюансаў не прапішаш, бо шмат што залежыць ад абранага вамі віду дзейнасці, але агульную логіку рэгістрацыі патлумачым.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 01 2013 г.

ЧАМУ ШКОЛЬНІКІ «НЕ СЯБРУЮЦЬ» З МАТЭМАТЫКАЙ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Сёлета ж 40% удзельнікаў тэсціравання па матэматыцы не здолелі пазнаць з прыведзеных варыянтаў адказаў раўнабедраны трохвугольнік. Два вуглы былі вядомыя, а трэці трэба было вылічыць. Элементарнае заданне, але абітурыент павінен быў ведаць, што сума вуглоў трохвугольніка — 180°, а ў раўнабедраным трохвугольніку два вуглы — роўныя.

Каля 6% удзельнікаў тэсціравання па фізіцы не змаглі пазнаць прыбор, прызначаны для вымярэння хуткасці, 10% — прыбор для вымярэння вільготнасці, 12% — барометр, а 25% удзельнікаў ЦТ не ведалі прызначэнне мензуркі. Між іншым матэматыка і фізіка з'яўляюцца профілюючымі дысцыплінамі для тэхнічных спецыяльнасцяў.

Выйсце — у дадатковых гадзінах?

Яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гадоў Міністэрствам адукацыі было прынята рашэнне аб адмене вуснага экзамену па геаметрыі пасля базавай школы. І цяпер на выхадзе як з базавай, так і з сярэдняй школы практыкуецца толькі пісьмовы экзамен, які ўключае задачы па алгебры і геаметрыі. На думку педагогаў, адмена вуснага экзамену катастрафічна адбіваецца на ўзроўні засваення зместу прадмета, і, найперш, курса па планіметрыі: у школьнікаў не фарміруецца навык разгорнутых доказных разважанняў, не засвойваюцца ў дастатковай ступені фармулёўкі тэарэм і азначэнняў. Добра вядома, што навучыць рашэнню геаметрычных задач не менш цяжка, чым рашэнню тэкставых задач у алгебры. Але навучыць абгрунтаванню матэматычных сцвярджэнняў праз адмаўленне доказаў асноўных тэарэм магчыма, і настаўнікі савецкай школы паспяхова з гэтым спраўляліся.

Педагогі перакананыя, што вывучэнне матэматыкі ў школе застаецца адным з асноўных стаўпоў у развіцці інтэлекту дзіцяці, бо матэматыка — гэта гімнастыка для розуму, якая фарміруе агульныя прыёмы мыслення, яго логіку, трэніруе памяць, знаёміць з асноўнымі матэматычнымі фактамі, вучыць пошуку шляхоў вырашэння праблем — а без усяго гэтага немагчыма паспяховае навучанне па многіх іншых прадметах, у тым ліку і вывучэнне фізікі. Нярэдка толькі ў старэйшых класах школьнікі канчаткова вызначаюцца са сваімі схільнасцямі да тых ці іншых навук. Але што рабіць старшакласніку, які раптам з жахам зразумеў, што яму не хапае базавых матэматычных ведаў для атрымання запаветнай прафесіі? Праблемай нумар адзін, на думку педагогаў, з'яўляецца адсутнасць у сучасных школьнікаў разумення значнасці матэматычных ведаў. Асабліва ў тых, якім не трэба здаваць матэматыку на ўступных іспытах.

Намеснік міністра адукацыі нашай краіны Васіль Будкевіч упэўнены, што сістэма адукацыі павінна адпавядаць патрэбам грамадства і той сітуацыі, якая рэальна складваецца ў сектары эканомікі:

— У нас сёння назіраецца яўны ўхіл у гуманітарны бок. Пры гэтым мы цудоўна разумеем, што без авалодання фізікай і матэматыкай падрыхтаваць у дастатковай колькасці інжынерна-тэхналагічныя кадры для рэальнага сектара эканомікі немагчыма. Менавіта матэматычная адукацыя з'яўляецца падмуркам для стварэння высокатэхналагічнай эканомікі, таму мы вымушаны думаць пра будучыню.

Бяспройгрышныя інвестыцыі

Згодна з праграмай развіцця расійскай школьнай адукацыі да 2020 года, асноўны акцэнт у Расіі будзе зроблены на матэматыку.

Новую канцэпцыю матэматычнага навучання ў Расіі плануецца будаваць на некалькіх паказчыках: выніках дзяржаўнай выніковай атэстацыі ў 9-м і 11-м класах, маніторынгах вынікаў навучання, даных маніторынгу вышэйшых навучальных устаноў, выніках міжнародных даследаванняў і стандартах краін—членаў Азіяцка-Ціхаакіянскага эканамічнага супрацоўніцтва.

— Развіццё матэматычнай адукацыі з'яўляецца адначасова і найменш затратнай і найбольш універсальнай бяспройгрышнай інвестыцыяй. Менавіта ў гэтай галіне Расія можа выйсці на лідзіруючыя пазіцыі, што можа пацягнуць за сабой і развіццё іншых галін, — лічаць у галоўным расійскім адукацыйным ведамстве.

Акрамя таго, спецыялісты міністэрства мяркуюць, што менавіта інвестыцыі ў гэтую галіну будуць найбольш эфектыўнымі ў кароткатэрміновай, сярэднетэрміновай і доўгатэрміновай перспектывах па прычыне параўнальнай «таннасці» матэматыкі і яе ролі ва ўсіх іншых галінах навукі і тэхналогіі.

Таксама будзе развівацца сістэма пошуку дзяцей, у якіх ёсць здольнасці да матэматыкі. Ім будуць стварацца ўмовы для развіцця, у тым ліку ў школах-інтэрнатах. У старэйшай школе будзе захавана варыятыўнасць адукацыі, калі школьнікі будуць самі выбіраць кірунак, па якім яны хочуць спецыялізавацца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Ад рэдакцыі:

А што, на вашу думку, трэба зрабіць, каб павысіць значнасць матэматычных ведаў у беларускіх школьнікаў і не дапусціць далейшага разбурэння матэматычнай адукацыі ў Беларусі? Запрашаем усіх, каму ёсць што сказаць па ўзнятай праблеме, да адкрытай дыскусіі на старонках газеты.

Вынікі анкетавання, праведзенага спецыялістамі Нацыянальнага інстытута адукацыі ў рамках маніторынгу ўзроўню навучанасці па матэматыцы:

Свае цяжкасці пры вывучэнні матэматыкі навучэнцы звязваюць з:

— прабеламі ў ведах па некаторых тэмах (37% дзевяцікласнікаў і 34% адзінаццацікласнікаў);

— вельмі хуткімі тэмпамі правядзення вучэбных заняткаў (14% дзевяцікласнікаў і 16% адзінаццацікласнікаў).

Як сведчыць анкетаванне, заўсёды выконваюць хатнія заданні па матэматыцы 72% дзевяцікласнікаў і 70% адзінаццацікласнікаў. Астатнія ж навучэнцы хатнія заданні выконваць не заўсёды або ўвогуле іх не выконваюць.

У якасці прычыны невыканання або нерэгулярнага выканання хатніх заданняў навучэнцы ўказалі наступныя:

— складанасць хатніх заданняў (76% дзевяцікласнікаў і 65% адзінаццацікласнікаў);

— не зусім зразумелы вучэбны матэрыял (74% дзевяцікласнікаў і 57% адзінаццацікласнікаў);

— магчымасць спісаць хатняе заданне на перапынку (55% дзевяцікласнікаў і 51% адзінаццацікласнікаў);

— вялікі аб'ём заданняў (37% дзевяцікласнікаў і 28% адзінаццацікласнікаў);

— рэдкую праверку выкання хатніх заданняў настаўнікам (28% дзевяцікласнікаў і 10% адзінаццацікласнікаў).

ПРЫМУСІЦЬ ЗАПАНІКАВАЦЬ МОЖА НАВАТ ВЫГЛЯД ПАДРУЧНІКА

Страх перад рашэннем матэматычных задач амерыканскія спецыялісты прыраўнялі да фобіі. Як удалося ўстанавіць амерыканскім даследчыкам, адны толькі думкі пра матэматыку могуць актывізаваць у чалавека тыя ўчасткі мозга, якія адказваюць за выяўленне пагроз і вопыт фізічнага болю. Трывога, якая з'яўляецца ў чалавека ў той момант, калі ён сутыкаецца з матэматычнымі задачамі, прымушае мозг рэагаваць на гэта пэўным сігналам. Падобны сігнал актывізуецца і ў той момант, калі чалавек дакранаецца рукой да гарачай пліты

— Цікава, што актывацыя асаблівых зон мозгу адбываецца менавіта ў працэсе чакання, а не непасрэдна падчас працэсу рашэння задач, — адзначаюць даследчыкі з Чыкагскага ўніверсітэта. — Прычым трывогу ва ўдзельнікаў эксперыменту выклікалі не толькі задачы, але нават від падручніка па матэматыцы, а таксама знаходжанне побач з кабінетам матэматыкі.

Пакуль добраахвотнікі выконвалі розныя тэсты, даследчыкі рабілі магнітна-рэзанансную тамаграфію іх мозга. Навукоўцы прапанавалі выканаць ім некалькі матэматычных задач — напрыклад, вызначыць ці правільна быў дадзены адказ у прыкладзе (12х4) -19 = 29. А таксама выканаць задачу, не звязаную з матэматыкай: адгадаць, якое слова зашыфравана сярод пераблытаных літар. Тамаграфія паказала, што чаканне матэматычных задач актывізавала тыя зоны мозга, якія адказвалі за фізічны боль. Аднак непасрэдна падчас рашэння актыўнасць у гэтых зонах не назіралася. Іншымі словамі, чаканне ўспрымалася больш хваравіта, чым сам працэс. Чыкагскія даследчыкі мяркуюць, што такая рэакцыя павінна карэктавацца, як і любая іншая фобія. І замест таго, каб караць студэнтаў, якія негатыўна ўспрымаюць працэс рашэння матэматычных задач, неабходна аказваць ім спецыялізаваную дапамогу.

Надзея НІКАЛАЕВА.

КЛАСІКІ НА НОВЫ ЛАД: ЧАЛАВЕК І ФЕСТЫВАЛЬ

Сёлета, знаходзячыся ва Украіне, стала сведкай цудоўнага дзейства: дзяўчынка гадоў 11-12 з захапленнем чытала на памяць са сцэны вялікі верш украінскага класіка Івана Франко. Адбывалася гэта цудоўнае дзейства на аднайменным музычна-літаратурна-тэатральным фестывалі — такі «лікбез» прыдумалі ахвочыя да музыкі і танцаў украінцы. Чым не піяр свайго?

«Малодшы брат Шаўчэнкі»

Пару слоў варта, безумоўна, сказаць пра віноўніка фестывалю — нагуевіцкага «каменяра» Івана Якаўлевіча Франко. Паэт, празаік, драматург, публіцыст, выдавец, філосаф, перакладчык, гісторык, псіхолаг, эканаміст, мовазнаўца, палітык — іпастасяў ён мае даволі багата. «Іван Франко — гэта рэгіянальны Шаўчэнка ў Галіччыне, — тлумачыць кіеўскі журналіст Паўло Зуб'юк. — Таму стаўленне да яго адпаведнае — як да малодшага брата Шаўчэнкі». Спадчына, якая засталася ўкраінцам (а менавіта Іван Якаўлевіч прапанаваў увесці назву «ўкраінцы» замест «русіны»), захапляе сваімі памерамі. Не дзіўна, што імем гэтага чалавека названы ўніверсітэты, вуліцы і нават горад — сапраўды, гэта гонар нацыі.

Чалавек-фестываль

Зладзіць свята ў адзіночку амаль немагчыма, таму дзеля Франко аб'ядналіся моладзевая арганізацыя «Інше місто» (горад Драгобыч), FM-станцыя «Твоє радіо», грамадска-культурніцкая арганізацыя «АЛЬТЕР» і выдавецтва «Кола». Падарунак наведнікам атрымаўся неблагі — уваход і пражыванне на фестывалі былі бясплатнымі. «Франко Фест» змінить імідж Івана Франка!» — запэўнілі гасцей арганізатары мерапрыемства — дваццацігадовыя хлопцы і дзяўчаты. І не схлусілі. «Новы» Іван Франко — гэта вобраз прагрэсіўнага маладога ўкраінца, які размаўляе па-ўкраінску, ведае гісторыю і імкнецца захаваць культурную спадчыну для нашчадкаў. Каб падкрэсліць знакавасць і культавасць чалавека-фестывалю, валанцёры апрануліся ў яркія майкі з партрэтам Франко ў стылі поп-арту.

Тры дні фестываль гудзеў на ўсю ваколіцу драгобыцкага сяла Нагуевічы. Тут знаходзіцца музей, адноўлена бацькоўская хата Івана Франко. Культурна-масавыя мерапрыемствы разышліся па трох сцэнах: музычнай, літаратурна-мастацкай і фальклорнай. Тэатральныя перфомансы, літаратурныя лекцыі, паэтычнае спаборніцтва, ноч у музеі ў кампаніі з франказнаўцамі... Першае цялятка выйшла не шчаняткам, нават наадварот — «Франко-фэст» пабіў усе рэкорды па наведванні. Напэўна, гэта было самае вялікае палатачнае мястэчка за ўсю гісторыю ўкраінскага фестывальнага руху — па падліках арганізатараў, падтрымаць новы імідж Франко сабраліся каля 40 тысяч чалавек (практычна насельніцтва Ваўкавыска).

Што можам мы?

Украінскі досвед падштурхоўвае да пошуку беларускага адпаведніка «чалавеку-фестывалю». На думку літаратурнага крытыка Аксаны Бязлепкінай, самы паспяховы і просты спосаб піяру свайго класіка — асучасніць яго. Узяць самага пазнавальнага з іх — Коласа альбо Купалу — і падаць на новы лад. Трэба пазбавіцца тормазу «прасоўвання» — старых метадаў агітацыі і прапаганды, якім ёсць безліч альтэрнатыў. Але ўсё гэта тэорыя, а што на практыцы?

Тыя ж украінцы захапляюцца беларускай гістарычнай рэканструкцыяй. «У нас таксама праводзяцца падобныя фэсты, але ў вас гэта выходзіць неяк больш адметна», — кажа студэнтка Наталля. Думкі пра нацыянальны гістарычны фэст, прысвечаны Сярэднявеччу, праскокваюць у фронтмена гурта «Нельга забыць» Міхаіла Бараноўскага. «Я стварыў бы фэст пад назвай «Сівая легенда» і прысвяціў яго Уладзіміру Караткевічу, — плануе Міхаіл. — Запрасіць на свята варта было б лепшыя рок-фольк-гурты: «Троіца», «PAWA», «Alta mente», «Стары Ольса», «GUDA», барда Яўгена Барышнікава. Думаю, што рэканструктарскі фестываль з інсцэніроўкамі сюжэтаў з аповесцяў і раманаў будзе цікавы многім. Ёсць яшчэ задумка зрабіць рок-альтэрнатыўны фестываль імя Максіма Багдановіча. Беларуская альтэрнатыўная музыка даволі цікавая і вядомая не толькі ў нас, але ўсё ж такі мае патрэбу ў піяры. Магчыма, хутка мы да гэтага прыйдзем — вазьміце, напрыклад, фестываль на хутары «Шаблі».

Прапановы ёсць, ідэі ёсць... Але, тым не менш, беларускія класікі ўсё яшчэ патрабуюць якаснай змены іміджу. Хто стане першым беларускім чалавекам-фестывалем і як хутка Купала з Коласам стануць хаця б «тварамі з майкі» — залежыць толькі ад нашай ініцыятывы.

Кацярына РАДЗЮК.

НЕ ХОЧАЦЦА ПРАЦАВАЦЬ «НА ЧУЖОГА ДЗЯДЗЬКУ»? ПАЧНІ СВОЙ БІЗНЭС!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Па-першае, трэба вызначыць як будзеце рэгістравацца: у якасці індывідуальнага прадпрымальніка ці адразу ствараць юрыдычную асобу. Першы варыянт — самы просты і патрабуе найменш фінансавых выдаткаў. Другі таксама можа быць, калі ў вас, напрыклад, ужо падабрана каманда для бізнэсу і ёсць такія-сякія грошы на пачатак. У кожнага з гэтых варыянтаў ёсць свае плюсы і мінусы: як ужо адзначалася, індывідуальныя прадпрымальнікі (ІП) маюць мінімальныя выдаткі для ўваходжання ў бізнэс, а таксама спрошчаныя сістэмы падаткаабкладання і вядзення бухгалтарскага ўліку. Затое ІП нясуць поўную адказнасць па даўгах — уласнай маёмасцю (у той час як пры банкруцтве фірмы могуць адабраць толькі маёмасць арганізацыі, а не вашу, скажам, кватэру) і не могуць наймаць сабе работнікаў, акрамя членаў сваёй сям'і. Тым не менш, індывідуальнае прадпрымальніцтва падыходзіць для таго, каб назапасіць капітал і праверыць свае здольнасці ў бізнэсе. А калі ўсё будзе атрымлівацца — потым ужо зарэгіструеце

Па прастаце рэгістрацыі бізнэсу Беларусь у рэйтынгу «Doing Business 2013» Сусветнага банка знаходзіцца на дзявятым месцы сярод 185 краін свету.

сабе фірму, а то і не адну. Далей мы будзем расказваць пра тое, як зарэгістраваць менавіта індывідуальнае прадпрымальніцтва, бо рэгістрацыя юрыдычнай асобы больш складаная.

Будучаму бізнэсмену было б нядрэнна наведаць інтэрнэт і пачытаць заканадаўства, якое тычыцца прадпрымальніцкай дзейнасці. Вядома, гэта не раман Дзюма — месцамі можа быць сумна і нудна, але ж трэба хоць трохі мець уяўленне пра тое, у якіх умовах прыйдзецца працаваць. Як мінімум, трэба адшукаць Агульнадзяржаўны класіфікатар «Віды эканамічнай дзейнасці» (ён ёсць, напрыклад, на сайце Нацыянальнага статыстычнага камітэта) і ў гэтым дакуменце знайсці від дзейнасці, якім вы хочаце займацца, і яго код.

Пасля гэтага з пашпартам і адной фотакарткай можна ісці ў выканкам па месцы жыхарства. Знаходзіце аддзел, які займаецца прадпрымальніцтвам. Там трэба напісаць заяву, узяць квітанцыю і схадзіць у банк — заплаціць дзяржаўную пошліну ў памеры 0,5 базавай велічыні (калі ведаеце рэквізіты — можна спачатку заплаціць і ісці ў выканкам ужо з цэтлікам аб аплаце, тады лішні раз не трэба будзе бегаць). І ў гэты ж самы дзень вас ужо зарэгіструюць як індывідуальнага прадпрымальніка, а максімум назаўтра выдадуць пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі. Вас можна павіншаваць — вы ўжо бізнэсмен! Праўда, яшчэ трэба адкрыць рахунак ў банку (калі гэта патрэбна для вашай дзейнасці) і стаць на ўлік у падатковай інспекцыі. Першая праблема вырашаецца проста — у любым банку за 10 хвілін вам адкрыюць рахунак. Другая праблема таксама не складаная: на працягу пяці дзён пасля рэгістрацыі выканкам сам паставіць вас на ўлік у падатковых органах, органах Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва і «Белдзяржстраху». Праўда, у падатковую ўсё адно прыйдзецца схадзіць — каб выбраць сабе сістэму падаткаабкладання (найбольш выгадную для вашага бізнэсу) і набыць патрэбныя дакументы накшталт кніг уліку праверак, водгукаў, даходаў і выдаткаў і г.д.

Ну і ўсё — гатова, бізнэс створаны. Працуйце і не забывайце плаціць падаткі. Калі будуць якія пытанні — смела задавайце іх работнікам у выканкаме і падатковай інспекцыі: вам павінны параіць, як тое ці іншае дзеянне лепш аформіць і што далей рабіць. Напрыклад, у Міністэрстве па падатках і зборах арганізаваны тэматычныя тэлефонныя лініі, куды ў пэўны час і дзень можна патэлефанаваць і папрасіць растлумачыць той ці іншы нюанс па налічэнні падаткаў. Ну і таксама не варта забывацца, што ёсць цэнтры падтрымкі прадпрымальнікаў і інкубатары, арыентаваныя на маладых бізнэсменаў. Там вам як мінімум дапамогуць парадай, як максімум — зможаце на льготных умовах атрымаць офіснае памяшканне і іншыя паслугі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праверана на сабе

«Я ЎЖО НАШМАТ АПЯРЭДЗІЛА ЎЗРОВЕНЬ БЫЛОЙ ЗАРПЛАТЫ...»

Кацярына Мядзелец зарэгістравалася як індывідуальны прадпрымальнік нядаўна — у маі мінулага года. Да гэтага працавала ў салоне сантэхнікі, потым у прыватнай фірме дызайнерам інтэр'еraў. З часам вырашыла: навошта працаваць на кагосьці, калі можна займацца тым жа самым, але быць самой сабе начальніцай? Так і стала бізнэсменам, а калі дакладней, то бізнэсвумен. І зусім аб гэтым не шкадуе.

— Ці складана было зарэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка?

— Абсалютна не. Складанасці пачаліся з паходу ў падатковую інспекцыю і пастаноўкі на ўлік. Там вельмі злосна адказвалі на мае пытанні. Потым, калі справа дайшла да разбору бухгалтэрыі, я наогул запанікавала, сама перачытвала законы, бо на мае пытанні ў падатковай нармальнай мовай адказаць не маглі. Прыходзілася нават дакучаць сяброўцы, якая мае бухгалтарскую адукацыю. Мяркую, нядрэнна было б стварыць на базе якіх-небудзь бізнэс-інкубатараў інструкцыю па бухгалтэрыі ІП для «чайнікаў». У свой час гэта мне вельмі спатрэбілася б!

— Наколькі я зразумеў, бізнэс ідзе паспяхова. Якія далейшыя планы?

— На гэты год вельмі шмат ідэй наконт пашырэння бізнэсу. Планую супрацоўнічаць з Літвой, навучаць некалькі чалавек дызайнерскай справе для далейшага супрацоўніцтва. Ёсць пара ідэй і для зусім новых кірункаў, можа, іх паспрабую «памацаць».

Магу сказаць, што мой бізнэс стаў цяпер больш прадуманым, арыентаваным на кліентаў, расце партфоліа, я магу прапанаваць сэрвіс на ўзроўні буйных кампаній, але бяру меншую плату, бо працую дома і не плачу за офіс.

— Зараз даход твой большы, чым ранейшы?

— Так, я выйшла на ўзровень зарплаты ў першага працадаўцы і нашмат апярэдзіла ўзровень другой зарплаты, калі працавала непасрэдна ў сферы дызайну.

— Бізнэс дае табе адчуванне свабоды і самастойнасці?

— Я адчуваю сябе больш упэўненай, свабоднай і сёння поўнасцю рэалізую сябе ў творчым плане. Як толькі сыходзіш з ціхага і размеранага жыцця ў прадпрымальніцкую дзейнасць, якая кіпіць і бурліць і дзе пастаянна трэба рухацца і развівацца, то вяртацца назад наогул не хочацца. І нават не пужаюць будучыя дэкрэтныя водпускі, адсутнасць сацыяльных пакетаў і іншыя рэчы.

Ноу-хау

АКЦЫЯ «ЗЯЛЁНЫ ПАЛЕЦ»

У Клімавіцкай раённай дзяржаўнай гімназіі імя Мікалаева вучаць, як эканоміць электрычнасць і цяпло, ашчадна ставіцца да рэсурсаў.

Сёлетні капітальны рамонт у гімназіі дасць магчымасць установе адукацыі зэканоміць на энергіі і цяпле. Сам будынак — 1964 года, таму замянілі ўсе старыя вокны на сучасныя шклопакеты. Цяпер у пакоях цёпла і ўтульна. Пасля рамонту першае, што кідаецца ў вочы, — прыгожы фасад, пафарбаваны ў прыемны ружовы колер. Гімназісты жартуюць: «Гламурненька!» Але сэнс не толькі ў прывабным знешнім выглядзе: тут зроблена ўцяпленне сцен — а гэта таксама засцеражэ ад страт цеплавой энергіі. І, безумоўна, ва ўсёй школе заменены лямпы: цяпер яны скрозь энергазберагальныя.

Усё гэта дазволіць эканоміць сродкі, якія можна накіраваць на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, скажам, набыць новае абсталяванне для кабінетаў фізікі і хіміі, рэактывы і мензуркі.

Клімавіцкія гімназісты летась увайшлі ў склад дэлегацыі, якая ездзіла ў Германію для вывучэння вопыту эканоміі энергіі і выкарыстання альтэрнатыўных крыніц.

— Мы былі не толькі на прадпрыемствах, але і ў нямецкіх школах,

Актуальны плакат ад вучаніцы гімназіі.

каб даведацца, як зберагаць энергію, — расказаў Рустам Батыраў з 10 «А» класа. — Там вучні разумеюць усю важнасць гэтага, праводзяць свае акцыі.

Паводле нямецкага прыкладу, і ў Клімавіцкай гімназіі прайшла акцыя «Зялёны палец». Старшакласнікі пафарбавалі кісці рук у зялёны колер як сімвал узаемасувязі паміж чалавекам і прыродай і расказвалі ў малодшых класах аб неабходнасці ашчадна ставіцца да багацяў планеты, эканоміць рэсурсы і энергію.

— Эканоміць — гэта важна, я так лічу, — сказаў Рустам. — Гэта ж грошы! Энергія каштуе шмат, і трэба ёй даражыць.

Беларускім дзецям найбольш спадабаліся ў Германіі сонечныя батарэі, якія немцы ўсталёўваюць на дахах сваіх дамоў. Яны нават запомнілі, што ў гэтай краіне пятую частку энергіі здабываюць менавіта з альтэрнатыўных крыніц. Гімназісты мяркуюць, што такое будзе і ў нас, але, відаць, не вельмі хутка: сонечныя батарэі каштуюць дорага.

Рустам Батыраў лічыць, што не паліць дарма святло — гэта эканомія, даступная кожнаму.

— Затое мы можам сабе дазволіць энергазберагальныя лямпы, якія ёсць у гімназіі, — лічыць дзесяцікласніца Насця Юрчанка. — І ў нас ёсць традыцыя штотыднёвага дзяжурства, калі старшакласнікі ходзяць на перапынках па пакоях і правяраюць, ці не гараць дарма лямпы, ці зачынены вокны. Я лічу, што ўсё гэта патрэбна.

Ілона ІВАНОВА, **фота аўтара.**
г. Клімавічы.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 01 2013 г.

«Я НЕ ЦЯРПЛЮ ПОБАЧ З САБОЙ НЕПРАФЕСІЯНАЛАЎ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А «зорная хвароба» вам уласцівая?

— Я разумею, што ў мяне ёсць пэўны аўтарытэт у прафесіі. Разумею таксама, што кар'ера тэлевядучай, як і любая іншая, можа скончыцца ў любы момант. Няма праекта — няма цябе. Калі б я з вамі размаўляла, прапрацаваўшы год, і не мела б таго вопыту, які сёння ў мяне ёсць, то, можа, і сімптомы «зорнай хваробы» былі б. Але ўсё, што я маю, дасталося мне цаной стрэсаў і бяссонных начэй, таму няма ніякай «зорнай хваробы». Аднак непрафесіяналаў побач з сабой не цярплю. І калі што, то магу досыць рэзка паставіць чалавека на месца.

— А ў дачыненні да асабістага жыцця якую цану даводзіцца плаціць за поспех?

— Безумоўна, даводзіцца нечым ахвяраваць. Але гэта цана, якую паспяховы чалавек плаціць за магчымасць займацца любімай справай. Нават калі б гэта была іншая прафесія, то расклад быў бы такім жа.

— Усё ж такі, як лічыце, што павінна быць у аснове трывалых стасункаў паміж мужчынам і жанчынай?

— Трэба любіць розумам і сэрцам. І пашчасціла тым людзям, якія здольныя на гэта, бо такое спалучэнне — вялікая рэдкасць. Варта прыслухоўвацца да бабуль і дзядуляў, якія на вяселлях кажуць: «Галоўнае — каб было цярпенне». Слухайце старэйшае пакаленне. А яшчэ важна ўмець дараваць, тады ўсё будзе добра.

— Але сёння ўсё ж змяніліся погляды на ўзаемаадносіны мужчыны і жанчыны...

— Нічога не змянілася. І раўнапраўя ніякага няма. Не трэба падманваць сябе, проста будзьце жанчынай. Муж павінен быць на першым месцы, а жонка — на другім. Ні адна жанчына не будзе шчаслівай, пакуль не будзе мыць падлогу і гатаваць ежу. Ніякія заробкі не могуць гэтага замяніць. Я ведаю пра што кажу, бо сама паспяховая і сяброўкі мае такія ж. Добра, калі сустрэнецца на тваім шляху мужчына, які паставіць цябе на месца ці калі маці выхавала цябе правільна. Бо шчаслівай можна быць тады, калі ідзеш за мужам, даверыўшыся яму.

— Ці ўдаецца пры вашай прафесіі адчуць набліжэнне святаў і сустрэць іх, скажам, у сямейным коле?

— Я спрабую так зрабіць, але не хапае часу. Часам нават злуюся з-за гэтага. Калі мая сям'я збіраецца разам, то мы размаўляем, зараджаецца ўнутраная батарэйка — а я гэтага пазбаўляю сябе. Так складваецца, што я ўсюды і ўсім патрэбна, прычым, і не ўмею адмовіць.

— Вашы сябры — пераважна калегі?

— Па-рознаму. Мая лепшая сяброўка, напрыклад, гэта чалавек, якога я ведаю са школы. У нас розныя стылі жыцця, і многія рэчы мы ўспрымаем па-рознаму. Але калі мы тэлефануем адна адной, то можам прагаварыць з паўгадзіны. У мяне многа сяброў сярод тых, з кім мы разам вучыліся ва ўніверсітэце. У нас агульныя інтарэсы, і нам ёсць што прыгадаць. Без сяброў я не ўяўляю свайго жыцця.

— Як ацэньваеце 2012 год і чаго чакаеце ад новага года?

— Магу сказаць з упэўненасцю, што ні аб чым не шкадую, бо гэта быў год, напоўнены яркімі падзеямі. А пажадаць сабе хацелася б стрыманасці і спакою. Каб не было імкнення ахапіць усё. Усім, каго я люблю, хачу пажадаць здароўя. Жывіце для іншых, і тады ў жыцці будзе сэнс...

Алена ДРАПКО.
Фота з уласнага архіва Люцыі ЛУШЧЫК.

Медыяпрастора

ЖУРНАЛІСТЫКА ПА-ШВЕДСКУ, альбо Што нагадвае пра Томі Сала

Швецыя — краіна кантрастаў. У тым ліку і ў журналістыцы. У гэтым пераканаліся дзясяткі студэнтаў Інстытута журналістыкі БДУ, што з'ездзілі пазнаёміцца са шведскімі СМІ. Кантрастаў знайшлося шмат. Куды б ні глянуў — вось табе і кантраст. Пра іх і пойдзе аповед.

ЖУРНАЛІСТ — РАСКАЗЧЫК «ГІСТОРЫЙ»

«Uppsala Nya Tidning» — рэгіянальная газета ў горадзе Упсала, што знаходзіцца за 70 кіламетраў ад Стакгольма. Жыхароў у горадзе — каля 200 тысяч. Некаторыя ездзяць на працу ў сталіцу. Тыраж газеты — 40 тысяч асобнікаў. Гэта

Працаваць журналістам тут вельмі прэстыжна, бо журналіст лічыцца галоўным прадстаўніком народа ва ўладзе. Адказ на афіцыйны запыт дзяржустанова павінна даць у 24-гадзінны тэрмін.

пры тым, што адзін асобнік чытаюць звычайна некалькі чалавек. Увогуле, шведскія журналісты рэдка кажуць пра тыраж газеты, больш актыўна ўжываецца слова «аўдыторыя». Яна, праўда, вельмі залежыць ад тыражу. Аўдыторыя аднаго асобніка ў сярэднім 2,5 чалавека (статыстыка — жахлівая рэч — «распілавала» беднага шведскага чытача напалам). Якая аўдыторыя ў газеты «UNT» — лічыце самі.

Пры гэтым у Швецыі, як і ў Беларусі, спецыялісты занепакоены станам друкаваных СМІ. Тыражы газет падаюць, аўдыторыя сыходзіць у інтэрнэт. Шведы, як і прадстаўнікі амаль кожнага народа, лічаць сябе самай чытаючай нацыяй. Напэўна, не хлусяць: раніцай у стакгольмскім метро адчуваеш сябе, як у кватэры падчас рамонту — наўкол газеты! Сусветна вядомая бясплатная газета «Metro», дзелавая «Dagens Nyheter» (перакладаецца як «Апошнія навіны»), сур'ёзная «Svenska Dagbladet» («Шведская штодзённая»), таблоід «Aftonbladet» («Вячэрняя штодзённая») — здаецца, што газет вакол цябе больш, чым людзей. Здзіўляе, з якім імпэтам прэсу чытаюць моладзь і дзеці. Становіцца цікава, што было дагэтуль, калі сённяшні стан друкаванай журналістыкі ў Швецыі лічыцца крытычным.

Сама рэдакцыя «Uppsala Nya Tidning», якую ў Беларусі ахрысцілі б «раёнкай», прыемна здзіўляе сваёй прыгажосцю і тэхналагічным абсталяваннем. Уся рэдакцыя працуе ў адным вялікім памяшканні, «ньюсруме». У цэнтры — дошка з планам на новы нумар. Працоўныя месцы аддзяляюцца адно ад аднаго толькі праходамі. Аддзел рэдакцыі — звычайна купка журналістаў, якія сядзяць побач. Аддзел культуры можна пазнаць, напрыклад, па літаральна заваленых новымі кнігамі працоўных сталах. Спартыўны аддзел — па настольным

Ганна Оберг

хакеі на цэнтральным стале (адчуйце сябе, як дома), пры поглядзе на які адразу прыгадваецца такое далёкае і блізкае імя — Томі Сала... За сталом няма журналіста, а толькі недаедзены пончык і астылая гарбата... Прывітанне аддзелу навін!

«UNT» — газета штодзённая. У ёй няма рубрык. Усе рубрыкі выходзяць у выглядзе дадаткаў: «Культура», «Спорт» і гэтак далей. У самой газеце змяшчаюцца толькі навіны, рэпартажы і, як іх называюць шведы, «гісторыі» — нешта падобнае да нашых артыкулаў і карэспандэнцый. Аўтары тэкстаў не клапоцяцца пра вобразнасць

Зменяцца і патрабаванні для супрацоўнікаў: трэба ўмець запісаць і змантаваць аўдыя- і відэасюжэт, намаляваць інфаграфіку, самому звярстаць матэрыял.

і высокі стыль. Галоўнае — факты. Разважаць — справа чытача.

У адным з куткоў ньюсрума размяшчаюцца дзве асаблівыя рэдакцыі. Рэдакцыя сайта газеты і... тэлебачання. Адзін з аддзелаў «UNT» — гэта яе тэлеканал. Тут працуе некалькі журналістаў, якія займаюцца выключна падрыхтоўкай навінавых сюжэтаў ва Упсале. Атрымліваецца тэлеканал, падобны па сваім фармаце да знакамітага «Euronews»: эфір складаецца з сюжэтаў, якія ідуць адзін за адным па коле. Адзін цыкл цягнецца каля 20 хвілін. Потым — невялікі перапынак на рэкламу, прагноз надвор'я, і ўсё паўтараецца.

У газеце працуюць толькі вопытныя, дасведчаныя журналісты. Вельмі рэдка ў рэдакцыі з'яўляецца нехта новы. А калі і з'яўляецца, то ў «навічка» звычайна ўжо ёсць вопыт работы ў іншых газетах. Такую кадравую палітыку тлумачаць эканамічным крызісам. У рэдакцыях імкнуцца сэканоміць на ўсім. Студэнту трапіць у газету вельмі складана. Зараз працаваць бяруць людзей, дасведчаных у пэўнай сферы. Напрыклад, у аддзел культуры прыходзяць культуролагі, пісьменнікі. Пры гэтым амаль кожны з іх асобна атрымліваў яшчэ і адукацыю журналіста. Гэта значыць, што ва «Uppsala Nya Tidning» працуюць у асноўным людзі з дзвюма вышэйшымі адукацыямі.

Працаваць журналістам тут вельмі прэстыжна, бо журналіст лічыцца галоўным прадстаўніком народа ва ўладзе. Любыя дзверы перад карэспандэнтам адчыняюцца пасля прад'яўлення пасведчання, а адказ на афіцыйны запыт дзяржустанова павінна даць у 24-гадзінны тэрмін. Дзелавое ліставанне чыноўнікаў не з'яўляецца сакрэтам. Кожны грамадзянін можа прыйсці хоць да міністра і запатрабаваць любы ліст, які яго цікавіць. Шведы вельмі ганарацца сваім законам аб свабодзе прэсы, які яны прынялі першымі ў свеце ў 1766 годзе. Пры гэтым на журналіста не ўскладаюцца нейкія непасільныя абавязкі. Ён — расказчык «гісторый». Асэнсоўваць інфармацыю і інтэрпрэтаваць яе павінен толькі чытач.

АЎДЫТОРЫЯ ГАЗЕТЫ — КАРЫСТАЛЬНІКІ ІНТЭРНЭТУ

У нас кажуць: «Кожнае выданне, якое сябе паважае, павінна мець уласны сайт». У Швецыі такое пытанне даўно не актуальнае. Усе газеты працуюць у сеціве яшчэ з сярэдзіны 1990-х. Узровень камп'ютарызацыі насельніцтва набліжаецца да 100%, і для многіх чытаць любімую газету ў сеціве зручней, чым набываць папяровую версію.

Здзіўляе, з якім імпэтам прэсу чытаюць моладзь і дзеці. Становіцца цікава, што было дагэтуль, калі сённяшні стан друкаванай журналістыкі ў Швецыі лічыцца крытычным.

Газета «Dagens Nyheter» правяла цэлы комплекс даследаванняў сваёй аўдыторыі на прадмет зацікаўленасці інтэрнэт-версіяй і навінамі ў інтэрнэце. У рэшце рэшт стварыла асобны ін-

Так выглядае стол у аддзеле культуры

тэрнэт-аддзел. Ён займаўся падрыхтоўкай і напісаннем уласных матэрыялаў, якія адрозніваліся ад тэкстаў, надрукаваных у газеце. Бо над тэкстамі на адну і тую ж тэму працавалі два розныя журналісты. Задача вэб-журналіста — максімальна хутка расказаць пра навіну, зрабіць фотаздымкі і відэасюжэт. Журналіст газеты меў значна больш часу на падрыхтоўку, а таму яго тэкст быў скіраваны на аналітыку. Чытачы «DN» раніцай набывалі папяровы асобнік, каб прачытаць больш падрабязнае апісанне тых падзей, што здарыліся напярэдадні. А ў любы зручны для іх час маглі знаёміцца і з актуальнымі матэрыяламі на сайце. Фактычна, інтэрнэт-старонка газеты станавілася асобным СМІ.

Шэф-рэдактар сайта «DN.se» Ганна Оберг кажа, што зараз плануецца вярнуць усё назад. Асобная рэдакцыя перастане існаваць, вэб-журналісты будуць працаваць у тым жа ньюсруме, што і газетчыкі. Зменяцца і патрабаванні для ўсіх супрацоўнікаў: пісаць тэксты і рабіць фотаздымкі цяпер недастаткова. Трэба ўмець яшчэ запісаць і змантаваць аўдыя- і відэасюжэт, намаляваць інфаграфіку, самому звярстаць свой матэрыял. Універсальны журналіст у дзеянні. Робяць гэта таму, што сайт сам па сабе грошай не прыносіць, ён мёртвым грузам «вісіць» на рэдакцыі. Перад супрацоўнікамі стаіць задача навучыцца атрымліваць ад вэб-версіі прыбытак.

Усё тое ж даследаванне аўдыторыі паказала, што чытачы не гатовы плаціць за інфармацыю ў інтэрнэце. Калі патрабаваць з іх грошы — яны ідуць шукаць навіны ў іншае месца. Сёння сайт «DN.se» працуе ў паўплатным рэжыме. Гэта значыць, што доступ да абсалютна ўсіх тэкстаў на сайце маюць толькі падпісчыкі. Усе астатнія могуць чытаць толькі бясплатныя матэрыялы, якіх не так шмат. Магчыма, рэдакцыя спыніцца на варыянце, калі кожны чытач будзе сам вызначаць, як яму больш зручна атрымліваць інфармацыю. Усе матэрыялы стануць платнымі, але поўная падпіска на вэб-версію будзе каштаваць значна менш, чым на друкаваную. Магчыма, знойдуць іншае выйсце...

Спадарыня Оберг засяродзіла ўвагу на новых платформах, праз якія шведы спажываюць навіны: планшэтныя камп'ютары і смартфоны. Ільвіная доля аўдыторыі газеты — карыстальнікі мабільнага інтэрнэту. Для іх рэдакцыя стварыла фірменныя праграмы. Увогуле, многія ў Швецыі лічаць, што будучыня газет — у новых носьбітах і платформах. Але ўсе ўпэўнена кажуць: «Газета будзе жыць!»

Ньюсрум

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
(Працяг будзе.)

МАЛАДЫ ЎЗРОСТ — НЕ ПЕРАШКОДА, КАЛІ ВЫ — САПРАЎДНАЯ ПАРА

Героі гэтага артыкула — не «зоркі», не мільянеры і не прадстаўнікі ўлады. Проста сямейная пара, якая ўтварылася, калі абое сужэнцы былі студэнтамі. З сям'ёй Пятроўскіх мы сустрэліся, каб даведацца, як жывецца сям'і з двума дзецьмі ў студэнцкім інтэрнаце, ці змяняюцца людзі, калі бяруць шлюб, і яшчэ пра шмат іншых цікавых рэчаў...

Выгнала, а пасля... выйшла замуж

— Мы зусім нядаўна «выраслі» са студэнцкай сям'і, — распавядаюць Таццяна і Аляксей. У інтэрнаце Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Пятроўскія жывуць чатыры гады, сям'і ж — пяць гадоў. Калі яна ўтварылася, абое былі яшчэ занятыя вучобай: Таццяна — у БНТУ, дзе цяпер выкладае, Аляксей скончыў Інстытут інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Па словах Таццяны, атрымаць права жыць у інтэрнаце сям'і досыць складана. Студэнты бяруць шлюб і на трэцім, і на чацвёртым курсе, таму прэтэндэнтаў на інтэрнацкае жыллё шмат:

— З групы, дзе выкладаю, ужо пяцёра паспелі абзавесціся сем'ямі. Прычым чацвёра з гэтай колькасці — хлопцы. Многія пасля заканчэння вучобы і высялення рэзка адчуваюць розніцу: жывучы тут, штомесяц плацяць 140 тысяч, а калі даводзіцца здымаць кватэру, сума павялічваецца да неймавердных для ўчарашняга студэнта лічбаў.

Гісторыя знаёмства Тані і Аляксея нібыта падгледжана ў кіно. Калі ў Таццяны пытаюцца, як яна пазнаёмілася з мужам, тая адказвае, што выгнала яго з аўдыторыі... Таццяна тады вучылася ў магістратуры і толькі пачала выкладаць.

— Аляксей спазніўся на заняткі, якія я вяла, прыйшоў пасля трэніроўкі, адчыніў дзверы ледзь не нагамі і, прамовіўшы: «Здрасьце», сеў на сваё месца. Я думаю: божа мой, што гэта? Ніякага выхавання. І я яго выгнала за дзверы. Лёшы пасля нават давялося ісці пісаць дакладную, каб дазволілі наведваць мае пары.

Праз нейкі час Таццяна апынулася ў бальніцы з-за таго, што трапіла ў аварыю. Аднойчы наведаць яе прыйшоў той самы «нявыхаваны» студэнт, які некалі быў ёй жа выгнаны з аўдыторыі.

— Як Лёша расказваў, «нешта ў яго «клеманула», і таму вырашыў, што трэба наведацца ў бальніцу да Коўш (дзявочае прозвішча Таццяны).

Пасля быў сумесны паход ад Будслаўскай парафіі ва ўкраінскі горад Бердзічаў. Ішлі пешшу некалькі дзён. Падарожнічалі і далей па Украіне: Кіеў, Карпаты, Крым. У выніку аднойчы Таццяна і Аляксей зразумелі, што маюць вельмі шмат агульнага. Праз год ажаніліся, а дачка Насця нарадзілася 23 лютага, акурат на дзень народзінаў Аляксея. Праз колькі часу з'явіўся сын Цімур, якому цяпер год і дзесяць месяцаў.

Гісторыя знаёмства Тані і Аляксея нібыта падгледжана ў кіно. Калі ў Таццяны пытаюцца, як яна пазнаёмілася з мужам, тая адказвае, што выгнала яго з аўдыторыі...

Аляксей гісторыю знаёмства крыху «карэктуе»:

— У прынцыпе, мая будучая жонка ўбачыла мяне ўпершыню зусім не падчас таго выпадку, калі выгнала з аўдыторыі. Але такая сітуацыя сапраўды была. Я тады ўжо вучыўся на апошнім курсе, лічыў, што ўсё можна. Да таго ж быў спартсменам, выступаў на спаборніцтвах, таму многае «сыходзіла з рук».

Сямейнае жыццё-быццё

На сям'ю Пятроўскіх прыходзіцца адзін блок у інтэрнаце Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Два пакоі з уласным санвузлом. Кухня агульная. У інтэрнаце ёсць магчымасць памыць бялізну, але адной з першых рэчаў, якія сям'я набыла для сябе, была пральная машына. Так усё ж зручней.

Сем'і, якія з'язджаюць з інтэрната на кватэру, па словах Таццяны, як ні дзіўна, часта сумуюць па былым жыцці. Умовы тут, можа, і не такія камфортныя, як ва ўласным жыллі, затое стасункаў — колькі заўгодна. Мамы, калі збіраюцца ў дзіцячым пакоі, абмяркуюць усё: і чым дзяцей лячыць, і чым карміць, і што новага адбылося. Ды і дзецям пасля лягчэй адаптавацца ў дзіцячым садку.

Звычайны дзень сям'і Пятроўскіх пачынаецца ў 6.30 раніцы, калі прачынаецца тата. У 6.40 час падымацца маме і дачцэ Насці. У 7.10 тата вязе Насцю ў дзіцячы садок, а сам едзе на працу. Пасля прыходзіць бабуля і застаецца з Цімурам. А Таццяна ў 8 гадзін ідзе на працу, дзе знаходзіцца прыкладна да абеду. Аляксей працуе да 17.00. Тая частка дня, што застаецца ў сям'і, ідзе на абмеркаванне сямейных спраў, трэніроўкі (свае і дзяцей), вячэру. Да гадзін 12 ночы сям'я кладзецца спаць.

Гатаваць Таццяне даводзіцца часцей самой, але часам дапамагае і яе маці, якая даглядае Цімура. Бацькі Тані пераехалі ў сталіцу, каб дапамагаць у выхаванні малых. Таццяна выйшла на працу, выкладае ва ўніверсітэце. Аляксей разменкаваўся на МАЗ.

— Калі нарадзіўся Ціма, мы вырашылі, што будзе лепш, калі ў дэкрэце пасядзіць бабуля. Мне патрэбна развівацца далей: вось нядаўна атрымала другую вышэйшую адукацыю, педагагічную.

Можа падацца, нібыта наша сям'я дваццаць чатыры гадзіны ў суткі неверагодна актыўная і пазітыўная. Гэта не так. Часам я прыходжу з работы настолькі стомлены, што замест «культурнага адпачынку» проста ляжу на канапе.

Таня і Аляксей не кідаюць баскетбол, якім абое захапляліся яшчэ да таго, як ажаніліся — па пятніцах ходзяць у спартыўную залу разам. Малы Ціма, калі бачыць мяч, — забываецца на ўсе цацкі. Гэта, відаць, генетычнае. Дачка Насця таксама ўжо цікавіцца спортам: тры дні на тыдзень бацькі возяць яе на трэніроўку па мастацкай гімнастыцы.

Цяпер пра грошы. Значная частка бюджэту сям'і ідзе на абслугоўванне аўтамабіля: паліва, запчасткі, іншыя патрэбы. Наступны пункт выдаткаў — ежа. У краме за адзін «паход» Пятроўскія звычайна пакідаюць як мінімум дзвесце тысяч рублёў пры тым, што Цімур цяпер паступова прывучаецца да «дарослай» ежы. Яшчэ адна значная графа выдаткаў — гурткі, секцыі і садок для дзяцей. Адкладваць нічога не атрымліваецца. Нават калі і ёсць лішнія грошы, абавязкова патрэбна камусьці купіць падарунак альбо запрасіць у госці. Рэчы для дзяцей часта атрымліваюцца «ў спадчыну». Нешта купляюць ці шыюць самі. Робяць падарункі дзецям і сябры...

«Дама павінна хадзіць у сукенках і на абцасах», — неяк заявіла Насця, калі мама збірала яе ў садок і хацела апрануць малой штонікі. Яшчэ Насця любіць сумачкі і сонечныя акуляры.

Прывучаць дзяцей да самастойнасці...

— Куды мы, туды і дзеці, — кажуць Таня і Аляксей.

Лыжныя прагулкі, паход, падарожжа на байдарцы, турзлёт — малыя часта ездзяць з бацькамі. Старэйшая Насця першы раз аказалася ў баскетбольнай зале, калі мела два тыдні ад нараджэння. Таццяна і Аляксей намагаліся не забывацца на свае захапленні толькі таму, што дзіця нарадзілася:

— Не ведаю, чаму так атрымалася, але нашы дзеці цудоўна адчуваюць сябе сярод дарослых, сяброў, таму браць малых паўсюдна з сабой зусім не праблема, — кажа Аляксей. — Зразумела, з таго, што мы расказалі пра сябе, можа падацца, нібыта наша сям'я дваццаць чатыры гадзіны ў суткі неверагодна актыўная і пазітыўная. Гэта не так. Часам я прыходжу з работы настолькі стомлены, што замест «культурнага адпачынку» проста ляжу на канапе. А ў выхадныя не хачу ехаць на прыроду. Але час на свае інтарэсы ўсё роўна знайсці можна, нават калі вельмі стамляешся. Што дакладна прыходзіць да чалавека з сямейным жыццём — гэта пэўная ўмеранасць у забавах і весялосці.

Летам сям'я ездзіць на дачны ўчастак за горадам: дома там пакуль няма, але вакол цудоўная прырода і сад.

— Часам узнікае думка, што часу на дзяцей не хапае, — кажа Аляксей. — З іншага боку, для таго, каб пагаварыць і пагуляць з дзецьмі, дастаткова ўсяго некалькі гадзін. Далей яны хочуць займацца сваімі справамі. Калі ўмоўна падзяліць суткі на тры часткі, то восем гадзін ты спіш, восем — працуеш, і восем застаецца на ўсё астатняе, у тым ліку і на дзяцей. Прынамсі, нашым дзецям столькі часу ад нас не патрэбна. Мы ім проста надакучым. А так ты цэлы дзень чакаеш, калі пабачышся з малымі, і яны таксама чакаюць гэтага з нецярплівасцю. Думаю, дзяцей трэба прывучаць да самастойнасці.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.
Фота Надзеі БУЖАН.

— Што казалі равеснікі пра ваша рашэнне стварыць сям'ю?

— Ажаніліся мы самымі першымі з усёй сяброўскай кампаніі. Пасля вяселля ўсе пыталіся: ну як? А ў кожнага з нас усё было па-ранейшаму: дзве рукі, дзве нагі, тыя ж думкі ў галаве. Нейкага рэзкага пераходу не адчувалася.

Спачатку сябры жартавалі: «Навошта іх запрашаць некуды, гэтых «жанацікаў», усё роўна ж адмовяцца». Але стэрэатып з часам удалося перамагчы.

— Ці перашкаджаюць дзеці маладым бацькам самасцвярджацца?

— У нашым выпадку — дзеці растуць, і мы расцём, толькі ў іншым сэнсе: у прафесійным, у бацькоўскім. Бацькам, якія сумяшчаюць і працу, і вучобу, і сям'ю, безумоўна, нялёгка. Але з іншага боку, мама, якая на цэлыя тры гады пайшла ў дэкрэт, не маючы пры гэтым неабходнасці турбавацца ні пра што, акрамя дзіцяці, рызыкуе засяродзіцца толькі на гэтай сваёй місіі.

— Галоўная складанасць у студэнцкай сям'і — часты недахоп грошай?

— Калі ёсць жаданне, грошы можна зарабіць заўжды. Калі ты збіраешся жыць з чалавекам, стварыць з ім сям'ю, то грашовыя праблемы павінны знаходзіцца ў разрадзе «вырашальных». Некаторыя студэнты, што ствараюць сям'ю падчас вучобы, пасля разводзяцца, бо з атрыманнем дыплома знікаюць агульныя сябры і агульныя мэты. Але ўсё ж не так важна, у які час людзі стварылі сям'ю. Малады ўзрост для гэтага — не перашкода, калі вы — сапраўдная пара і знайшлі адно аднаго.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
10 01 2013 г.

На конкурс «Новы погляд»

НАГАДАЕМ, што гэты конкурс — не для пасрэдных аўтараў, здольных хіба што на прымітыўнае інтэрв'ю з пытаннямі накшталт «Ну што ў вас новенькага?». Ён — для тых, хто хоча палюбіць журналістыку ўсур'ёз і надоўга: для неабыякавых, няўрымслівых, энергічных і крэатыўных. Для патэнцыяльных студэнтаў факультэтаў журналістыкі і будучых аўтараў «Чырвонкі»... Ад удзельнікаў конкурсу пад назвай «Новы погляд» мы чакаем не банальныя тэксты, а артыкулы з прэтэнзіяй на... На геніяльнасць. На адкрыцці. На арыгінальнасць... Не будзем працягваць, паставім шматкроп'е. Далей — справа за вамі!

Траіх пераможцаў конкурсу, які будзе доўжыцца да 1 мая 2013 г., чакаюць прызы. Лепшы атрымае ад рэдакцыі накіраванне для паступлення на факультэт журналістыкі ВНУ. Дасылайце свае «пробы пяра» на адрас «Звязды» (у тым ліку і электронны) з абавязковай пометкай: на конкурс «Чырвонка». Новы погляд». Памер артыкула — у межах разумнага.

«КАЛЯДНАЯ» КАЗКА

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Удзельнікі дабрачыннага марафону «Калядная казка», ініцыятарам якога выступіла Мінская гарадская арганізацыя БРСМ, павіншавалі дзяцей з апякунскіх сем'яў Савецкага раёна сталіцы з навагоднімі святамі. Ранішнік адбыўся днямі ў караоке-клубе «Europa» ў рамках рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

Валанцёры дабрачыннага руху «Добрае сэрца» арганізавалі для малых сапраўднае свята: дзяцей чакалі салодкі стол, сустрэча з Дзедам Марозам і Снягуркай. Да пачатку навагодняй сустрэчы супрацоўнікі гулялі з маленькімі гасцямі ў більярд. Потым былі конкурсы і караоке са Снягуркай. Салодкія калядныя падарункі хлопчыкам і дзяўчатам уручылі навагоднія героі разам са спецыяльнымі гасцямі свята — старшынёй адміністрацыі Савецкага раёна Генадзем Пасевіным і сакратаром Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання БРСМ, дэпутатам Мінскага гарадскога Савета Юрыем Чачукевічам.

Дабрачынны марафон «Калядная казка» Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ стартаваў 15 снежня і будзе доўжыцца да 15 студзеня. У рамках акцыі валанцёрскія атрады «Добрага сэрца» наведваюць з падарункамі сацыяльна-педагагічныя цэнтры. Актывісты ўсіх тэрытарыяльных арганізацый Саюза моладзі сталіцы сабралі для іх выхаванцаў канцылярскія тавары, кнігі і цацкі.

Алена ДРАПКО.

СПЫНІСЯ І... АЗІРНІСЯ

Напэўна, кожны з нас у інтэрнэце, па тэлебачанні, у часопісе (газеце) сустракаў так званыя «лозунгі»: «А што ты паспеў зрабіць за свае гады?», «Трэба паспрабаваць усё ў гэтым жыцці!», або такі: «Хто ты ў свае 15 (да прыкладу) гадоў?». Вядома, добра да нечага імкнуцца і нешта паспець зрабіць або стварыць за кароткі час. І ў якасці доказу мы можам прыгадаць мноства вялікіх людзей, якія праславіліся ўжо ў нашым узросце, а то і раней, дамагліся грандыёзных поспехаў, ці проста знаёмага, які паспявае і конкурс выйграць, і гурток наведаць, і верш напісаць. Пры гэтым застаецца цікавым, дапытлівым і таварыскім чалавекам. Таму з'яўляецца цалкам заканамернае пытанне: «А як ён (яна) паспявае ўсё гэта рабіць?» А следам мы прыдумляем адказ: «Галоўнае — гэта не спыняцца ні на хвіліну, і тады, магчыма, і я дасягну такіх жа вышынь».

Але ў пагоні за часам мы ўпускаем іншы раз нешта большае... Што для нас спешка? На мой погляд, гэта спосаб скараціць усё магчымае (часам, праўда, незразумела, навошта). Кнігі (звычайна аб'ёмам ад 100 і больш старонак) — замяняем на кароткі змест ці рэцэнзію. Скарачаем свой сон, эмоцыі, нават словы і выказванні, з дапамогай такога ўпадабанага ўсім слова «карацей». Але куды мы так спяшаемся? Каб абагнаць кагосьці ў вучобе і дасягненнях? Ці проста паддаёмся агульнай «паніцы»? Але, здаецца, мы забываемся, што ўсе тыя людзі, якія вельмі рана чагосьці дамагліся, прыйшлі да сваіх адкрыццяў і вышынь не праз спешку, а праз стараннасць, праз спакойныя і абдуманыя рашэнні, пазбаўляючыся ў сваім жыцці толькі ад таго, што ім перашкаджала і ахвяруючы чымсьці адным на карысць больш значнага. Мы ж жадаем атрымаць усё і адразу (пажадана, у адзін момант), не ўмеем чымсьці ахвяраваць. Іншы раз хвілінныя неабдуманыя жаданні бяруць верх над намі. Часам мне здаецца, што многія развучыліся выбіраць сапраўды галоўнае: прафесію, інтарэсы. Тое ж тычыцца і выбару сяброў.

Але пакуль мы самі не зразумеем, што ўсё самае глыбокае, каштоўнае і цікавае патрабуе часу, так і застанемся «паглынальнікамі фастфуду», які так актыўна зараз прапагандуецца.

Час — гэта наша жыццё, якое павінна быць не чыёйсьці ўласнасцю, а менавіта нашай, і толькі нашай. А гэта значыць, што не трэба паўтараць памылкі іншых людзей, спрабаваць станавіцца да кагосьці падобным і рабіць тое, што зусім не трэба, толькі дзеля чужога адабрэння. Бо ты, я, ён, яна — гэта ўсё вялікія галактыкі. Не імкніцеся быць непаўторнымі праз беганіну і хаос, а імкніцеся быць сабой. У поўным сэнсе слова...

Алена БІРУКОВА, 16 гадоў.
Ліцэй БДУ.

На слыху

СКАНДАЛЬНЫЯ ДНІ БЕЛАРУСКАГА СПОРТУ

У другім матчы выязной сесіі хакейны **клуб «Дынама-Мінск» прайграў яраслаўскаму «Лакаматыву».** Крыўднае паражэнне, калі адзначыць, што ўжо ў самым пачатку першага перыяду дынамаўцы прапусцілі дзве шайбы, ды яшчэ і атрымалі дзесяць хвілін штрафу. І толькі ў сярэдзіне дваццаціхвілінкі Дзмітрый Мялешка «размачыў» лік. Але гэта была першая і адзіная рэзультатыўная атака «зубраў». У другой палове матча яраслаўскія хакеісты яшчэ двойчы паражалі вароты «бела-сініх».

Аляксандр Гутар.

Галоўны трэнер «Дынама» Аляксандр Андрыеўскі крытычна выказаўся наконт падрыхтаванасці да важнага матча сваіх падапечных: «Першы перыяд быў вырашальным. Але хлопцы выйшлі непадрыхтаванымі да ўпартай барацьбы на самым старце сустрэчы. Не ведаю, у чым прычына, бо напярэдадні, на сходзе, шмат размаўлялі пра важнасць матча і патэнцыяльных ачкоў. Спадзяюся, што да матча ў Новасібірску каманда паставіцца больш сур'ёзна».

Зараз «зубры» займаюць пятае месца ў сваім дывізіёне. Ужо сёння мінчане правядуць матч з «Сібір'ю».

А вось у некаторых відах спорту зараз бушуюць сур'ёзныя жарсці. Ньюсмэйкер апошніх тыдняў, **галкіпер БАТЭ Аляксандр ГУТАР усё яшчэ чакае рашэнне па сваёй справе,** якое будзе прынята на пасяджэнні федэрацыі ў наступны аўторак. Трэнер варатароў барысаўчан упэўнены, што атрымаць «вольную» на прымальных умовах футбалісту будзе вельмі цяжка. «Шчыра кажучы, калі БАТЭ захоча, Саша ўвогуле нікуды не перабярэцца», — рэзюмаваў Аляксандр Федаровіч.

Яшчэ адзін скандал наспявае ў цяжкай атлетыцы. **Трэнер мужчынскай зборнай Аляксандр Ганчароў, які займаў гэты пост дванаццаць гадоў, адпраўлены ў адстаўку.** Усе заслугі трэнера, напэўна, былі перакрэслены з-за няўдалага выступлення нашых цяжкаатлетаў на Алімпійскіх гульнях. Нагадаем, у Лондане мужчынская зборная, якая лічыцца адной з мацнейшых у свеце, засталася без медалёў. Новым трэнерам каманды стане Валянцін Кароткін, які дагэтуль працаваў з дзяўчатамі.

Такім рашэннем застаўся незадаволены адзін з лідараў мужчынскай зборнай Андрэй Арамнаў. «Незразумела, чаму нікога не цікавяць меркаванні спартсменаў. Змянілі трэнера, і толкам не давялі да ведама. Калі працягнецца гэтая чахарда, я кладу заяву на стол пра сыход. Завяжу з цяжкай атлетыкай, пакуль урэшце не знойдуць вартага трэнера», — заявіў алімпійскі чэмпіён Пекіна.

Ці стрымае абяцанне Андрэй Арамнаў, стане вядома дома зусім хутка. Неўзабаве ў Стайках пачнуцца зборы нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы, дзе спартсменам прадставяць новага трэнера.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Майстар–клас!

ЯК ЗНАЙСЦІ ТЭМУ ДЛЯ ГАЗЕТЫ?
або Муза і Натхненне, вяртайцеся!

КАЛІ вы ўжо які дзень у баксёрскіх пальчатках змагаецеся з творчым крызісам, калі Муза старанна робіць выгляд, што забылася, дзе вы жывяце, а Натхненне павесіла на дзвярах шыльду: «Не турбаваць», — тады наступныя парады сапраўды для вас!

Для таго каб напісаць эксклюзіўны матэрыял, зусім не абавязкова адпраўляцца ў Антарктыду, у «гарачыя кропкі» свету або ў космас. Дастаткова проста прыслухацца да наступных парад. Бо, як казаў Карл Краўс: «Не мець ні адной думкі і здолець яе выказаць — вось як становішся журналістам».

Такім чынам, з чаго пачынаецца будучы «шэдэўр»? Як аказваецца, выбар тэмы — самае цяжкае, таму менавіта з гэтага і пачнём. Некалькі спосабаў для яе вызначэння.

1) «Уважлівы» спосаб:

Калі вызначыліся, што журналістыка — гэта не толькі ваша будучыня, а яшчэ і проста ВАША, то трэба быць у два разы больш уважлівым, у тры разы больш цікаўным і ў чатыры разы менш сціплым у творчым плане. Варта максімальна актывізаваць слых і зрок. Слухайце ўсё і ўсіх: размовы ў аўтобусе, фразы суседа ў кіно ці рэплікі аднакласнікаў на пары фізікі (людзі часам гавораць нешта карыснае). Уважліва глядзіце вакол сябе: у школьны журнал, на цэны ў буфеце, на афішы ў метро.

2) «Кніжны» спосаб:

Адгарніце кнігу на любой старонцы і чытайце (напрыклад, старонку 83, восьмы абзац). А раптам нешта цікавае? Некалькі незвычайных фактаў у дадатак і — вуаля, артыкул гатовы!

3) «Нечаканы» спосаб:



Падыдзіце да мамы ці да таго ж настаўніка фізікі і проста задайце пытанне: «Пра што мне напісаць?»

4) «Унутраны» спосаб:

Сядайце за камп'ютар і пачынайце пісаць тое, што ідзе знутры, адключаючы мозг. Пішыце пра тое, што набалела, накіпела, «саржавела»... Яшчэ некалькі штрыхоў плюс майстар-клас ад рэдактараў газеты — і артыкул гатовы!

5) «Інтэрнэтны» спосаб:

Увядзіце абсалютна любую камбінацыю літар на клавіятуры ў Google, пажадана з заплюшчанымі вачыма. Вы і не ўяўляеце, колькі варыянтаў адразу з'явіцца! Спасылкі на цікавыя сайты, на старонкі людзей у сацыяльных сетках, на блогі, дзе рэдка абмяркоўваюць сумныя тэмы. Увогуле, тут ужо ўсё ў вашых руках...

6) «Заказны» спосаб:

У рэшце рэшт, можна папрасіць рэдакцыю даць вам тэму для напісання артыкула. Але потым не крыўдуйце, калі прыйдзецца наведаць кірмаш сельгаспрадукцыі, ды яшчэ і падчас канцэрта вашага любімага рок-гурта.

❍ ❍ ❍

Спадзяюся, гэтыя парады дапамогуць вам знайсці найцікавейшую тэму ўсіх часоў і народаў. Але самым галоўным усё роўна застаецца спосаб № 7 пад назвай «Абавязковы», або «Не дазваляй душы ленавацца»! Праганяйце гэтую непрыемную госцю па імені Лянота і запрашайце зграбную Музу, якая яшчэ памятае ваш адрас.

Ульяна БУДЗІК.

ТЭМЫ — ВАКОЛ НАС

Матэрыял, разумеем, напісаны з доляй гумару. Таму і на заўвагі рэдакцыі трэба рэагаваць падобным жа чынам. Адрасаваны яны не аднаму канкрэтнаму чалавеку, а ўсім пачаткоўцам, якія пішуць у «ЧЗ». Аўтар цалкам слушна сфармулявала галоўную праблему, з якой сутыкаецца большасць хлопцаў і дзяўчат, якія спрабуюць свае сілы ў журналістыцы, — выбар тэмы.

...Калі пытаешся ў маладых творцаў, чым яны цікавяцца, большасць нязменна гаворыць пра музыку, флэшмобы, выставы і хобі. Сярод нас сапраўды многа крэатыўных і таленавітых людзей. І мы пра іх шмат пішам! Толькі давайце паразважаем разам: няўжо ўсе тыя ж напачатку будучыя, а потым і працуючыя ў рэдакцыях журналісты цэлымі днямі толькі і робяць, што абмяркоўваюць тэксты песень музыкантаў ці якасць аранжыроўкі? Або жывуць толькі прадчуваннем будучага флэшмоба? Наша жыццё — гэта не суцэльная чарада выстаў ці, скажам, баўленне часу за любімым хобі, праўда?

У сваім будзённым жыцці вы ідзяце ў школьны буфет, выбіраеце нейкую страву і потым абмяркоўваеце як за сталом: ці смачна, ці дорага, ці магло быць лепш? Дарэчы, ці многія з вас ужо паспрабавалі «сядзець на дыетах»? А ці правільна гэта ў такім узросце, калі арганізму, які расце, патрэбныя сілы?.. Магчыма, вы зайшлі з сябрамі ў краму, і неяк сама сабой усплыла тэма кішэнных грошай для падлеткаў?.. Колькі іх павінна быць? Ці павінны бацькі «плаціць» за добрыя адзнакі? Дарэчы, а вы самі ўжо паспрабавалі зарабіць уласны рубель? Як вам досвед?.. Дзе і як зараз у моладзі модна «тусіць»?.. А як вы «выжываеце» ўдалечыні ад сваіх бацькоў: гатаваць жа даводзіцца самім?.. З чаго складаецца ваш уласны «бюджэт пражытковага мінімуму»? Ці «максімуму»?

Няўжо гэтыя і іншыя пытанні вы не абмяркоўваеце штодня?.. Прычым у канкрэтных лічбах, з пэўнымі парадамі і высновамі?.. Напэўна, выказаць сваё меркаванне наконт творчасці таго ці іншага музыканта — гэта, у вашым уяўленні, прыкмета дарослаці? Ці «прасунутасці»? А будзённыя тэмы вам па гэтай прычыне падаюцца «дзіцячымі»? Але яны — гэта і ёсць сапраўднае жыццё. Вопытны даросы журналіст зможа, зразумела, «змяніць прафесію» на нейкі час і напісаць матэрыял практычна на любую моладзевую тэму. Але вам і пераўвасабляцца не трэба! У вас, як той казаў, для творчасці — усё перад вачыма і пад рукой.

...Калі гаварыць адносна прапанаваных аўтарам спосабаў выбару тэмы для напісання газетнай публікацыі, найперш бярыце на ўзбраенне «Уважлівы» і «Заказны». Некаторыя астатнія таксама маюць права на жыццё, але ў пэўным кантэксце і аб'ёме. Апошні ж — «Абавязковы» — гэта, хутчэй, не спосаб, а дэвіз працы рэпарцёра, яго стыль жыцця, калі хочаце.

А калі журналістыка — «яшчэ і проста ВАША», дык не варта наракаць на рэпартаж з кірмашу сельгаспрадукцыі. Тым больш, што і там можна знайсці шмат цікавага і карыснага. Тэмы — яны вакол вас! А будуць яшчэ пытанні і прапановы — пішыце. Абмяркуем, падкажам.

Рэдакцыя «ЧЗ».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Организатор аукциона: фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 228-60-13, 224-39-76, 500-47-10

Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Чкалова, 5

Дата и время проведения аукциона: 12 февраля 2013 г. в 11.00

Лот № 1

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 622/С-29207) – трехэтажное **здание раскройно-заготовительного цеха** общей площадью 3667,4 кв.м, 1992 года постройки, фундамент бетонный, стены кирпичные, силикатные блоки, перекрытия (чердачные и междуэтажные) – железобетонные плиты, крыша совмещенная. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 0,6600 га по адресу: Минская обл., Столбцовский район, дер. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 8, назначение: земельный участок для обслуживания находящегося в государственной собственности капитального строения (здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева (раскройно-заготовительного цеха). Введены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в водоохранной зоне р. Неман. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка**: разрешено в установленном законодательством порядке изменять целевое назначение земельного участка в случае изменения целевого назначения недвижимого имущества и использовать земельный участок для обслуживания здания специализированного иного назначения, здания специализированных складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, здания для производства строительных материалов, размещения объектов обрабатывающей промышленности, объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей, размещение которых допускается в зоне жилой застройки. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: в двухмесячный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта, иной проектной документации.

Начальная цена предмета аукциона: 218 079 908 рублей. *Начальная цена продажи недвижимого имущества понижена на 80 %*. **Размер задатка: 40 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 1 268 083 рубля.

Продавец: республиканское унитарное производственное предприятие «Новосверженский лесозавод» (Минская обл., Столбцовский район, дер. Новый Свержень, тел. (801717) 46043, 46400). **Арендодатель земельного участка:** Столбцовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Столбцы, ул. Ленинская, 45, тел. (801717) 55365).

Лот № 2

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 622/С-38420) – одноэтажное **здание погрузочно-разгрузочной рампы** общей площадью 632,6 кв.м, 1963 года постройки, фундамент бутовый, стены кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 0,1975 га по адресу: Минская обл., Столбцовский район, п. Новоколосово, назначение: земельный участок для обслуживания зданий и сооружений (погрузочно-разгрузочная рампа) в п. Новоколосово. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 20 лет. **Условия использования земельного участка:** разрешено в установленном законодательством порядке изменять целевое назначение земельного участка в случае изменения целевого назначения недвижимого имущества и использовать его для обслуживания здания специализированного иного назначения, здания специализированного склада, базы материально-технического снабжения, размещение которых допускается в общественной и промышленной зоне. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: в двухмесячный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона обратиться за государственной регистрацией права на земельный участок; получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта, иной проектной документации.

Начальная цена предмета аукциона: 188 452 228 рублей. *Начальная цена продажи недвижимого имущества понижена на 20 %*. **Размер задатка: 35 000 000** рублей.

Продавец: государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Брестская обл., г. Барановичи, ул. Димитрова, 42, тел. (801634) 57102). **Арендодатель земельного участка:** Столбцовский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Столбцы, ул. Ленинская, 45, тел. (801717) 55365).

Лот № 3

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 613/С-7907) – одноэтажное **здание хранилища техники** общей площадью 1515,4 кв.м, 1986 года постройки, фундамент железобетонный, стены кирпичные, чердачное перекрытие железобетонное, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 0,4793 га по адресу: Минская обл., г. Крупки, военный городок № 3, назначение: земельный участок для обслуживания здания хранилища техники. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 25 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование его для производственных целей с размещением производственных, административно-бытовых и складских зданий (помещений). Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо: осуществить государственную регистрацию права на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона; получить в установленном порядке разрешение Крупского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ по реконструкции существующего объекта или строительству нового объекта; осуществить реконструкцию (строительство) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; снимаемый плодородный слой использовать для нужд, связанных со строительством объекта (благоустройство и озеленение); произвести благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно разработанной и утвержденной проектной документации.

Начальная цена предмета аукциона: 395 938 731 рубль. *Начальная цена продажи недвижимого имущества понижена на 20%*. **Размер задатка: 70 000 000** рублей. Расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих земельных участков, составляют 2 271 795 рублей (с НДС 20 %).

Продавец: государственное учреждение «Борисовское эксплуатационное управление Вооруженных Сил» (Минская обл., г. Борисов, ул. Л. Чаловской, 26, тел. 8(0177) 757659, 733349). **Арендодатель земельного участка:** Крупский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Крупки, ул. Советская, 8, тел. (801796) 55663).

Лот № 4

Недвижимое имущество: капитальное строение (инв. № 602/С-13342) – одноэтажные **производственно-вспомогательные и бытовые помещения тепличного комбината** общей площадью 816,0 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонированный, стены – железобетонные панели, кирпич, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещено-рулонная. Принадлежности: кирпичное здание КПП (9 кв.м), ограждение – бетонные плиты на бетонных столбах (1356,2 м), ограждение – металлическая сетка на бетонных столбах (422,8 м), металлические ворота, две металлические калитки, автодороги тепличного комбината – цементобетонное покрытие (9574 кв.м), тротуар – цементобетонное покрытие (177 кв.м). **Капитальное строение** (инв. № 602/С-13348) – одноэтажная **канализационная насосная станция тепличного комбината** общей площадью 50,3 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – монолитожелезобетон, стены кирпичные, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша – рулонное покрытие. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-13350) – **резервуар дождевых стоков тепличного комбината** общей площадью 2640,4 кв.м, 1993 года постройки, фундамент и стены железобетонные. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-13351) – одноэтажный **блок зимних почвенных теплиц тепличного комбината** общей площадью 31040,0 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонный, стены – несущая конструкция из металлического каркаса с остеклением, перегородки – металлический каркас с остеклением, крыша – металлический каркас с остеклением. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-13352) – одноэтажный **склад тары (удобрений) тепличного комбината** общей площадью 290,8 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены – железобетонные панели, кирпичные, перегородки кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-13354) – одноэтажное **здание энергетического пункта тепличного комбината** общей площадью 295,8 кв.м, 1993 года постройки, фундамент бетонированный, ленточный, стены и перегородки – железобетонные панели, кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-31207) **–** одноэтажная **водопроводная насосная станция тепличного комбината** с подвалом, общая площадь 25,4 кв.м, 1993 года постройки, фундамент – железобетон без отделки плит, стены кирпичные, чердачные перекрытия – железобетонные плиты, крыша совмещено-рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-43215) – **внутриплощадочные тепловые сети тепличного комбината** протяженностью 485,2 м, 1992 года ввода в эксплуатацию. Составные элементы: участок сети от магистральной сети до здания АБК, участок сети от теплицы до склада тары, участок сети от теплицы до КНС. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-43216) **– внутриплощадочные сети электроснабжения 0,4 кВ и наружного освещения тепличного комбината** протяженностью 2150,9 м, 1993 года ввода в эксплуатацию. **Капитальное строение** (инв. № 602/С-43217) **– внутриплощадочные сети водопровода и канализации тепличного комбината** протяженностью 4015,1 м, 1993 года ввода в эксплуатацию. Составные элементы: сети водопровода тепличного комбината (хозяйственно-питьевой водопровод (1785,3 м) и поливочный водопровод (374,1 м), сети хозяйственно-фекальной канализации тепличного комбината (1036,7 м), сети промышленно-ливневой канализации (819 м). **Капитальное строение** (инв. № 602/С-43230) **– трубопровод напорной канализации от КНС тепличного комбината** протяженностью 2549,8 м, 1993 года ввода в эксплуатацию. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 18,1776 га по адресу: Минская обл., Пуховичский район, дер. Остров, назначение: земельный участок для ведения тепличного хозяйства. Введены ограничения в использовании части земельного участка площадью 0,713 га в связи с нахождением в охранной зоне ЛЭП свыше 1000 В. Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 10 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно в установленном законодательством порядке изменение целевого назначения земельного участка и использование его для размещения объектов производственного и непроизводственного назначения, административно-складского назначения, которые не являются источниками вредных веществ, шума и вибрации. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: осуществить в установленном законодательством порядке регистрацию права на земельный участок; получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки проекта на строительство (реконструкцию) объекта, в срок, не превышающий двух лет и осуществить строительство (реконструкцию) объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; осуществлять всякое строительство и реконструкцию в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

Начальная цена предмета аукциона: 2 494 952 936 рублей. *Начальная цена продажи недвижимого имущества понижена на 20 %*. **Размер задатка: 300 000 000** рублей.

Продавец: Минское республиканское унитарное предприятие электроэнергетики «Минскэнерго» (г. Минск, ул. Аранская, 24, тел. (8017) 2184297, 2238103, 2272111). **Арендодатель земельного участка:** Пуховичский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел. (801713) 52166).

Лот № 5

Недвижимое имущество и оборудование: капитальное строение (инв. № 623/С-42071) – одночетырехэтажное **здание маяка** с подвалом, общая площадь 2786,4 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены – железобетонные панели, перекрытия (чердачные и подвальные) – железобетонные плиты, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: забор из железобетонных плит. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42992) – одноэтажное **здание щитового домика** с пристройкой, общая площадь 80,0 кв.м, 1975 года постройки, фундамент бутовый, стены щитовые, облицованы кирпичом, перегородки дощатые, чердачное перекрытие деревянное, ДВП, крыша двухскатная шиферная. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42074) – одноэтажное **здание насосной станции II подъема** общей площадью 99,4 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены – железобетонные панели, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: забор из железобетонных плит, два резервуара запаса воды (250 куб.м), пожарный резервуар (600 куб.м), асфальто-бетонное покрытие (145 кв.м), дорожка из железобетонных плит (57 кв.м). **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42073) – одноэтажное **здание контрольно-пропускного пункта** общей площадью 46,9 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная с рулонным покрытием (технониколь). Принадлежности: асфальто-бетонное покрытие (1248 кв.м). **Капитальное строение** (инв. № 623/С-30389) – одноэтажное **здание трансформаторной подстанции - 438** с пристройкой, общая площадь 96,1 кв.м, 1988 года постройки, фундамент бетонный, стены кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная рулонная. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42072) – одноэтажное **здание биостанции** общей площадью 31,1 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены и перегородки кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-30390) – **высоковольтные сети** 1988 года ввода в эксплуатацию, рабочим напряжением 10 000 вольт. Составные части: КЛ - № 322 протяженностью 4649,0 м и КЛ- № 592 протяженностью 3362,0 м. Недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью 6,0430 га. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42075) – одноэтажное **здание канализационной насосной станции (КНС - 1)** общей площадью 10,6 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: забор. Капитальное строение (инв. № 623/С-42075) расположено на земельном участке площадью 0,2692 га. **Капитальное строение** (инв. № 623/С-42076) – одноэтажное **здание канализационной насосной станции (КНС - 2)** общей площадью 8,1 кв.м, 1988 года постройки, фундамент – железобетонные блоки, стены кирпичные, чердачное перекрытие – железобетонные плиты, крыша совмещенная с рулонным покрытием. Принадлежности: железобетонный забор. Капитальное строение (инв. № 623/С-42076) расположено на земельном участке площадью 0,4760 га. **Оборудование: 21 единица.** Недвижимое имущество расположено по адресу: Минская обл., Узденский район, Семеновичский с/с, зкп «Маяк», назначение: земельные участки для обслуживания зданий и сооружений.

Земельные участки предоставляются в аренду сроком на 99 лет со дня государственной регистрации права аренды земельных участков в территориальной организации по государственной регистрации. **Условия использования земельных участков:** возможно изменение целевого назначения земельных участков и использование их для размещения объектов рекреационного назначения, спорта и туризма, административных, общественных зданий, предприятий по обслуживанию населения и других производств. Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона необходимо в течение двух месяцев со дня заключения договоров аренды земельных участков обратиться за государственной регистрацией возникновения прав на земельные участки.

Начальная цена предмета аукциона: 4 882 021 754 рубля (в т.ч. недвижимое имущество – 4 734 136 176 рублей, оборудование – 147 885 578). **Размер задатка: 500 000 000** рублей.

Продавец: Государственный пограничный комитет Республики Беларусь (г. Минск, ул. Толбухина, 21, тел. (8017) 2870681). **Арендодатель земельных участков:** Узденский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Узда, ул. Советская, 22, тел. (801718) 734016).

Задаток для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 8 февраля 2013 г.** включительно на текущий (расчетный) счет № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». **Назначение платежа: *задаток для участия в аукционе.***

Участник аукциона, желающий участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов аукциона.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 310, 312. Последний день подачи заявлений** на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **8 февраля 2013 г. до 12.00.**

Информация о предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462, с учетом норм Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности».

Земельные участки предоставляются победителю аукциона (единственному участнику несостоявшегося аукциона) в аренду без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договоров аренды.

Для участия в аукционе в указанные в извещении сроки необходимо подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык; представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы: копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Победитель аукциона (единственный участник несостоявшегося аукциона) обязан:

1. подписать протокол о результатах аукциона; 2. в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе государственной регистрацией в отношении этих земельных участков; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка; 3. после совершения названных действий и представления организатору аукциона, продавцу, и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества может быть предоставлена в соответствии с действующим законодательством.

SEX–БАЛЯСЫ

КАЛІ ЯНА ПАЕХАЛА ДА МАЦІ...

Пачнём трохі здалёк і, па традыцыі, з анекдота. Сядзяць неяк у бары Леў і Бык. Хораша так сядзяць, «за жыццё» размаўляюць... Тут на «мабілу» Льву званок. Той паслухаў і ў адказ: «Так, дарагая, зараз выходжу, праз паўгадзіны буду дома». Пачуўшы тое, Бык давай на смех Льва ўздымаць: маўляў, куды сабраўся, так добра сядзелі... Бачыш ты, жонка пазваніла — ён ужо і сябра гатовы адразу кінуць! Леў тое слухаў-слухаў, а потым і кажа: «Слухай, Бык! Вось твая жонка хто? Карова! А мая — Львіца!» Да чаго гэта я? Мы заўсёды (ну, амаль заўсёды) імкнёмся слухаць сваіх каханак, сваіх жонак. Але ж у жыцці, бывае, надыходзіць момант, калі яна з'язджае да маці... І як бы ты яе ні кахаў, але...

Што рабіць, залежыць ад канкрэтнай сітуацыі. Калі нагода, як у тым анекдоце («Дарагі, я прасыпала соль, гэта дрэнная прыкмета — да сваркі» — «А можа, абыдзецца?» — «Не, я ўжо настроілася!»), дык, можа, няхай і з'ездзіць? Чаго перашкаджаць чалавеку, адгаворваць? Але калі ў доме ёсць стрэльба, лепш не рызыкаваць — не адкрываць адразу шампанскае ў гэтым выпадку: жонка можа вярнуцца, падумаўшы, што вы застрэліліся. Яшчэ і істэрыку закаціць: чаму грошай далі толькі ў адзін канец...

Ну, вось прыклад з жыцця — для «затраўкі». Адна знаёмая паехала да маці, бо яе сужэнец усё рамонт у кватэры не мог дарабіць. Вядома, калі паглядзець збоку, нагода для такога кроку, як ад'езд, магчыма, і слушная... Але ж мы ведаем, што ў медаля два бакі. Ну, не было ў гаспадара натхнення! Дык што, кідай усё і едзь следам?!. Яна ж не назаўсёды паехала, дала час усё спакойна абдумаць, узважыць... У сэнсе, адносна шпалер...

Тут адзін знаёмы расказваў такую гісторыю. Справа ў іх ішла да вяселля, дзяўчына нават да яго на здымную кватэру пераехала. Але незадоўга да ўрачыстасці тэлефануе дачцэ маці, нейкая ў іх там размова адбываецца кшталту «падумай яшчэ раз», і тая — ад'язджае... Знаёмы казаў, што і сам раздумваў не вельмі доўга пасля: злавіў таксі і паехаў да патэнцыяльнай цешчы. Казаў, што ў яго, напэўна, такі выгляд быў, што калі папрасіў таксіста, не даязджаючы да патрэбнага дома, спыніцца каля бара, той нават наўздагон пра аплату праезду нічога не сказаў. Знаёмы распавёў, што сваю будучую жонку тады вярнуў. Вядома ж, дзякуючы не выпітай гарэлцы, а таму, што ўсё для сябе канчаткова вырашыў. Зрэшты, магу расказаць і гісторыю з зусім іншай канцоўкай. У падобнай сітуацыі — калі дзяўчына ці сышла, ці паехала — хлопец ад расстройства нават плакаў. У выніку дабіўся ўсё ж свайго — ажаніўся. А потым сам жа жонку і кінуў, бо знайшоў маладзейшую.

Калі нагода, як у тым анекдоце («Дарагі, я прасыпала соль, гэта дрэнная прыкмета — да сваркі» — «А можа, абыдзецца?» — «Не, я ўжо настроілася!»), дык, можа, няхай і з'ездзіць? Чаго перашкаджаць чалавеку, адгаворваць?

Неяк даўно таварыш, калі жонка ад'язджала... (Ну, што мы прычапіліся — да маці, да маці!.. Неабавязкова, колькі ж ім туды ездзіць, няхай будзе — у камандзіроўку!) Дык вось, у такіх халасцяцкіх сітуацыях ён усё любіў паўтараць: маўляў, «хочацца ж не толькі баршчу»... Прыкладна як у тым анекдоце, калі жонка тэлефануе дадому мужу і пытаецца, ці ўсё ў парадку. Добра ўсё, адказвае той, толькі куды падзеліся відэльцы ды лыжкі? А тая ў адказ: «Дома начуй!» Мужчына нічога не разумее і наступным разам задае тое ж пытанне. Нарэшце,

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

жонка вяртаецца дадому, падыходзіць да іх ложка, здымае прасціну, а пад ёй — усе сталовыя прыборы. «Я ж табе казала: начаваў бы дома, ведаў бы, дзе відэльцы ды лыжкі!»

...Ці атрымаў мой таварыш нешта больш «салодкае», чым хатні «боршч», не ведаю. Як той казаў, свечку не трымаў.

Прыгадаю ў гэтай сувязі яшчэ адзін анекдот. Неяк у райцэнтр да «мужчынскага» ўрача завітаў 70-гадовы вясковец. З праблемай. Маўляў, у мяне з маёй бабкай толькі раз у месяц атрымліваецца, а ў суседа — два разы. А таму, між іншым, 80 гадоў. «А адкуль вы ведаеце пра такія рэкорды суседа?» — пытаецца доктар. Дык ён сам так кажа, адказвае пацыент. А ўрач яму: «Ну ды і вы так кажыце!»

...Што, не ўсе сітуацыі пералічыў? Маўляў, каторая маладзіца і сама можа цябе да маці адправіць? Ці па маці... Ну што вы, як можна? Мы ж інтэлігентныя людзі!

...Карацей, варыянтаў, што рабіць, калі яна паехала да маці, шмат. Які выбраць? Прабачце, а ваша каханая — хто?.. У сэнсе, львіца ці...

P.S. *Гэтыя нататкі, як і сама рубрыка, прысвячаюцца маёй Трывалавай-Цярпелавай. Бо яна ў мяне... Ну, здагадаліся, хто!*

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

Без шаблонаў

ГУЛЬНЯ, ШТО ВУЧЫЦЬ ДУМАЦЬ

Дзяцінства — час, калі не вельмі думаецца пра розныя сур'ёзныя рэчы, накшталт таго, як паступіць у ВНУ, зарабіць грошай або яшчэ пра што-небудзь падобнае, «карыснае», але зусім не цікавае. У дзяцінстве хочацца гуляць, і гэта самае адэкватнае жаданне ў такім узросце. Якія бываюць гульні? Натуральна, самыя розныя. Спартыўныя, камп'ютарныя, тэатралізаваныя, інтэлектуальныя. Менавіта апошнія ўвасабляюць у сабе, з аднаго боку, карысць, а з іншага — азарт, цікавасць, магчымасць знайсці шмат сяброў па інтарэсах. «Што? Дзе? Калі?» ці не самая папулярная гульня такога кшталту. І далучыцца да яе можна хоць з пятага класа.

Фота з Хрустальнай савой.

Яна не надакучыць

Мой суразмоўца Павел Свярдлоў прыйшоў у «Што? Дзе? Калі?» у чатырнаццаць гадоў. Зараз яму 28, палова жыцця — у гульні. *«Усё пачалося з Ліцэя БДУ, калі сябар запрашаў у сваю каманду маю суседку па парце,* — узгадвае Павел. — *А пасля прадоўжылася ў Клубе інтэлектуальных гульняў БДУ. Дарэчы, адным з самых даўгавечных у Беларусі».*

З 2007 года ўкраінская тэлевізійная ліга стала для яго яшчэ адной пляцоўкай інтэлектуальнай самарэалізацыі. Як аказалася, даволі паспяховай: летась са здымак «Што? Дзе? Калі?» Павел прывёз Хрустальную саву. Цяпер знаток са стажам гуляе ў камандзе «МІД-2» і трэніруе школьнікаў у Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» Кастрычніцкага раёна сталіцы.

Як стаць інтэлектуалам?

Дастаткова проста захацець і прыйсці ў цэнтр пазашкольнай працы ў сваім раёне. Секцыі «Што? Дзе? Калі?» дзейнічаюць ва ўсіх абласных гарадах Беларусі і ў многіх раённых цэнтрах.

Як правіла, гульцоў дзеляць на чатыры ўзроставыя групы: са школьнікаў, якія яшчэ не скончылі дзявяты клас, фарміруюцца каманды ювеналаў, з дзесяці- і адзінаццацікласнікаў — каманды юніёраў, са студэнтаў — каманды сеньёраў, а з дарослых — каманды грандаў. Часам каманды розных узростаў гуляюць на адных і тых жа пытаннях. Натуральна, гэта можа быць трошкі складана псіхалагічна, але праз некаторы час малодшыя каманды выходзяць на больш высокі ўзровень.

Каб прыйсці ў гурток «Што? Дзе? Калі?», дастаткова жадання. З тэлеверсіяй гульні больш складана: для кандыдатаў у «тэлезоркі» падрыхтаваны спецыяльны «іспыт», які называецца «млын». З усіх «абітурыентаў» выпадковым чынам фарміруюцца каманды, якім задаюцца пытанні. У выніку застаецца пэўная колькасць знатакоў, шасцёра з якіх садзяцца за стол, а астатнія праз некаторы час іх па чарзе падмяняюць. У выніку ідзе новы «адсеў» і фарміруецца выніковая «шасцёрка».

Аптымальны ўзрост для таго, каб прыйсці ў «Што? Дзе? Калі?», — прыкладна 12-13 гадоў (7-8 класы), бо пазней школьнік ужо не мае дастаткова вольнага часу для інтэлектуальных гульняў. Пры гэтым узрост — не галоўнае. Павел расказаў пра Ваню Зайкова, які, калі прыйшоў на трэніроўкі, вучыўся ў 5 класе, але ведаў больш за дзесяцікласнікаў. Хлопчыку нават давялося пагуляць разам з дарослымі «тэлезоркамі» ў Маскве. А ў беларускім «Брэйн-рынгу» ён абараняе колеры каманды «Анега».

Напружвай мазгі

Шмат часу перад турнірамі займае трэніроўка каманды. Безумоўна, для гульца важна быць актыўным, «камандным» чалавекам, умець хутка думаць, мець добрую эрудыцыю, бо камандзе трэба паспець падрыхтаваць адказ за хвіліну. Як правіла, дзеці, якія прыходзяць у Цэнтр дадатковай адукацыі гуляць у «Што? Дзе? Калі?», не ўмеюць працаваць у камандзе. Але ўсё гэта справа часу.

Ці не ў кожнага трэнера ёсць свая методыка работы з камандай. Традыцыйная трэніроўка складаецца з дзвюх частак. На першым этапе кожны сам за сябе: выконвае заданні на гульню са словамі, на эрудыцыю.

Другі этап — гульцы дзеляцца на каманды, адказваюць на пытанні, а потым аналізуюць свае адказы. Практыкуюцца адказы на тыя пытанні, якія ўжо «ўдзельнічалі» ў рознага кшталту чэмпіянатах (дарэчы, такіх пытанняў напісана ўжо больш за 200 тысяч!). Наогул, галоўнае на такіх трэніроўках — навучыцца думаць над любым пытаннем, бо часта ў фармулёўцы самога пытання «схаваны» адказ. І рабіць гэта нестандартна.

Трэнеры і гульцы

Кожны трэнер хоча бачыць у сваёй камандзе эрудзіраваных гульцоў. Аднак, думаю, сапраўднаму трэнеру больш прыемна будзе вырасціць сапраўдных інтэлектуалаў са звычайных хлопцаў і дзяўчынак, якія толькі і робяць, што сядзяць «ВКонтакте» і аддаюць перавагу камп'ютарным гульням.

«Як правіла, у школьнікаў, якія прыходзяць у клубы «Што? Дзе? Калі?», асноўная мэта — гэта менавіта гульня, а не нейкія вялікія планы кшталту стаць «тэлезоркай», — дзеліцца сваімі назіраннямі трэнер Павел Свярдлоў. Тым не менш, дзеці паступова разумеюць, як важна больш чытаць і развіваць сябе. *«Таксама важна і тое,* — дадае Павел, — *што дзякуючы інтэлектуальным гульням дзеці не «тусуюцца» ў пад'ездах, бо паступова ў іх з'яўляюцца новыя «інтэлектуальныя» сябры, новыя захапленні».*

Эрудыт ці камандны дурань?

Вельмі важна, каб кожны гулец адчуваў сябе членам каманды. Менавіта ад гэтага залежыць і поспех на турніры. Дарэчы, каманда фарміруецца не проста так: падбіраюцца людзі з рознымі інтарэсамі і ведамі.

Кожны гулец мае сваю ролю ў камандзе. Капітан — гулец з развітай інтуіцыяй, які ўважліва выслухоўвае прапановы астатніх членаў каманды, а пасля фармулюе выніковы адказ. «Генератар ідэй» — чалавек, які прыдумляе розныя варыянты адказу. «Эрудыт» — член каманды, які валодае фактамі з розных галін ведаў. Усмешку можа выклікаць роля так званага «каманднага дурня». *«Насамрэч гэты чалавек далёка не дурань,* — тлумачыць Павел, — *яго роля заключаецца ў тым, каб вывесці каманду са «ступару». Здараецца, ніхто не можа зразумець сутнасць пытання, і вось тут «камандны дурань» прапаноўвае нейкую ледзь не фантастычную версію, якая, тым не менш, прымушае астатніх думаць».*

Сінхронныя турніры

У кожным вялікім горадзе Беларусі праводзяцца рэгулярныя гарадскія чэмпіянаты. Як правіла, турніры ладзяцца ў розных узроставых катэгорыях: дзіцячыя, студэнцкія, дарослыя. Студэнцкія і дарослыя чэмпіянаты праходзяць у абласных гарадах, дзіцячыя — не толькі: яны ўжо праходзілі ў Рагачове, Мазыры, Светлагорску, Чэрвені, Ваўкавыску... Таксама арганізуюцца і чэмпіянаты Беларусі. У дзяцей галоўныя спаборніцтвы года прыпадаюць на вясну, а ў дарослых — на зіму.

Асобна трэба сказаць пра так званыя «сінхронныя» турніры, калі адначасова ў некалькіх гарадах ці нават краінах гуляюць каманды па адных і тых жа пытаннях. Чэмпіянаты такога кшталту падкрэсліваюць адзін з галоўных прынцыпаў, на якім базіруецца сутнасць гульні, — сумленнасць.

Магчыма, прагматыкі скажуць, што інтэлектуальная гульня не нясе ніякай практычнай карысці. Яна не падрыхтуе ні да цэнтралізаванага тэсціравання, ні да выпускных экзаменаў. Але насамрэч гульні такога кшталту даюць нашмат больш карысці: яны вучаць думаць без шаблонаў, шукаць правільныя рашэнні за сціслы час, развіваюць логіку. І, натуральна, даюць магчымасць знайсці вялікую колькасць сяброў.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.
Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 25.899.
Нумар падпісаны ў 19.30 9.01.2013 г.

■ Сітуацыя

ДЗЯРЖПАДТРЫМКУ ПРЫЙДЗЕЦЦА ВЯРНУЦЬ?

У сувязі з невыкананнем умоў аказання дзяржаўнай падтрымкі гэтыя сродкі трэба будзе вярнуць. Такое папярэджанне прагучала на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці па выніках праверкі эфектыўнасці работы і рэалізацыі інвестыцыйных праектаў адкрытага акцыянернага таварыства «Мастоўдрэў».

Нягледзячы на дзяржаўную падтрымку ў памеры 41,3 мільярда рублёў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту фінансавы стан прадпрыемства нездавальняючы. Па выніках дзесяці месяцаў мінулага года — 3,4 млрд рублёў страт ад рэалізацыі, рост дэбіторскай запазычанасці за адгружаную прадукцыю ў 2,5 раза (246,7 млрд рублёў) у параўнанні з пачаткам года прывёў да «вымывання» ўласных абаротных сродкаў. Крэдытны партфель налічвае 532 млрд рублёў, прычым 9 млрд рублёў зрасходавана на выплату працэнтаў. Не выконваецца і такая ўмова аказання дзяржаўнай падтрымкі, як паказчык рэнтабельнасці рэалізаванай прадукцыі.

Таварыства «Мастоўдрэў» атрымлівае дзяржаўныя прэферэнцыі, якія выражаюцца ў мільёнах долараў і еўра. Па сутнасці, можна было ў чыстым полі на гатовых інжынерных сетках пабудаваць два новыя заводы. Але ўсе цудоўна разумеюць, што для Мастоў гэта градаўтваральнае прадпрыемства. Таму грошы ўкладваюцца дзяржавай не толькі для вырашэння задач мадэрнізацыі вытворчасці, але і з улікам многіх сацыяльных фактараў — занятасці насельніцтва, напаўняльнасці бюджэту раёна.

Так, ёсць аб'ектыўныя прычыны стратнай работы, у прыватнасці, падзенне экспартных цэн на асноўны від прадукцыі — фанеру. Аднак, разам з тым, Камітэтам дзяржкантролю выяўлена шмат фактаў безгаспадарчасці, эканамічных пралікаў кіраўніцтва пры рэалізацыі энергазберагальных, імпартазамяшчальных і экспартаарыентаваных праектаў.

Вялікія надзеі, напрыклад, ускладаліся на рэканструкцыю кацельні са стварэннем міні-ЦЭЦ. Праект каштаваў 16,6 млрд рублёў, у тым ліку 6,2 млрд рублёў — сродкі інавацыйнага фонду Мінэнерга і канцэрна «Беллесбумпрам». Аднак... За пяць гадоў з моманту ўводу абсталявання ў эксплуатацыю недаатрымана электраэнергіі на суму больш за 6,9 млрд рублёў, дапушчаны перарасход паліва (дранкі) на 628 млн рублёў, затрачана на рамонт каля 300 мільёнаў рублёў. Якая адказнасць пастаўшчыка няякаснага і неэфектыўнага абсталявання? Гарантыйныя тэрміны прад'яўлення рэкламацый кіраўніцтвам прадпрыемства... былі ўпушчаны.

Акрамя таго, Камітэтам дзяржкантролю выяўлены факты неабгрунтаванага пасрэдніцтва. Да прыкладу, таварыства «Мастоўдрэў» выступае пасрэднікам пры рэалізацыі дранкі прадпрыемства «Ударнік» (г. Віцебск) у адрас польскай фірмы. І пры гэтым мае з той жа фірмай асобныя кантракты на пастаўку дранкі... па больш высокіх экспартных цэнах. У выніку толькі за кошт розніцы коштаў эспартных і ўнутранага рынку страты таварыства «Мастоўдрэў» склалі 2,9 млрд рублёў, альбо 272 тысячы еўра.

А парушэнне тэрмінаў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў — ужо ледзь не норма, зазначае калегія Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці. У прыватнасці, з 2010 года неаднаразова пераносіўся тэрмін рэалізацыі праекта па арганізацыі вытворчасці драўнянавалакністых пліт (МДФ/ХДФ). Апошні тэрмін (верасень 2014 года) знаходзіцца пад пагрозай зрыву з-за прамаруджвання з праектаваннем, нізкіх тэмпаў будаўніцтва, нястачы фінансавання. Пры тым, што авансавы плацеж пастаўшчыку абсталявання з Германіі (8 мільёнаў еўра) больш за два гады працаваў на эканоміку замежнай дзяржавы.

Барыс ПРАКОПЧЫК

ДЗЕ ЖЫЎ МАЛЕВІЧ?

У Віцебску, у доме, дзе калісьці працавалі Шагал, Малевіч і іншыя мастакі, цяпер карпатліва займаюцца тым, каб максімальна зрабіць будынак звонку і ўнутры такім, якім ён быў пры жыцці майстроў.

Фота Валерыя ШЫШАНАВА.

Будынак, у якім размяшчалася Віцебскае народнае мастацкае вучылішча і музей сучаснага мастацтва.

Менавіта тут, у правінцыйным Віцебску ў 1919-м Казімір Малевіч стварыў студэнцкае аб'яднанне «УНОВИС» («Утвердители НОВого ИСкусства»).

А ўсё пачалося з таго, што восенню 1918 года Шагала прызначылі ўпаўнаважаным па справах мастацтваў губерні. Шагал і яго памочнікі ў гонар першай гадавіны рэвалюцыі ўпрыгожылі Віцебск мноствам пано і плакатаў. Ды з такім размахам, што сучаснікі, якія бачылі гэта на свае вочы, гаварылі, што Віцебск у сэнсе святочнага афармлення «пераплюнуў» сталіцу.

А ў наступным годзе Шагал дабіўся таго, каб у Віцебску пачало працаваць народнае мастацкае вучылішча. І запрасіў на працу ў гэтую навучальную ўстанову вядомых майстроў з Петраграда, Масквы. І яны прыехалі: Ермалаева, Пуні, Лісіцкі, Малевіч і іншыя. Культ свабоднай творчасці правіў баль у сценах вучылішча. Таму нараджэнне аб'яднання эксперыментатараў ад мастацтва не прымусіла доўга сябе чакаць. Потым адкрылі музей сучаснага мастацтва.

У Віцебску, дарэчы, традыцыі легендарных мастакоў не забыты. Дзейнічае Цэнтр сучаснага мастацтва, супрацоўнікі якога (вядома, не без дапамогі гісторыкаў, даследчыкаў творчасці вышэйназваных мастакоў) і зробяць усё магчымае, каб сучасныя наведвальнікі дома літаральна перанесліся ў часе. Кіраўнікі мясцовай выканаўчай улады вельмі рашуча заяўляюць аб намеры вярнуць будынку першапачатковы выгляд — як звонку, так і ўнутры. Калі быў там пакой, дзе жыў Малевіч, то і павінен застацца такі пакой. Калі пакой, дзе выкладаў Шагал або там праходзілі нейкія мерапрыемствы, адбываліся падзеі, пасля рэканструкцыі ўсё там павінна адпавядаць таму, што было.

Недалёка ад былога мастацкага вучылішча, таксама ў будынку дарэвалюцыйнага часу, плануюць адкрыць музей для размяшчэння калекцыі работ настаўніка Шагала — Пэна. Пакуль што яго творы можна ўбачыць у мастацкім музеі, які ўваходзіць у склад Віцебскага абласнога краязнаўчага. Есць ідэя яшчэ ў адным старым будынку па суседстве зрабіць музей — які канкрэтна, пакуль абмяркоўваецца.

У Віцебску таксама не забыта ідэя стварэння «шагалаўскага квартала» — у раёне дома-музея Шагала, на вуліцы Пакроўскай. І наваколлі, як задумана, стануць часткай вялікай музейнай тэрыторыі пад адкрытым небам. Але для гэтага ў ліку іншага спатрэбіцца і перасяленне ў іншае месца шэрагу прадпрыемстваў. Адказныя асобы гарвыканкама таксама актыўна вядуць перамовы з кіраўніцтвам шэрагу арганізацый і ўстаноў, якія маюць зараз офісы ў самым цэнтры горада. Напрыклад, з дарожна-будаўнічым трэстам №1, «Аўтадорам», каб яны з пешаходнай вуліцы Суворава пераехалі. У гэтых будынках задумана стварыць музейныя ўстановы або гандлёва-забаўляльныя цэнтры... Ужо ёсць вынікі. Напрыклад, праектны інстытут Віцебскага домабудаўнічага камбіната, які размяшчаўся побач з жаночым манастыром, пакінуў будынак, пабудаваны да рэвалюцыі. Цяпер у гарвыканкаме думаюць, які музей там размясціць. Вядуцца перамовы і з кіраўнікамі «Будаўнічага трэста № 9», адміністрацыя якога працуе ў доме побач з вышэйзгаданым будынкам, дзе працавалі Малевіч і Шагал і іншыя мастакі, — на вуліцы «Праўды».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Нашы людзі

У ГОРАД? Ні за якія абяцанкі!

На Пухавіччыну Мікалай Крукоўскі пераехаў з сям'ёй шэсць гадоў таму з Зэльвенскага раёна, што на Гродзеншчыне. Тут, у Дукоры, нарадзілася яго жонка Наталля Канстанцінаўна. Таму і вырашылі перабрацца на яе малую радзіму: побач сталіца, дзецям зручней будзе атрымаць адукацыю, ды і дадому змогуць часцей наведвацца.

На той час, нягледзячы на малады ўзрост, за плячыма Мікалая Міхайлавіча быў багаты вопыт камбайнерскай працы. Добрая слава, як і дрэнная, бяжыць наперадзе чалавека. Яшчэ да прыезду Крукоўскага тут ужо ведалі, што ён атрымліваў за сваю працу толькі падзякі ды граматы. У новым сельгаспрадпрыемстве яму адразу ж далі новы трактар, падменнае жыллё. Для жонкі таксама знайшлася работа па спецыяльнасці ў мясцовай школе-садку. А тры гады таму сям'я пераехала ў «прэзідэнцкі» дом, які выдзеліла «Дукора-агра». Тут ёсць усё неабходнае для жыцця: газ, прасторныя пакоі, пабудовы для падсобнай гаспадаркі, зямельны ўчастак. Але сям'я марыла не аб службовым, а аб уласным кутку. Гаспадар узяў ільготны крэдыт на будаўніцтва дома. Сёлета, відаць па ўсім, ужо справяць навасэлле — засталіся толькі ўнутраныя работы. Мікалай Міхайлавіч будуе жыллё з разлікам на перспектыву. Старэйшы сын Андрэй заканчвае ліцэй, збіраецца паступаць ва ўніверсітэт. Малодшы, Сяргей, пакуль вучыцца ў школе, але марыць пайсці па слядах брата. Не паспееш і вокам міргнуць, як жэняцца хлопцы і, можа, нават прывядуць нявестак у бацькоўскі дом.

— Зрэшты, няхай самі вырашаюць, як ім ладзіць сваё жыццё, — гаворыць Мікалай Міхайлавіч. Але відаць па ўсім, што ён не супраць, каб усе сабраліся пад адным дахам, разам працавалі, адпачывалі.

— Мінулы год удалося ўпершыню адпачыць усёй сям'ёй на моры: пасля касавіцы і перад пачаткам жніва выкраіў дзесяць дзён, — распавёў мой суразмоўца. — А пазалетась па льготнай пуцёўцы адпачыў у санаторыі.

У мінулым годзе гаспадарка сабрала нядрэнны ўраджай — 42 цэнтнеры з гектара. Гэта другі паказчык па ўраджайнасці ў раёне. А Мікалай Крукоўскі на камбайне «Лексіён-560» намалаціў 2600 тон зерня. Сёлета механізатар плануе ўзяць больш высокі рубеж.

— На «Дажынкі» замахнуліся? — цікаўлюся ў камбайнера.

— Трэба ж нарэшце дажаць гэтыя «Дажынкі», — жартуе ён, а потым ужо дадае на поўным сур'ёзе: — Хацелася б паўдзельнічаць у рэспубліканскім свяце, дастойна прадставіць раён, сустрэцца са сваімі калегамі, абмяняцца вопытам....

— А ці ёсць у вас зайздроснікі? Усё ж такі і заробкі нядрэнныя, і слава, і пашана, і ўзнагароды...

— Так, — зарабляю нядрэнна. Але ж умовы для ўсіх у гаспадарцы аднолькавыя: працуй, не лянуйся — і ўсё будзеш мець, — адказвае ён. — Акрамя таго, у залежнасці ад нормы выпрацоўкі ўдзельнікам пасяўной, жніва, нарыхтоўкі кармоў гаспадарка выдзяляе збожжа. Мы з жонкай раней трымалі парсючка. Але, на мой погляд, падсобная гаспадарка перашкаджае асноўнай рабоце: Наталля пастаянна ў школе, я заняты круглы год: пасяўная, касавіца, жніво, затым падрыхтоўка тэхнікі да зімы, вываз арганікі. І так месяц за месяцам, год за годам. — Таму з жыўнасці трымаем толькі трусоў. Зразумела, жыць на зямлі і не мець сваёй гародніны — гэта ўжо занадта. Вырошчваем на прысядзібным участку і агуркі, і памідоры, і буракі, і моркву — для сям'і хапае, ды яшчэ і застаецца — сваякам раздаём. Ёсць і свае яблыкі, ягады. А ўсё астатняе можна ў краме купіць.

Наша размова ад бытавых паўсядзённых клопатаў плаўна пераходзіць на моладзь.

— У гаспадарцы хапае маладых перспектыўных механізатараў, якія наступаюць на пяткі. Гэта і Сяргей Дрынеўскі, і Міхаіл Пікулік, і Максім Мацвеенка, — заўважыў мой суразмоўца.

З гэтай нагоды Мікалай Крукоўскі ўзгадвае свае першыя крокі на працоўнай ніве. Пасля заканчэння вучылішча ён прыйшоў на практыку ў механічныя майстэрні. А яму далі ў рукі... венік: маўляў, мяці ад парога і да... абеду. Дзень, другі памахаў практыкант венікам — надакучыла. Выручыў родны дзядзька, які тым часам працаваў на камбайне і ўпрасіў адпусціць пляменніка да яго ў памочнікі.

— Ужо праз тыдзень дзядзька шпацыраваў па краі поля, а я руліў за яго. Калі не ён, то, магчыма, і адбілі б у мяне ахвоту працаваць механізатарам. Галоўнае, своечасова звярнуць увагу на маладых, знайсці падыход, зацікавіць, — лічыць Мікалай Міхайлавіч.

Старэйшы сын Крукоўскага ў час канікулаў дапамагае бацьку на камбайне, — ніхто яго да гэтага не прымушаў, сам папрасіўся.

— А хто ж навучыць лепш за бацьку? — менавіта так лічыць Мікалай Міхайлавіч.

Такія работнікі, як Мікалай Крукоўскі, знойдуць працу ўсюды, у тым ліку і ў горадзе: залатыя рукі, светлая галава.

— А якое адрозненне паміж маім жыццём і гарадскім? — кажа ён. — У мяне ёсць усё неабходнае, каб нармальна сябе адчуваць: дом, машына, работа. Спатрэбіцца ў горад? Без праблем. І ў тэатр, і ў кіно, і па магазінах пахадзіць — усюды можна паспець за дзень. Але я сельскі жыхар, люблю волю, прастор і чыстае паветра. І мяне не заманіш у горад ніякімі абяцанкамі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 14 февраля 2013 года проводит 2-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
9	Бурильная машина БТС-150 № 1390 на шасси Т-150 ш. 41077 дв. 301246 1989 г. 2 кат. 29 м/ч	г. Жодино, в/ч 48848	120 000 000	12 000 000
10	Мастерская МРМ-М1 № б/н на ЗИЛ-131 ш. 180431 дв. 972000 1975 г. 4 кат. 4902 км	н.п. Новоколосово, в/ч 25819	40 000 000	4 000 000
11	Грузовой КамАЗ-43106 ш. ХТС431060М0007200 дв. 0790465 1991 г. 3 кат. 131 705 км	г. Добруш, в/ч 11724	45 000 000	4 500 000
12	Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 022879 дв. 188425 1989 г. 4 кат., 195170 км, полуприцеп ОДАЗ-9385 ш. 9385236831 1990 г. 4 кат. 195170 км	г. Добруш, в/ч 11724	60 000 000	6 000 000
13	Автошасси КамАЗ-4310 ш. 028059 дв. 039000 1987 г. 3 кат. 140791 км, кузов-фургон КМ-4310 № б/н 1987 г. 4 кат.	н.п. Деревная 230ОП	50 000 000	5 000 000
14	Автошасси МАЗ-5334 ш. 116956 дв. 12859 1989 г. 3 кат. 126591 км. Кузов-фургон КМ-500 № б/н 1989 г. 4 кат.	г. Минск, в/ч 04147	37 000 000	3 700 000
15	Грузовой Урал-4320 ш. 053916 дв. 872032 1986 г. 3 кат. 23608 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	55 000 000	5 500 000
16	Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0006088 дв. 0716261 1990 г. 3 кат. 94941 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
17	Грузовой Урал-4320-0011 ш. 078588 дв. 103330 1987 г. 3 кат. 28588 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	55 000 000	5 500 000
18	Грузовой Урал-4320-0011 ш. 076422 дв. 077804 1987 г. 3 кат. 23260 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	60 000 000	6 000 000
19	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 084807 дв. 150412 1987 г. 3 кат. 76823 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
20	Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 186520 дв. 308121 1991 г. 3 кат. 98478 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	55 000 000	5 500 000
21	Грузовой Урал-4320 ш. 142977 дв. 574611 1989 г. 3 кат. 85203 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
22	Грузовой Урал-4320 ш. 017964 дв. 489828 1983 г. 3 кат. 117930 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
23	Грузовой Урал-4320 ш. 017524 дв. 492966 1983 г. 3 кат. 115399 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
24	Грузовой Урал-4320 ш. 017815 дв. 492976 1983 г. 3 кат. 118762 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
25	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 134281 дв. 079401 1989 г. 3 кат. 134608 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
26	Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 140304 дв. 550496 1990 г. 3 кат. 29954 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	60 000 000	6 000 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, каб. № 637 **14 февраля 2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы **до 17.00 11 февраля 2013 года.**

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи **14 февраля 2013 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 10-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012107883029, в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС. **Справки по тел.: (017) 278 09 98, факс (017) 278 09 98. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению РУППС «Белпочта» (продавец)

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА НА ЗАКЛЮЧЕНИЕ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Сведения о балансодержателе:
Гомельский филиал РУП «Белпочта», г. Гомель, ул. Советская, 8, тел. 8(0232) 74 07 33

№ лота	Наименование объекта	Адрес объекта продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
Помещения на 2-м этаже в капитальном строении (здание многофункциональное инв. № 300/С-4458). Коэффициент спроса – 2,5; базовая ставка – 0,3; коэффициент месторасположения – 0,9.				
1	**Помещение 23,4 кв.м**	г. Гомель, пр-т Октября, 81	315 900	31 590
2	**Помещение 25,0 кв.м**		337 500	33 750
3	**Помещение 15,6 кв.м**		210 600	21 060
4	**Помещение 14,3 кв.м**		193 050	19 300

Срок подачи заявления	**16 января 2013 г.**, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, к. 2-4
Дата, время, место проведения аукциона	**18 января 2013 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, к. 2-4, ОАО «Гомельоблреклама» Филиал «Эксперт-Услуга»
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012021020054 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 151501664, УНП 400395996, получатель – Гомельский филиал РУП «Белпочта»
Условие пользования	Для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организация производства (кроме вредных производств)
Условия продажи	Срок аренды – 5 лет, шаг аукциона 10%.

Дополнительная информация по тел. (0232) 74 17 34, 74 89 64 (факс).

Подробное извещение в газете «Звязда» от 12.09.12 г.

Извещение проведении торгов по продаже оборудования ОАО «Мозырьдрев»:

Управляющий объявляет о проведении торгов по продаже оборудования.

Торги проводятся в форме открытого аукциона.

Торги состоятся 13.02.2013 г. в 11.00. по адресу: Гомельская обл. г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

№ лота	Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота)	Начальная цена продажи, руб. (без уплаты НДС)	Задаток % (рублей)	Шаг аукциона %	Затраты на подготовку документации, бел. руб.
Лот № 4	Дымосос инв. № 419	1 600 000 руб.	32 000	5	864 040
Лот № 5	Рейсмусовый станок инв. №190	18 500 000 руб.	370 000	5	864 040
Лот № 6	Стружкоотсос УВП – 3000 инв. № 6858, 6857	3 800 000 за ед.	76 000 за ед.	5	1 194 640
Лот № 7	Автомобиль HYUNDAI SONATA инв. № 5568	21 000 000	420 000	5	1 107 096
Лот № 8	Емкость для хранения формалина инв. № 6760, 6757, 6758, 6759	122 200 000 за ед.	2 444 000 за ед.	5	3 410 220
Лот № 9	Водонагреватель инв. № 6856	900 000	18 000	5	726 540
Лот № 10	Стружкоотсос УВП – 5000 инв. № 6859	6 300 000	126 000	5	726 540
Лот №11	Плита электрич. ПЭМ 4-010 инв. № 521	5 500 000	110 000	5	1 024 575
Лот № 12	Сковорода электрическая секционная СЭС-0,25/2 инв. № 519	10 600 000	212 000	5	1 024 575
Лот № 13	Холодильная камера инв. № 38	5 200 000	104 000	5	1 024 575
Лот № 14	Мармит вторых блюд МЭС-2 инв. № 531	7 900 000	158 000	5	1 024 575
Лот № 15	Мармит вторых блюд МЭС-1 инв. № 532	6 300 000	126 000	5	1 024 575

Оборудование расположено по адресу: Гомельская область, г. Мозырь, ул. Социалистическая, 120. Для участия в торгах необходимо:

1. Оплатить задаток в размере 2% от начальной цены лота на р/с 3012002731231 в ф-ле № 317 ОАО «АСБ Беларусбанк» ул. Советская, 130, МФО 151501678, УНН 400088836, г. Мозырь.

2. По 08 февраля 2013 г. включительно в рабочие дни с 8.00 до 17.00 подать заявление на участие в торгах и другие документы в соответствии с законодательством по адресу: Гомельская обл. г. Мозырь, ул. Социалистическая, 115.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателям – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации; юридическим лицам – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо предоставляет его руководитель), а также копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельство о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения(выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документы о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный и обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организации без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае, если аукцион признан не состоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начало торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Не явка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона, заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, методическими рекомендациями об особенностях оценки и продажи имущества должника, находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) №144 от 29.11.2010 г.

Дополнительная информация по телефону организатора аукциона: 8(0236) 35-60-80, 35-64-99; (029) 685-68-01; (029) 834-38-97.

Считать недействительными страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах»: по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ №№ 0275174, 0339151, 0339158, 0391978, 0391979, 0444526, 0444530, 0461643, 0390924, 0465024, 0453967, 0422354, 0430424, 0270435—0270436, 0395111, 0395115, 0497122, 0497128, 0382429, 0442381, 0453546, 0490072, 0301574; квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 0632128, 3336865, 0594298—0594305; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 0556760.

УНП 100706519

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»
220050, г. Минск, ул. К. Маркса,13А

режим работы: с 8.30 до 17.45, перерыв 13.00–14.00,
тел.: 327-52-36, 226-03-01

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

Выполняя функции заказчика, объединением с 2006 по 2011 год построены и введены в эксплуатацию жилые дома:

- ул. Матусевича, д. 90, пр. Рокоссовского, д. 76, д. 78, д. 80, пр. Независимости, д. 168, корп. 1, пр. Независимости, д. 168, корп. 2, пр. Независимости, д. 168, корп. 3, ул. Есенина, д. 36, д. 38, д. 40, д. 42, ул. Папанина, д. 18, ул. Стариновская, д. 2, ул. Колесникова, д. 16, д. 18, д. 20.

Объединение осуществляет строительство объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 12 по генплану» в г. Минске.

Свидетельство (удостоверение) № 500/986-6494 о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права собственности на него от 23 апреля 2012 г.

Земельный участок площадью 0,21 га. Проектом предусмотрено устройство подъездов, пешеходных связей, установка малых архитектурных форм, озеленение, организация детских игровых, спортивных, хозяйственных площадок.

Здание жилого дома запроектировано 4-секционным, 10-этажным. Количество жилых помещений жилого дома – 159, серия – М 464-М.

Начало строительства – 30 августа 2012 года.

Окончание строительства объекта согласно ПОС – июль 2013 года.

Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 24.02.2012 № 8-15/12 (с дополнениями).

Договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться на строительство жилых помещений с гражданами, не нуждающимися в улучшении жилищных условий, но желающими их улучшить.

Предметом договора будет являться строительство жилых помещений: № № 3, 7, 11, 15, 19, 23, 27, 31, 35, 39, 16, 20, 24, 1, 5, 9, 13, 21, 25, 29, 33, 37, 2, 14, 18, 22, 55, 59, 63, 67, 44, 48, 52, 56, 60, 64, 68, 72, 76, 80, 41, 45, 49, 53, 57, 61, 65, 69, 73, 77, 82, 83, 87, 91, 95, 99, 103, 107, 111, 115, 119, 92, 96, 100, 85, 89, 93, 97, 101, 105, 109, 113, 117, 122, 123, 127, 131, 135, 139, 143, 147, 151, 155, 159, 120, 124, 128, 132, 136, 140, 144, 148, 152, 156.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений с учетом выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

однокомнатные квартиры – 10 731 501 руб.,
двухкомнатные квартиры – 10 421 421 руб.,
трехкомнатные квартиры – 9 646 219 руб.

В состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое подлежит передаче в долевую собственность, входят: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, технические этажи и подвал, другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также отдельно стоящие объекты, служащие целевому использованию здания и право землепользования.

Договор строительного подряда от 23.08.2012 № 87-с-08-2012, генподрядчик – ОАО «МАПИД».

Прием и регистрация заявлений на участие в долевом строительстве жилых помещений будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации в каб. 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А. Заключение соответствующих договоров и дополнительных соглашений будет осуществляться только по вышеуказанному адресу.

Предложения согласно настоящей проектной декларации действуют до 15.02.2013 года.

Генеральный директор Н.В. Милошевский

БАЛГАРСКІ ГЕРОЙ ПАХАВАНЫ НА ПАЛЕССІ

Знаходка магілы Тодара Мінкава ў Драгічыне адкрыла новыя магчымасці для пошуку цікавых імён

Раней пра Фёдара Мінкава мала хто ведаў. Пакуль дырэктар Ваенна-гістарычнага музея імя Д.К. Удовікава Сяргей Гранік не заняўся вывучэннем спісаў землякоў, якія ўдзельнічалі ў руска-турэцкай вайне 1877-1878 гадоў. Прачытаў у архіве дакументы пра Тодара Мінкава — нацыянальнага героя Балгарыі, педагога і асветніка, адзначанага Расійскай імперыяй. Супаставіў звесткі. Аказалася, знакаміты балгарын знайшоў свой апошні спачын менавіта ў Драгічыне. А імя на магільным муры трошкі перамянілі на мясцовы манер. Праз горад у XX стагоддзі пракаціліся тры вайны. Выглядае сапраўдным цудам, што магіла ацалела і захавалася да нашых дзён.

Навучэнцы кадэцкага класа са Слоніма каля магілы Тодара Мінкава.

Сяргей Гранік падзяліўся інфармацыяй аб сваёй знаходцы з чытачамі драгічынскай раённай газеты і папрасіў адгукнуцца тых, каму нешта вядома пра Мінкава. Матэрыял трапіў у інтэрнэт, і неўзабаве пайшлі водгукі. Паступова ўдалося даведацца пра Тодара Мінкава. Нарадзіўся ён каля горада Русе. Вучыўся ў Аўстрыі, затым у Дрэздэнскім політэхнічным інстытуце. На практыцы ён пасябраваў з рускімі студэнтамі, дзякуючы ім вывучыў рускую мову. З пачаткам Крымскай вайны (1853-1856гг.) запісаўся добраахвотнікам у Балгарскі легіён рускага войска, прымаў удзел у абароне Севастопаля. Там ён атрымаў званне паручніка і прызначэнне палкавым інжынерам. Пазней стаў ад'ютантам галоўнакамандуючага Паўднёвым войскам князя Міхаіла Гарчакова.

Пасля вайны Тодар вярнуўся ў Дрэздэн, каб закончыць адукацыю. З дыпломам інжынера ён адправіўся ў Расію. У яго ўжо тады была мара — прысвяціць сябе выхаванню маладога пакалення. Ён лічыў, што будучыня Балгарыі залежыць ад адукацыі яе народа. Ва ўкраінскім Нікалаеве Мінкаў адкрывае пансіён для прадстаўнікоў балканскіх народаў на 40 выхаванцаў. Установу фінансавала дзяржаўная казна Расійскай імперыі, падтрымлівалі і бацькі навучэнцаў. Усяго са сцен пансіёна Мінкава выйшла больш за тысячу юнакоў, многія з якіх праславілі Балгарыю. Сярод іх, напрыклад, балгарскі пісьменнік Алека Кастусёў.

А ў руска-турэцкую вайну пансіён стаў зборным пунктам добраахвотнікаў, якія пажадалі адправіцца на Балканскі фронт. Дзясяткі славянскіх патрыётаў атрымалі бласлаўленне настаўніка ў 1877-1878 гадах. Балгарыя, як вядома, набыла тады незалежнасць. Але Мінкаў вырашае застацца ў Расіі. Можа таму, што за плячыма 17-гадовы педагагічны стаж, прызнанне яго як педагога. Да таго ж пансіён дзейнічаў, і ахвотных вучыцца ў ім менш не станавілася.

Аднак у 1892 годзе яго давялося закрыць, бо спынілася фінансаванне. Тодар Мінкаў выйшаў на пенсію і пераехаў з сям'ёй у маёнтак Равіны Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Цяпер тыя Равіны ўвайшлі ў рысу горада Драгічына. І ўжо з 1893 года Мінкаў становіцца міравым суддзёй Кобрынска-Пружанскай акругі. Яму, аўтарытэтнаму і добра адукаванаму чалавеку, належала вырашаць самыя спрэчныя пытанні, якія ўзнікалі паміж людзьмі і рэлігійнымі канфесіямі. Гэта было сведчаннем высокай павагі і даверу. Цяпер ужо мясцовы памешчык і суддзя, ён не хацеў пакідаць педагагічную справу, за якую меў шмат узнагарод як у Расіі, так і ў Балгарыі. Тут, у Равінах, ён адкрыў прыватны ліцэй для падрыхтоўкі моладзі ў кадэцкіх карпусах. Сюды прыязджалі вучыцца юнакі нават з балканскіх краін. Але асноўную частку вучняў складалі свае — палешукі.

Дырэктар Драгічынскага музея Сяргей Гранік і яго калегі знайшлі звесткі пра Вячаслава Іосіфавіча Міховіча, ураджэнца вёскі Дуброва. Ён таксама вучыўся ў ліцэі Тодара Мінкава. Затым скончыў Віленскае пяхотнае вучылішча і стаў сапраўдным героем не адной вайны. Міховіч удзельнічаў у руска-японскай вайне, а ў Першую сусветную прайшоў шлях ад камандзіра роты да камандзіра палка. За гэты час Вячаслаў Міховіч адзначаны 10 ордэнамі. Пасля рэвалюцыі ён перайшоў на бок Чырвонай Арміі, займаў там адметныя пасады. Але ў 1921 годзе Міховіч нечакана вярнуўся на радзіму, у сваю вёску, і заняўся сельскай гаспадаркай. У 1939-м былога афіцэра арыштавалі па даносе. Загінуў ён у сталінскіх лагерах.

На радзіме засталіся нашчадкі Вячаслава Міховіча, на Драгічыншчыне жывуць яго праўнукі. А колькі яшчэ гераічных людзей, чый лёс аказаўся пераплецены з лёсам балгарскага педагога, які свае апошнія гады правёў на Палессі! Усё гэта багаты матэрыял для пошукаў, якімі і займаюцца супрацоўнікі ваенна-гістарычнага музея. Запісваюць успаміны жыхароў навакольных вёсак, чые бацькі ці дзяды сустракаліся з Тодарам Мінкавым, адкрываюць новыя цікавыя факты і дэталі.

Вось толькі магіла Мінкава доўга была недагледжанай. Нядаўна выхаванцы кадэцкага класа са Слоніма разам з музейнымі работнікамі добраўпарадкавалі месца пахавання. Ужо і турысты пацягнуліся да гэтай мясціны. Паводле слоў Сяргея Граніка, Пасольства Балгарыі таксама праявіла цікавасць да магілы земляка. Ёсць нават меркаванне аб магчымым перапахаванні Мінкава ў балгарскім пантэоне герояў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Драгічынскі раён.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

КЛУБ МАТУСА

У шашачнай кампазіцыі па ініцыятыве міжнароднага майстра Аляксандра Кагоцькі з Пінска створаны сімвалічныя клубы, аналагічныя клубу Фядотава ў футболе. Стваральнікі задач на 100-клетачнай дошцы назвалі свой клуб іменем нацыянальнага майстра спорту з Мінска Пятра Матуса **(гл. здымак)**. З іх ён першым набраў 100 заліковых ачкоў у чэмпіянатах Беларусі. Цяпер, пасля падвядзення вынікаў 16-га першынства рэспублікі, членамі клуба з'яўляюцца: А. Шабалін (329,375 ачка), М. Баброўнік (290,625), А. Шурпін (254,375), К. Тарасевіч (194,75), Д. Сухарукаў (191,0), У. Кажамякін (177,5), сам П. Матус (157,5), А. Ляхоўскі (122,25), Г. Далідовіч (113) і П. Шклудаў (101,25).

П. Матус — першы чэмпіён краіны ў раздзеле задач-100 (1976 г.). Праз два гады паўтарыў поспех. У 1982-ым заваяваў бронзавы медаль. У жанры задач-64 стаў віцэ-чэмпіёнам.

НЕВЯЛІЧКІ ЭЦЮД

Падаём яго ў якасці чарговага задання конкурсу «Пагода ў доме-9»:



№ 9/9. **Белыя:** b6, g5, дамка c1 (3). **Чорныя:** a5, d4, d6, h4, дамкі g3, g7 (6). Выйгрыш.

Па-за конкурсам разбярыце такія канструкцыі, у якіх таксама перамога на баку белых пры іх першым ходзе:

15. **Белыя:** e3, f6, дамкі a7, f2 (4). **Чорныя:** c3, дамка f8 (2).

16. **Белыя:** g5, дамка h4 (2). **Чорныя:** d2, e7, f6, h4 (5).

Тым, хто справіцца з імі, будуць залічаны папярэднія заданні. Іх рашэнні суддзя ўлічыць і тады, калі ўдзельнікі набяруць аднолькавую колькасць ачкоў.

АЎТАРСКІ КОНКУРС-16

Яго працягваюць эцюды Л.С. Вітошкіна: у іх белыя пачынаюць і выйграюць:



№ 16/15. **Белыя:** дамкі 27, 36, 47, 50 (4). **Чорныя:** 19, дамкі 41, 46 (3).

№16/16. **Белыя:** 14, 33, 38, дамка 6 (4). **Чорныя:** 36, 45, дамка 47 (3).

❑❑❑

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

«Пагода ў доме-2012» (М. Грушэўскі): **№ 9/5** — c7 (b6A) c7, d8, c3x. A(f2) b6, b8, b8:g3:f8x і **№ 9/6** — dc7 (e1) g5! (f4AB) b8, h2x. A(f6) b8, h8 (c7C) e5 (b6) d4 (a5) c3 (g5) d2 (h4) e1 (b4, g3) b6 (h2) g1#. C(g5) e5x. B(a5) b8 (f4D) h2, b8x. D(f6) h2, b8x. **Па-за конкурсам № 9** — d8, g5 (ba5AB) c1, g1 (c3) d2, f2, f2x. A(be1) c1, g1 (c3) d2, f2, f2x. B(fc5) c1, b6/a7 (c3) d2, f2, f2x і **№ 10** — d8, a5 (f2) e1 (b6A) a7 (g1) b8 (d4) f2, a7 (g3, h2) b8x. A(g1) a5, c7/d8x.

НАВІНЫ ЗДАРЭННІ КРЫМІНАЛ

ЗАСТРЭЛІЎ МІЛІЦЫЯНЕРА І ЗАСТРЭЛІЎСЯ САМ

У сталіцы пры выкананні службовых абавязкаў застрэлены міліцыянер, яго калега ранены. Мінчанін, які страляў у супрацоўнікаў праваахоўных органаў, скончыў жыццё самагубствам. Аб гэтым «Звяздзе» паведамілі ў Следчым камітэце Беларусі.

Здарэнне адбылося ў аўторак вечарам у прыватным сектары Маскоўскага раёна Мінска. Следча-аператыўная група выбыла туды па заяве жыхароў аб тым, што па вуліцы Машыністаў нехта страляе па іх сабаку. Па прыбыцці заяўнікі ўказалі на мужчыну 1953 года нараджэння.

— Падчас апытання мужчына, які, як высветлілася, пражываў у адным з дамоў прыватнага сектара, дастаў прадмет, падобны на пісталет, і адкрыў агонь па супрацоўніках праваахоўных органаў, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Юлія ГАНЧАРОВА.** — У адказ на яго дзеянні супрацоўнікі прымянілі табельную зброю. Але «стралок» схаваўся ў гаражы, размешчаным побач з домам, дзе і выстраліў сабе ў галаву.

Адзін з супрацоўнікаў міліцыі ад атрыманых раненняў загінуў на месцы здарэння, яшчэ адзін — ранены і змешчаны ў медустанову. Заведзена крымінальная справа па арт. 362 КК Беларусі (забойства супрацоўніка органаў унутраных спраў у сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў).

Падчас следчых дзеянняў у доме мінчаніна, які застрэліў міліцыянера, знойдзены і канфіскаваны агнястрэльная зброя, вялікая колькасць патронаў, порах, кнігі, DVD па стралковай зброі. Усё адпраўлена для даследавання экспертам. Па папярэдніх звестках, па супрацоўніках міліцыі мужчына страляў з рэвальвера сістэмы «Наган» 1940 года, сам жа застрэліўся з абрэза. Абрэз быў выраблены з гладкаствольнага ружжа, на якім ёсць нумар. Паходжанне зброі і гісторыя яе прымянення будзе ўстаноўлена падчас экспертыз.

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, за гераізм і самаадданасць, праяўленыя пры затрыманні небяспечнага злачынцы, прапаршчык міліцыі Іван Іванчык будзе ўзнагароджаны пасмяротна. Супрацоўніку ГУУС Мінгарвыканкама Ігару Іванчыку было 37 гадоў, ён служыў у органах унутраных спраў з 1996 года. За добрасумленныя адносіны да службовых абавязкаў неаднаразова заахвочваўся кіраўніцтвам. У яго засталіся жонка і сын.

Надзея ДРЫЛА.

АЎТОБУС «НАСКОЧЫЎ» НА МАЧТУ

Здарэнне мела месца ўвечары ў сталіцы на праспекце Дзяржынскага: аўтобус маршруту № 74С «ДС «Малінаўка-4» — ДС «Гарадскі Вал», што належыць філіялу «Аўтобусны парк № 4» прадпрыемства «Мінсктранс», урэзаўся ў мачту вулічнага асвятлення.

У салоне на той момант знаходзіўся 41 пасажыр. У выніку здарэння пацярпелі тры чалавекі. Дзве грамадзянкі былі шпіталізаваныя. Яшчэ адзін мужчына атрымаў ранкі кісцей рук і пасля агляду медыкамі быў адпушчаны для амбулаторнага лячэння. Прычыны дарожна-транспартнага здарэння высвятляюцца. Затрымкі руху грамадскага транспарту не было.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВАДЗІЦЕЛЬ КІНУЎ ПАРАНЕНЫХ ПАДЛЕТКАЎ НА МЕСЦЫ ЗДАРЭННЯ

У Магілёве пад колы аўтамабіля трапілі двое падлеткаў — 16-гадовая дзяўчына і 15-гадовы хлопец. Вадзіцель з месца здарэння збег.

Аўтамабіль «Опель Вектра» на вуліцы Крупскай збіў падлеткаў на пешаходным пераходзе, які не рэгулюецца. Дзеці атрымалі траўмы і цяпер знаходзяцца ў бальніцы. Стан здароўя хлопца пасля аварыі медыкі ацэньваюць як здавальняючы, а вось дзяўчына пацярпела значна больш: яна атрымала шматлікія пераломы, знаходзіцца ў цяжкім стане і не памятае, што з ёй адбылося.

Аўтамабіль міліцыянеры хутка затрымалі, але цяпер ідзе высвятленне, хто канкрэтна знаходзіўся за рулём падчас здарэння. Паказанні людзей, якія былі ў «Опелі», блытаныя. Як паведамляе ДАІ, малады чалавек, які, паводле папярэдняй інфармацыі, стаў вінаўнікам здарэння, пазбаўлены правоў на кіраванне транспартам.

Алена КАЗЛОВА.

МАСАВАЯ БОЙКА Ў ПІНСКУ

У ноч на Каляды масавая бойка моладзі адбылася ў адной з начных забаўляльных устаноў Пінска. Было зламана і пабіта ўсё, што знаходзілася ў памяшканні. Сур'ёзныя цялесныя пашкоджанні атрымалі восем чалавек. Яны шпіталізаваны ў аддзяленні Пінскай гарадской бальніцы. Некалькі ўдзельнікаў канфлікту затрыманы. У міліцыі пакуль не каментуюць інцыдэнт, праводзіцца расследаванне.

Яна СВЕТАВА.

«САМУРАЙ» З НОВАЛУКОМЛЯ, або ХАРАКІРЫ НА КУХНІ

Прызнаемся, мужчыны, хто з вас, каб заваяваць сэрца прыгажуні, не здзяйсняў неабдуманых учынкаў? Толькі б звярнула ўвагу, падарыла ўсмешку, хаця б заўважыла... У сталіцы беларускіх энергетыкаў адбылася гісторыя, сюжэт якой, напэўна, дастойны экранізацыі.

— Было прыкладна каля гадзіны ночы, калі разгарэўся скандал на кухні адной кватэры ў Новалукомлі. Незадаволенасць жонкі выклікаў нецвярозы стан мужа. Слова за слова — і жанчына ў парыве гневу сказала, што мужчыну даражэй не яна, а спіртное і дружкі-сабутэльнікі, — расказвае **Алена Мацяйковіч, старшы памочнік пракурора Чашніцкага раёна.** — Але той, падагрэты «зялёным змеем», вырашыў даказаць, якія моцныя пачуцці ў яго да жонкі. Вельмі непрадказальным і нечаканым было яго прызнанне ў каханні. Схапіўшы нож, мужчына ўдарыў сябе ў жывот, прычыніўшы сабе цяжкае цялеснае пашкоджанне. На шчасце, рана аказалася несмяротнай. У мясцовай бальніцы «самураю» аказалі неабходную дапамогу.

ДАЧКА ЗАБІЛА МАЦІ

У Бешанковіцкім раёне 22-гадовая дачка забіла сваю 43-гадовую маці. Трагедыя адбылася ў вёсцы Фралковічы ў доме, дзе яны абедзве жылі. Папярэдне ўстаноўлена, што забойства адбылося пасля сваркі. Забойцу затрымалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.



Скпаў Андрэя МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Маўбарада. Баева. Ёлка. Жоўтаб. Ані. Брас. Стрэс. Пляж. Камелія. Ятаган. Сала. Акат. Аматар. Планета. Ала. Удук. Аграрый. Фіялт. Балык. Аер. Таката. Зла-да. Сал. Страха. Ода. Пагарынак. Маэнуоў.

Па вертыкалі: Сцеражкоў. Ліфанаў. Пямпа. Пчыш. Кпара. Вуліка. Тупа. Трак. «Ася». Брэст. Рагатнт. Лярок. Ліра. Анад. Век. Хам. Ата. Абсяг. Актава. Мат. Анаска. Аск. Сага. Тар. Лаг. Анорт. Лінна. Рад. Анькоў.

УСМІХНЕМСЯ

Сустракаюцца дзве сяброўкі:

— Дарагая, ты так паправілася!

— Гэта я яшчэ пахудзела! Бачыла б ты мяне месяц таму! Была такая, як ты зараз!..

У адным з цэхаў волжскага аўтазавода быў знойдзены хлопчык, якога выхавалі слесары. Ён амаль не размаўляе, у асноўным мацюкаецца. Але ўсё да месца!

caricatura.ru

П'яны, пагойдваючыся, ніяк не можа трапіць ключом у замочную свідравіну. Міма праходзіць сусед і пытаецца:

— Дапамагчы?

— Так. Дом патрымай!..

У Чалябінску абвясцілі штармавое папярэджанне на выхадныя, у сувязі з чым кіроўцаў прасілі, па магчымасці, не карыстацца асабістым аўтатранспартам. На просьбу першымі ў поўным складзе адгукнуліся кіроўцы снегапрыбіральнай тэхнікі і дружна перачакалі снегапад дома.

■ Ну і ну!

УЦЯКАЮЧЫ, СКІДВАЎ БЯРВЁНЫ З ВОЗА

Пры затрыманні інспектарамі аховы жывёльнага і раслiннага свету жыхар Барысаўскага раёна пагражаў нанесці сабе калецтва.

— Супрацоўнікі Барысаўскай міжрайінспекцыі вярталіся з запланаванага рэйду па рацэ Нача, калі звярнулі ўвагу на гружаную дзелавой драўнінай гужавую павозку, якая выехала з лесу. Каб праверыць законнасць высечкі, дзяржінспектары паспрабавалі наблізіцца, аднак мужчына, які кіраваў падводай, пагнаў каня, накіраваўшы яго ў яр. Падчас руху на немалой хуткасці ён скідваў бярвёны з падводы, каб такім чынам пазбавіцца ад грузу, — распавяла «Звяздзе» падрабязнасці незвычайнага здарэння прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Аб'ехаўшы яр, інспектары сустрэлі воз каля вёскі Вяляцічы і патрабавалі ад возчыка спыніцца. Мужчына адрэагаваў на гэта дзіўным чынам: адарваў ад конскай вупражы дугу і, размахваючы ёй, паспрабаваў нанесці сабе цялесныя пашкоджанні з мэтай абвінаваціць у гэтым работнікаў інспекцыі. Пасля чаго збег з месца здарэння. Парушальніку пагражае штраф у памеры ад 20 базавых велічынь (ад 2 мільёнаў).

Сяргей РАСОЛЬКА

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.24	17.11	7.47
Віцебск —	9.21	16.53	7.32
Магілёў —	9.14	17.01	7.47
Гомель —	9.03	17.05	8.02
Гродна —	9.38	17.27	7.49
Брэст —	9.31	17.36	8.05

Месяц

Маладзік 11 студзеня. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Агафіі, Зіновіі, Ігната, Ніканора, Пятра, Яфіма.*

К. *Ады, Дануты, Адрыяна, Вільгельма, Рыгора, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты | Падзеі | Людзі

1494 год — «Вялікае пасольства» вялікага князя літоўскага Аляксандра прыбыло ў Маскву, каб пакласці канец вайне Маскоўскай дзяржавы з ВКЛ (першая адкрытая вайна Маскоўскай дзяржавы за так званую «вотчыну» — усходнеславянскія землі, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ; працягвалася з 1492 па 1494 гг.). У выніку складаных перамоў было дасягнута пагадненне аб новай мяжы паміж дзяржавамі. Да Маскоўскай дзяржавы адышлі Вяземскае княства і землі ў басейне Верхняя Ака. ВКЛ адмовілася ад прэтэнзій на Ноўгарад Вялікі, Пскоў, Цвер, Разань. Пасольства ВКЛ правяло таксама перамовы аб сватаўстве Аляксандра да дачкі Івана III і, атрымаўшы згоду, прадстаўляла вялікага князя на заручынах.

1863 год — у 6 гадзін раніцы жыхары сталіцы Туманнага Альбіёна сталі першымі ў свеце пасажырамі метро. Праект першай «падземкі» належаў Чарльзу Пірсану. Лінія працягласцю 6322 метры, ад станцыі Падынгтон да Фарынгтон-стрыт, складалася з 7 станцый. Паездка ў адзін канец займала 33 хвіліны. У вагонах было газавае асвятленне, досыць яркае для таго, каб можна было чытаць. Цікавасць да падземнай чыгункі была велізарная: ужо ў першы дзень работы лонданскім метро скарысталіся 30 тысяч чалавек.

1930 год — нарадзіўся (вёска Селіванаўка Маладзечанскага раёна) Фёдар Міхайлавіч Капуцкі, прафесар (1978), заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі (1976). У 1973-1985 гадах — намеснік, першы намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР. У 1990-1996-х — рэктар Белдзяржуніверсітэта. Аўтар больш як 600 навуковых прац, у тым ліку 2 манаграфій, 2 падручнікаў, каля 200 вынаходстваў. Навуковыя працы ў галіне структурнай і хімічнай мадыфікацыі цэлюлозы і яе вытворных. Адпрацаваў пераважныя варыянты для арганізацыі ў Беларусі вытворчасці ўласных цэлюлозных паўфабрыкатаў на базе сельскагаспадарчай сыравіны. Пад яго кіраўніцтвам абаронены 25 кандыдацкіх дысертацый, трое яго вучняў сталі дактарамі навук. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём Ф. Скарыны, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровай граматай Савета Міністраў Беларусі, Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу, медалём «За працоўныя заслугі». Ганаровы грамадзянін г. Маладзечна.

Было сказана

Андрэй ВОЛЯН (1530-1610), палітычны дзеяч, філосаф, правазнавец, ідэолаг Рэфармацыйнага руху на Беларусі:

«Нікчэмныя людзі замест сапраўдных каштоўнасцяў ганяюцца за іх цянямі».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 25.899. Індэкс 63850. Зак. № 209.

Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12